Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 18 (4513) 15 мая 2009 г.

У нумары:

Лепшыя сярод лепшых

Узнагароджанне лаўрэатаў І рэспубліканскага конкурсу на лепшую арганізацыю рэалізацыі друкаванай прадукцыі.

Стар. 2

Сюрпрызы «музейнай ночы»

Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі ладзіць тэатралізаваны гарадскі фэст пад назвай «Назад у СССР».

Стар. 3

Як дбаем, так і маем

А як прадаецца і прапагандуецца мастацкая літаратура, у тым ліку і наша родная, «Віцебсккнігай»?

Стар. 5

Пра тое, выключна «пісьменніцкае»

Агляд красавіцкіх нумароў часопісаў «Полымя», «Нёман», «Маладосць».

Стар. 6

Музыканты з канвеера?

Эстэтычная і музычная адукацыя вымагае немалых сродкаў. За кошт чаго ўзяць гэтыя сродкі?..

Стар. 11

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 7760 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 10060 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 5200 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі: 1 месяц — 7870 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Агледзіны беларускай прэсы

У 1943 г. друкарня слуцкай падпольнай газеты «Народны мсцівец» выпусціла зборнік «Слуцкі пояс» Анатоля Астрэйкі. Праз 65 год адзін з унікальных экземпляраў выдання, прастрэлены куляй, дэманстраваўся на выстаўцы "СМІ ў Беларусі". Сёлета яна прысвячалася 65-годдзю Перамогі і Году роднай зямлі.

Таму пралогам выстаўкі, зладкаваная за гадзіну да яе афіцыйнага адкрыцця, сталася прэзентацыя выставачнай экспазіцыі "Беларуская журналістыка ваенных гадоў: слова таксама справа" з удзелам ветэранаў журналістыкі, вядомых вучоных-гісторыкаў, супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны, пісьменнікаў-ветэранаў.

Сам жа штогадовы беларускі медыяфорум гасцінна расчыняе свае дзверы зазвычай у дзень святкавання Дня друку. На форуме падводзяцца вынікі працы летапісцаў сучаснасці — журналістаў, і ўсіх, хто спрычынены да выхаду ў свет газет, тэле- і радыёперадач.

Сёлетняя XIII Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «СМІ ў Беларусі» праходзіла чатыры дні: з 5 па 8 мая. Яе заснавальнікамі выступаюць Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства замежных спраў Беларусі, Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз журналістаў», Саюз выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку. На агульнай плошчы, якая складае звыш 800 м кв., у НВЦ «БелЭКСПА» на Янкі Купалы, 27, суседнічалі друкаваныя і электронныя сродкі масавай інфармацыі, інфармацыйныя агенцтвы і інтэрнет-правайдэры, распаўсюджвальнікі друку і рэкламныя арганізацыі. Шырока разгарнулі сёлета свае экспазіцыі ваенныя, дзіцячыя сродкі масавай інфармацыі, перыёдыка ВНУ, а таксама СМІ Саюзнай дзяржавы.

Чырвоную стужачку на адкрыцці выстаўкі перарэзалі першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля Пяткевіч, міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч і міністр па справах друку і інфармацыі ўрада Маскоўскай вобласці Сяргей Маісееў.

Спадарыня Пяткевіч зачытала прывітанне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам форуму, дзе, у прыватнасці, адзначалася: *"Новыя выклікі часу вылучаюць на пярэдні план патрабаванні дакладна і аператыўна інфармаваць людзей аб змяненнях у эканамічнай сітуацыі, аб мерах, якія прымаюцца па пераадоленні цяжкасцяў. Задача ў тым, каб весці канструктыўную інфармацыйную палітыку, накіраваную на кансалідацыю грамадства, згуртаванне сіл у мэтах аптымальнага вырашэння праблем..."* Кіраўнік дзяржавы выказаў спадзяванні, што правядзенне выстаўкі будзе

Беларускі інфармацыйны форум, які праходзіў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, — адно са знакавых мерапрыемстваў выстаўкі, які таксама стаў ўжо традыцыйным. Пры шырокім коле ўдзельнікаў форум набывае статус міжнароднага і паказвае ўзровень сучаснай беларускай журналістыкі.

садзейнічаць пашырэнню медыйнай прасторы, стане чарговым этапам ва ўмацаванні ўзаемадзеяння Беларусі з замежнымі партнёрамі ў інфармацыйнай сферы.

Больш як 70 экспанентаў з Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі, Украіны, Кітая, Ізраіля, Азербайджана, Латвіі, Польшчы, Францыі і Швейцарыі абменьваліся ў майскія дні досведам з калегамі, дэманстравалі гасцям свае дасягненні ў сусветнай інфармацыйнай прасторы. Наша суседка — Расійская Федэрацыя — прадставіла СМІ Ніжагародскай, Ноўгарадскай, Бранскай і Маскоўскай абласцей.

"Інфармацыйная прастора Беларусі адкрытая для партнёрства, і сведчаннем таму — распаўсюджванне ў краіне больш як 6 тыс. замежных газет і часопісаў, а таксама 90 тэле- і радыёканалаў, — пра гэта заявіў міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч на IV Беларускім інфармацыйным форуме "СМІ ў эпоху глабальнага эканамічнага крызісу. Фарміраванне сацыяльных установак насельніцтва". Гэты своеасаблівы інфармацыйны "круглы стол", які праходзіў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, — адно са знакавых мерапрыемстваў выстаўкі, якое таксама стала ўжо традыцыйным. Пры шырокім коле ўдзельнікаў форум набывае статус міжнароднага і паказвае ўзровень сучаснай беларускай журналістыкі. У краіне цяпер — больш як 1300 сродкаў масавай інфармацыі. Транслююцца пяць агульнанацыянальных тэлеканалаў, два сумесныя беларуска-расійскія — "НТБ-Беларусь" і "РТР-Беларусь", а таксама тэлеканалы "Мир" і ТРА Саюза, і г.д.

Менавіта па выніках працы форуму было падпісана пагадненне ў галіне інфармацыі і друку паміж Міністэрствам інфармацыі Беларусі і Міністэрствам культуры і турызму Азербайджана. Дакумент прадугледжвае развіццё супрацоўніцтва ў галіне СМІ.

(Працяг на стар 2.)

Пункцірам

● 3 мая ў Мінску прайшоў фестываль традыцыйнай культуры Чарнобылышчыны "Кветка палын". Мэта фестывалю — звярнуць увагу на катастрофу ў Чарнобылі з пункта гледжання культуралогіі. Удзел у фестывалі ўзялі людзі і арганізацыі, што цікавяцца пытаннямі культуры, мастацкія і музычныя гурты, якія ў сваёй творчасці грунтуюцца на аўтэнтычных матэрыялах з забруджаных зон.

● У Варшаве на польскай мове выйшаў турыстычны даведнік пра нашу краіну "Białoruś. Przewodnik turystyczny National Geografic". Укладальнікам стаў англійскі вандроўнік Найджэл Робертс. Праілюстраваны даведнік фотаздымкамі беларускі Юліі Дарашкевіч. Незадоўга да гэтага ў Вялікабрытаніі выйшаў таксама турыстычны даведнік пра Беларусь. Аўтар англамоўнай кнігі — той жа Найджэл Робертс. Цяпер над падарожнай кнігай пад папярэдняй назвай "Нёман. Рака ў цэнтры Еўропы" разам з фатографам Інкай Шванд працуе нямецкі вандроўнік Увэ Рада. Гэта замова нямецкага выдавецтва "Siedler". Кнігу плануецца выпусціць у наступным годзе.

● Пасля рэстаўрацыі ў Пінску быў адчынены помнік архітэктуры XVIII стагоддзя — палац Бутрамовіча. Матэуш Бутрамовіч з'яўляўся пінскім гарадскім падстарастам. Яго палац быў першай у горадзе каменнай пабудовай грамадзянскага прызначэння. Камень у падмурак палаца заклаў апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. У сярэдзіне XIX стагоддзя ў палацы жыў мастак і кампазітар Напалеон Орда. Сёння ў адрэстаўраваным будынку размяшчаецца Палац шлюбаў і філіял Музея беларускага Палесся.

● У гісторыка Анатоля Грыцкевіча выйшла новая кніга "Старонкі нашай мінуўшчыны". Навуковец распавядае пра айчынную гісторыю ад часоў Вялікага княства Ліоўскага XIV стагоддзя і да нашых дзён. Кніга падзелена на тры раздзелы. Першы прысвечаны жыццю і дзейнасці славутых беларусаў. У другім раздзеле аўтар знаёміць чытача з самымі значнымі датамі ў гісторыі нашай краіны і вядомымі бітвамі. Заключны раздзел уяўляе сабой падборку артыкулаў пра гістарычныя каштоўнасці і выпадкі фальсіфікацыі гісторыі. Аўтар прадмовы да кнігі — Адам Мальдзіс.

● 15—17 мая ў Гродне пройдзе харэаграфічны фестываль "Гарадзенскія карункі". Фестываль, які праводзіцца раз на два гады, сёлета будзе сёмым па ліку і атрымае статус адкрытага. Акрамя адзінаццаці беларускіх калектываў у Гродна прыедуць тры калектывы з Расіі, Украіны і Аўстрыі. У праграме мерапрыемства прадугледжана дэманстрацыя народных, сучасных танцаў, будзе прадстаўлены нават джаз-балет. Пройдуць таксама майстар-класы. Аўстрыйскія госці, да прыкладу, пакажуць свой народны танец, адметнасцю якога з'яўляецца ўдзел у ім усіх гледачоў.

● Міжнародны Дзень музеяў шырока асвятляецца ва ўсім свеце. Канал "Культура" Беларускага радыё — папулярызатар нацыянальнай і сусветнай культурнай спадчыны — не абмінае ўвагай свята і ладзіць спецыяльны праект. 18-га мая эфірны дзень будзе прысвечаны дзейнасці музейных устаноў нашай краіны. Кожныя паўгадзіны інфармацыйная служба канала "Культура" рыхтуе спецыяльныя выпускі, у якіх гаворка пойдзе пра найбольш каштоўныя экспанаты музеяў, гісторыю ўстаноў і іх праграму да святочнага дня. Да акцыі далучыліся амаль два дзесяткі беларускіх музеяў, а сталічныя падрыхтавалі падарункі, якія атрымаюць тыя, хто адкажа на прапанаванае музеем пытанне.

Завершыцца спецыяльны праект творчай вечарынай у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча. Слухачы сустрэнуцца з аўтарамі і вядучымі праграм канала "Культура", змогуць задаць пытанні, а супрацоўнікі падрыхтуюць свае сюрпрызы.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

Агледзіны беларускай прэсы

(Заканчэнне. Пачатак на стар 1.)

А ў Палацы Рэспублікі ўшаноўваліся тымі днямі лаўрэаты юбілейнага ў 2009-м годзе творчага конкурсу. У пяты раз высокую планку "Залатой ліцеры" імкнуліся ўзяць 250 рэдакцыйных калектываў. Галоўны вынік прэс-алімпу — высокая якасць і рост вагі ды тыражоў найперш гарадскіх і раённых газет. Але ў рамках урачыстай цырымоніі ўзнагароджванняў беларускія творцы адстойвалі сваё права на 24 статуэткі. Адным з лепшых грамадска-палітычных, часопісаў названы сёлета "Нёман". Віншуем калег!

«Лепшая грамадска-палітычная газета» — "Советская Белоруссия" — 5 год запар; «Лепшая газета для дзяцей і моладзі» — "Знамя юности"; «Лепшая галіновая газета» — "Железнодорожник Белоруссии"; «Лепшая газета для дасуга, спорту і турызму» — "Домашняя газета"; «Лепшы дзіцяча-юнацкі часопіс» — "Рюкзачок"; «Лепшы навуковы, навукова-папулярны часопіс» — "Беларуская думка"; «Лепшы спецыялізаваны часопіс» — "Архитектура и строительство"; «Лепшы часопіс для дасуга, спорту і турызму» — "BY. Вокруг света в Беларусь"; «Лепшая абласная газета» — "Магілёўскія ведамасці", «Лепшая раённая газета» — "Адзінства" (Барысаў), «Лепшая гарадская газета» — "Минский курьер", «Лепшая шматтыражная газета» — "Университэт"; «Лепшае інфармацыйнае агенцтва» — БелТА. «Лепшы рэпарцёр» — Жанна Лазоўская, аглядальнік газеты "Рэспубліка", «Лепшы аглядальнік» — Ігар Кольчанка з газеты "Советская Белоруссия", «Лепшы фотакарэспандэнт» — фотакарэспандэнт БелТА Максім Гучак, «Лепшы творчы праект года рэспубліканскіх друкаваных СМІ» — "Моя Беларусь" "Народнай газеты"; «Лепшы творчы праект года рэгіянальных друкаваных СМІ» — "Жыццё пражыць" газеты "Бярэзінская панарама". Знайшлі сваіх лаўрэатаў і іншыя намінацыі.

Што да новага ў жыцці сродкаў масавай інфармацыі ў 2009 годзе: яны пачалі перарэгістрацыю ў адпаведнасці з новым законам "Аб сродках масавай інфармацыі". Недзяржаўны сектар, як запэўніваюць у Міністэрстве інфармацыі, папаўняецца амаль штодня. Гэта добрая тэндэнцыя, якая сведчыць: ёсць цікавасць да інфармацыі. Прычым, газеты лічацца не толькі адной з крыніц вытворчасці аператыўнай інфармацыі, абагульняючых артыкулаў, яны становяцца адмысловым сегментам бізнесу. Між іншым, апошняе яскрава праілюстравала і выстаўка.

Ірына ТУЛУПАВА

На здымках: урачыстае адкрыццё выстаўкі першым намеснікам кіраўніка адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталляй Пяткевіч, міністрам інфармацыі Беларусі Уладзімірам Русакевічам і міністрам па справах друку і інфармацыі ўрада Маскоўскай вобласці Сяргеем Маісеевым; на праглядзе экспазіцый; наведвальнікі выстаўкі дзеляцца ўражаннямі; ля стэнда РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Фота Кастуся Дробава

Вітрына

Лепшыя сярод лепшых

У межах выстаўкі "СМІ ў Беларусі" адбылося ўзнагароджванне лаўрэатаў Першага рэспубліканскага конкурсу на лепшую арганізацыю рэалізацыі друкаванай прадукцыі.

Конкурс заснаваны Саюзам выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку, РУП "Белсаюздрук" і ААТ "Белкніга" пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Беларусі. Сустаршыня журы конкурсу, дырэктар "Белкнігі" Юрый ХМЫРОЎ на пытанне карэспандэнта "ЛіМа" пра мэты конкурсу адзначыў:

— Галоўная мэта — папулярызацыя кнігавыдання і жаданне падкрэсліць добрую працу тых, хто рэалізуе гэтыя выданні. Неабходна, каб самі калектывы адчулі, у якіх варунках працуюць.. Летась мы ўдзельнічалі ў конкурсе на лепшую кнігарню і на лепшага прадаўца СНД у Маскве, набылі вялікі досвед. Цяпер праводзім спаборніцтва ў сябе. Мы зразумелі, што трэба рыхтаваць калектывы, каб яны ўмелі працаваць. Яны павінны ведаць кнігі, умець прапанаваць кнігу пакупніку...

— Па якіх крытэрыях вызначаліся пераможцы?

— Найперш, рэалізацыя выданняў. Прычым, мы падзялілі кніжныя выданні і перыёдыку. Таму што гэта несумяшчальна. Цяпер маем лепшых распаўсюджвальнікаў кніг асобна, і лепшых распаўсюджвальнікаў друку — асобна. Лепшая кнігарня — дзе найбольшае найменне кніг у салоне і лепшы продаж. Глядзелі, як кнігарня працуе па папулярызацыі кніг, улічвалася і правядзенне конкурсаў, сустрэч з пісьменнікамі і праца непасрэдна з выдаўцамі.

— Як жа выглядае лепшы распаўсюджвальнік друку?

— Сёння ён працуе на прадпрыемстве "Белсаюздрук". Таму што ў сталіцы, і, сапраўды, актыўна працуе. Па абласцях ёсць шмат лепшых кіяскёраў, якія шмат прадаюць, і гэта іх заслуга. У раённым цэнтры прадаць перыядычнае выданне бывае складана, але людзі працуюць, значыць, умеюць гутарыць з пакупнікам, могуць прапанаваць з веданнем справы газету, ведаюць сваіх пастаянных кліентаў: як па літаратурна-мастацкіх газетах і часопісах, так і грамадска-палітычных...

Такім чынам, лепшыя з тых, ад каго залежыць продаж кніг і газет (амаль у кожнай з намінацый вызначаліся тры пераможцы, але мы называем уладальнікаў дыпломаў I ступені):

Лепшае прадпрыемства па гандлі друкаванай прадукцыяй — гандлёвае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Брэстаблсаюздрук";

Лепшая кнігарня — "Дом кнігі "Светач";

Лепшы кіёск па рэалізацыі перыядычных выданняў — Кіёск № 117 прадпрыемства "Белсаюздрук";

Лепшы аб'ект гандлю папярова-белавымі таварамі — кнігарня № 1 ААТ "Магілёўсаюздрук";

Па персанальных намінацыях: **лепшым распаўсюджвальнікам кніг** прызнаная Таццяна Бандоліна (ААТ "Магілёўсаюздрук"); **лепшы распаўсюджвальнік перыядычнага друку** — Ніна Канаплянік (Салігорскае аддзяленне "Мінаблсаюздруку"). Сярод спецыяльных намінацый адзначым: **"за ўкараненне высокаэфектыўных тэхналогій у гандлі друкаванай прадукцыяй"** — ТАА "Росчырк" (сумесны праект з "Мінаблсаюздрукам") і **"за эфектыўную папулярызацыю беларускай кнігі"**, тут асабліва ўдалая праца таварыства "Белкніга".

Пра вопыт апошніх, разгорнутую гутарку з дырэктарам "Белкнігі" Юрыем Хмыровым чытайце ў адным з наступных нумароў нашага штотыднёвіка...

Ярына РЫТАМІНСКАЯ

З нагоды

Віншаванні — каралеве!

У першы дзень мая народную артыстку Беларусі Наталлю Гайду віншавалі з юбілеем. Узрост імянінніцы — не загадка: любімица публікі, чароўная і мудрая каралева музычнага тэатра сама кажа, што нарадзілася ў 1939-м. Загадка — яе творчы талент, непадуладны гадам, памножаны на жаночую абаяльнасць, высокі прафесіяналізм, рэдкасную працавітасць, патрабавальнасць да сябе, душэўную маладосць і... нечаканасць. Багаты і разнажанравы рэпертуарны набытак Н. Гайды: оперныя арыі; шматлікія ролі ў класічных, беларускіх, савецкіх аперэтах, музычных камедыях, мюзіклах; рамансы, песні... Сільва, Марыца, Паўлінка, Джулія Ламберт... А некалькі гадоў таму, дзякуючы празорлівым рэжысёрам, яна раскрылася і як драматычная актрыса — на Купалаўскай сцэне ("Я не пакіну цябе"), у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага ("Валянцінаў дзень")...

Наталлю Гайду павіншаваў з юбілеем Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. "З Вашым імем звязаны лепшыя старонкі ў гісторыі нацыянальнага вакальнага мастацтва... Вы — Актрыса з Вялікай літары, якая знаходзіцца ў нястомным мастацкім пошуку", — адзначаецца ў віншаванні.

Я. КАРЛІМА

Толькі факт

Вясновы разліў «Нёмана»

Падведзены вынікі V Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі "Залатая ліцера". Дыплом атрымаў на гэты раз і часопіс "Нёман". Сапраўды, выданне, якое мае ўжо амаль сямідзесяцігадовую гісторыю (часопіс быў заснаваны ў 1945 годзе) плённа працуе ў сучаснай беларускай культурнай прасторы, прадстаўляючы ўвазе чытача новыя мастацкія творы аўтараў розных пакаленняў і розных эстэтычных скіраванасцей, актуальныя артыкулы грамадска-палітычнай тэматыкі, эксклюзіўныя публікацыі архіўных матэрыялаў, краязнаўчыя росшукі. Акрамя таго, "Нёман" мае шырокую чытацкую аўдыторыю і за межамі Беларусі, апошнім часам папулярнымі сталі сумесныя беларуска-расійскія нумары, што, безумоўна, спрыяе актыўнаму развіццю міжлітаратурных сувязей, дае магчымасць асэнсаваць узровень нашай літаратуры. Адзначана гэта было і на дзяржаўным узроўні. Днямі ў Нацыянальным прэс-цэнтры адбылося ўзнагароджанне лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу сярод журналістаў і сродкаў масавай інфармацыі, які ладзіць Апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей. Ад імя Л. П. Гулякі рэдакцыя часопіса "Нёман" атрымала падзячнае пісьмо за высокапрафесійнае асвятленне пытанняў міжнацыянальных і міжканфесійных адносін, міжкультурнага дыялога ў Рэспубліцы Беларусь і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой.

Ул. інф.

Сюрпрызы «музейнай ночы»

Напярэдадні

Гэты праект, упершыню ажыццёўлены 16 мая 2005 года па ініцыятыве Францыі, ужо ў 2006-м падтрымалі больш як 2 тысячы музеяў з 38 краін. Адкрытасць для гледачоў, магчымасць праз яскравыя, нават эпатажныя імпрэзы прыцягнуць іх увагу да музейных каштоўнасцей, выклікаць цікавасць да культурнай і гістарычнай спадчыны, раскрыць значэнне музеяў у жыцці грамадства... Вось такі сэнс мае для сваіх арганізатараў штогадовая акцыя "Ноч музеяў", якая праводзіцца пры падтрымцы Міжнароднага савета музеяў, пад патранатам Еўропы і якая за чатыры гады зрабілася неад'емнай часткай культурнага жыцця нашай краіны.

18 мая ў Міжнародны дзень музеяў, паводле добрай традыцыі, гэтыя ўстановы будуць бясплатна прымаць сваіх наведнікаў. А ўпярэдадзень свята ўсе ахвочыя могуць спрычыніцца і да сусветнай "музейнай ночы", якой, прынамсі, будуць апанаваны цэнтральныя кварталы Мінска. Што ні музей — то свой выбітны праект. Напрыклад, Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі сумесна з агенцтвам "ВІП-арт" пры падтрымцы Адміністрацыі Прэзідэнта краіны, Мінгарвыканкама, міністэрстваў культуры, абароны, унутраных спраў ладзіць заўтра тэатралізаваны гарадскі фэст пад назвай "Назад у СССР". Музей рыхтуе чараду імпрэз: персанальны вернісаж жывапісца Андрэя Смаляка "Невядомы Смаляк" з паказам 60 палотнаў (у тым ліку некалі "забароненых"), якія раней нідзе не выстаўляліся; прэзентацыю экспаната, які з'яўляецца музейным рарытэтам і раней не экспанаваўся; дэфіле-парад "Назад у СССР", дэманстрацыю мод 1960 — 70 гг. з удзелам маладых дызайнераў і мадэльнага агенцтва С.Нагорнага; адкрыццё танцпляцоўкі "Мы з 60-ых"; выступленні бардаў; конкурсы, розыгрышы, сюрпрызы.

Стваральнікі гэтага праекта праз мастацкую "рэканструкцыю" мінулага атуляць і сённяшнюю моладзь, і сталых людзей той атмасферай савецкага часу, якая поўнілася вольным духам 60-х, шчырасцю і цеплынёй чалавечых сустрэч...

Лана ІВАНОВА

На здымку: жывапісец А. Смаляк.

З-пад пяра

У сталічным Доме дружбы адбыўся "круглы стол" на тэму "Культурнае яднанне Беларусі і Індыі". І ў дадзеным кантэксце слова "яднанне" зусім невыпадковае, што пераканаўча даказалі ўдзельнікі сустрэчы: старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, Пасол па асобых даручэннях Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь У. Шчасны, кандыдат геаграфічных навук, старшыня секцыі "Усходазнаўства" Беларускага геаграфічнага таварыства І. Захаранка, кандыдат філасофскіх навук, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Рэспублікі Беларусь С. Санько, пісьменнік, першы намеснік дырэктара РВУ "Літаратура і Мастацтва" А. Бадак, старшыня Беларускага аддзялення міжнароднай грамадскай арганізацыі "Міжнародны цэнтр Рэрыхаў" Н. Германава, член праўлення таварыства "Беларусь — Індыя" Н. Нерад, а таксама Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь Р. Чандэр. Гаворка ішла пра беларуска-індыйскае супрацоўніцтва ў галіне культуры, мастацтва, навукі і адукацыі, якое мае даўнія і трывалыя традыцыі, пра вытокі духоўнай роднасці Беларусі і Індыі, у тым ліку, і пра некаторыя беларуска-індыйскія паралелі ў лінгвістыцы. Не раз гучалі імёны класіка індыйскай літаратуры Рабіндраната Тагора і знакамітага расійскага жывапісца, мысліцеля, пісьменніка і вандроўніка Мікалая Рэрыха, імя якога непарыўна звязана з Вучэннем Жывой Этыкі, заснаваным на светапоглядах вялікіх індыйскіх філосафаў. Разам з тым, аднадушна пагадзіліся ўдзельнікі "круглага стала", і сёння ў культурах нашых народаў адбываецца нямала таго, што можа ўяўляць агульную цікавасць, а значыць, спрыяць далейшаму развіццю беларуска-індыйскіх узаемаадносін.

Алесь МАЛІНОЎСКІ

У мінскім выдавецтве "Кнігазбор" выйшла кніга Віктара Купрыянчука "Ищите женщину. ВУ". У яе ўвайшлі аповесць "Тюха" і дзевяць апавяданняў (усе творы на рускай мове). Як адзначаецца ў анатацыі да зборніка "героі кнігі ў складаных умовах палітычных і сацыяльных перамен імкнуцца захаваць такія рысы, як сумленне, адданасць абавязку, сям'і, каханай жанчыне, сябру. Іх дзеянні і ўчынкі не заўсёды адпавядаюць літары закона, але зразумелыя з пазіцыі чалавечнасці".

Аўтарству Віктара Купрыянчука, які жыве ў вёсцы Хатоўня, належаць два зборнікі вершаў: "Я не в церкви крещенный" і "Філасофія болю". Ён — аўтар слоў гімна горада Рагачова.

Нарадзіўся Віктар Купрыянчук у сяле Вялікая Чарнігаўка Жытомірскай вобласці (Украіна). Пасля дзесяцігодкі вучыўся ў Севастопальскім ГПТВ будаўнікоў, служыў у арміі, працаваў на БАМе. Затым закончыў Віцебскі тэхнікум фізкультуры, гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны, працаваў настаўнікам фізкультуры і гісторыі. Літаратурную дзейнасць пачынаў з паэзіі. Вершы друкаваліся ў мясцовым і рэспубліканскім друку, у многіх калектыўных зборніках і альманахах. Новая кніга аўтара — першая проба пяра ў жанры прозы.

Міхась КАВАЛЁЎ.

Названыя сёлетнія лаўрэаты спецыяльнай прэміі Магілёўскага аблвыканкама ў сацыяльнай сферы. Як паведамляе БЕЛТА, узнагароду традыцыйна атрымаюць 50 маладых спецыялістаў (ва ўзросце да 35 гадоў) у галінах аховы здароўя, адукацыі, культуры і мастацтва, сродкаў масавай інфармацыі, фізкультуры, спорту і турызму, сацыяльнай абароны насельніцтва, а таксама студэнты і вучні, якія дасягнулі высокіх вынікаў у інтэлектуальнай дзейнасці. Гэтым разам сярод уганараваных спецыяльнай прэміяй — дырэктар Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. І. Дуніна-Марцінкевіча Вераніка Вінель, рэдактар Бялыніцкай раённай газеты "Зара над Друццю" Андрэй Кунцэвіч, начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Шклоўскага райвыканкама Сяргей Хмялькоў ды іншыя.

Саша ДОРСКАЯ

Рэха падзеі

Агледзіны пройдзенага шляху

З нагоды 85-годдзя Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкі імя М. Астроўскага быў наладжаны шэраг мерапрыемстваў, галоўным з якіх, безумоўна, стала міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Дзіцячая бібліятэка — тэрыторыя чытання". Менавіта выхаванне ў хлопчыкаў і дзяўчынак любові да кнігі, прыцягненне іх да актыўнага чытання літаратуры — прыярытэтныя напрамкі дзейнасці дзіцячых бібліятэк сталіцы, якія яны праз сваю цэнтралізаваную сістэму імкнуцца распаўсюдзіць і на адпаведныя ўстановы ўсёй рэспублікі. Сістэматызуецца і ўкараняецца ўсё лепшае, што ёсць у калег, вывучаецца замежны вопыт.

Юбілейная канферэнцыя ў бібліятэцы не стала выключэннем. Сваімі развагамі падзяліліся выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Валянціна Бігеза, выканаўчы дырэктар выдавецтва Беларускага Экзархата Уладзімір Грозаў, загадчыца сектара дзіцячай літаратуры выдавецтва "Мастацкая літаратура" пісьменніца Алена Масла і іншыя ўдзельнікі. З цікавасцю слухалі на канферэнцыі і замежных гасцей: дырэктара ізраільскага культурна-адукацыйнага цэнтра Паліну Карыў, эксперта па бібліятэчнай справе са Швецыі Інгрыд Кэрсцін, турэцкага выкладчыка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта Эсада Харманджы і дырэктара Белгарадскай дзяржаўнай бібліятэкі імя А. Ліханава з Расіі Таццяны Пятровай. З дзейнасцю Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкі імя М. Астроўскага за 85 гадоў існавання прысутных пазнаёміла дырэктар Таццяна Швед.

А закончыліся юбілейныя мерапрыемствы, што доўжыліся два дні, святочным вечарам. Пад дахам бібліятэкі быў наладжаны канцэрт, падчас якога гучалі таксама шматлікія віншаванні, уручаліся падарункі. Лепшыя бібліятэкары атрымалі дыпломы і граматы і ад Саюза пісьменнікаў Беларусі, які прадстаўлялі Міхась Пазнякоў і Наталля Касцючэнка. Цёпла было сустрэта і вясёлае паэтычнае віншаванне Анатоля Зэкава.

Сяргей КРЫВІЧОЎ

Інтэлектуальная ўласнасць і аўтарскае права

Рэестр

Кожны пісьменнік ведае, што пазнака «С», упісаная ў круг, што ставіцца на вокладцы выдадзенай кнігі, азначае аўтарскую прыналежнасць твора. Але, відаць, не кожны памятае, што 23-га красавіка — Сусветны дзень кнігі і аўтарскага права (адзначаецца ЮНЕСКА з 1996-га г.), а 26-га красавіка сусветная супольнасць штогод, пачынаючы з 2000-га года, адзначае Міжнародны дзень інтэлектуальнай уласнасці.

З гэтай нагоды ў Нацыянальнай бібліятэцы ў рамках семінара «Аўтарскае права ў дзейнасці бібліятэк: практычныя аспекты і заканадаўчыя ініцыятывы» адбылася прэс-канферэнцыя, на якую запрасілі зацікаўленых асоб і журналістаў.

У прэс-канферэнцыі прынялі ўдзел: генеральны дырэктар Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Леанід Варанецкі, начальнік цэнтра па калектыўным кіраванні маёмаснымі правамі Аляксей Бічурын, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Святлана Сухавей, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Людміла Кірухіна і член Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік секцыі паэзіі Уладзімір Карызна.

У ходзе прэс-канферэнцыі была разгледжана рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы па ахове інтэлектуальнай уласнасці на 2008-2010 гг., стан аховы аўтарскіх правоў у Рэспубліцы Беларусь і асаблівасці функцыянавання арганізацый індустрыі аб'ектаў аўтарскага і памежных правоў, а таксама ўдасканальванне заканадаўства ў сферы аўтарскага права. Удзельнікі прэс-канферэнцыі адказалі на пытанні журналістаў.

Да прыкладу, на такое пытанне, якое часта хвалюе кампазітараў і паэтаў-песеннікаў: «Телерадыёкампанія заказвае кампазітару музыку ці паэту — словы песні, заключае дамову, аўтарам выплачваецца разавы аўтарскі ганарар, а на далейшае выкарыстанне песні аўтарскія правы як бы аўтаматычна пераходзяць да тэлерадыёкампаніі». Гэта цалкам заганная практыка, і перш за ўсё самім аўтарам трэба быць вельмі ўважлівымі пры заключэнні пагадненняў. Цікава было даведацца, што аўтарскія правы на словы і музыку Дзяржаўнага Гімна чамусьці не падлягаюць пад юрысдыкцыю аўтарскага права, хаця ва ўсім свеце зусім іншая практыка.

Трэба сказаць, што акцэнт прэс-канферэнцыі ставіўся больш на аўдыёвізуальную прадукцыю: кіно, кліпы, аўдыёзапісы песень і музыкі. Было адзначана, што Нацыянальная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь не заўсёды пазначае аўтарства нават у цітрах, што ўжо з'яўляецца парушэннем, не гаворачы пра выплату грашовых кампенсацый і ганарараў за выкарыстанне твораў.

Асноўная думка, што прагучала на мерапрыемстве такая: аўтары самі павінны клапаціцца пра свае правы і адсочваць моманты парушэнняў, уважліва ўчытвацца ў дамовы, якія яны заключаюць, каб заставалася магчымасць аспрэчыць парушэнне аўтарскіх правоў у судзе.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Незабыўны вандроўнік

21 красавіка 2009 года няўрымслівы энергічны супрацоўнік Беларускага тэлебачання, вядучы перадачы "Вецер вандраванняў", аператар і рэжысёр Аляксандр Чуланаў мог бы адзначыць сваё сямідзесяцігоддзе.

Вектар

Яго жыццё ўмяшчала цэлы свет, які сваім лічылі не толькі турысты, альпіністы і воднікі. Яго аператарскую работу высока цаніў вядучы "Клуба кінападарожнікаў" Юрый Сянкевіч і ўключаў кадры ў свае перадачы. Аляксандр Чуланаў даў пуцёўку аўтарскай песні ад рамантычнага вогнішча да мікрафона. Менавіта з Беларускага тэлебачання пачалося трыумфальнае шэсце Таццяны і Сяргея Нікіціных і многіх знакамітасцяў гэтага жанру. І менавіта — пры Чуланаве.

Ён пакінуў у спадчыну багаты архіў. І грамадскае аб'яднанне "Клуб аматараў аўтарскай песні", адзначаючы 70-годдзе з дня нараджэння А. Чуланава, вырашыла перадаць Нацыянальнаму музею гісторыі і культуры Беларусі 1,5 тысячы слайдаў і больш як 500 фотаздымкаў, зробленых гэтым незабыўным рамантыкам і вандроўнікам, барацьбітом за захаванне помнікаў культуры Беларусі, улюбёным у навакольны свет і сяброў чалавекам.

Вольга ПАЎЛЮЧЭНКА

На здымку: старшыня грамадскага аб'яднання "Клуб аматараў аўтарскай песні" Валерыя Мамантава і дырэктар Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі Сяргей Вечар падчас урачыстай перадачы архіва Аляксандра Чуланава.

Фота аўтара

Хоць Дрыбін і невялікі гарадок, і літаральна ўсе ўстановы адукацыі ды культуры знаходзяцца побач, у цэнтры, але, шчыра кажучы, будучы там у камандзіроўцы, Дрыбінскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей знайшлі не адразу. А перад гэтым жа нам патлумачылі яго месцазнаходжанне. Прайшоўшы паўз яго, яшчэ раз перапыталіся ў месцічаў. Аказваецца, мы стаялі побач з уваходам. Справа ў тым, што ўваход у музей — напаўсхаваны бакавым пад'ездам жылога дома. Ну, досыць пра пошукі. Галоўнае ж у музеі, так бы мовіць, яго начынне, экспазіцыі.

Энтузіясты музейнай справы

Невялічкую экскурсію па ўстанове культуры правяла дырэктар Алена Рабкавец. Алена Мікалаеўна пагадзілася, што, не ведаючы, музей і сапраўды цяжкавата знайсці. Але ў гэтым годзе яны ўвайшлі ў праграму развіцця музейнай інфраструктуры: будзе выдзелены асобны будынак, дзе і зладкуецца паўнацэнная экспазіцыя.

Усяго ў музеі шэсць залаў. Адна з іх адведзена пад зменныя экспазіцыі. Другая — зала Вялікай Айчыннай вайны, якую рабілі да 60-годдзя Вялікай Перамогі зыходзячы са сваіх магчымасцей і сіл. Экспанаты для яе перадаваў ваенкамат. Тут часта праводзяцца заняткі па гісторыі і патрыятычным выхаванні са школьнікамі. Алена Рабкавец паведаміла, што партызанскі рух на тэрыторыі Дрыбінскага і Горацкага раёнаў пачаў разгортвацца з першых дзён акупацыі нямецкімі войскамі. На Дрыбіншчыне дзейнічала 14-я Цёмналеская брыгада, 115-я Горацкая брыгада, брыгада "Звязда", асобныя атрады Казанакава і Кохава... Была разгорнута маштабная "рэйкавая вайна".

Сярод экспанатаў — каскі, зброя, дакументы, лістоўкі на роднай мове, карціны з батальнымі сцэнамі, нямецкая акупацыйная валюта (рэйхсмаркі)... Зацікавяць разнастайныя фотаздымкі, як перадваенныя, так і зробленыя падчас ліхалецця, прыкладам, праводзіны на фронт (Дрыбін, 1941 год). Ёсць у фондах пісьмо, перададзенае музею адным з мясцовых жыхароў, датаванае першым днём вайны — 22 чэрвеня 1941 года.

У прыродазнаўчай зале можна пазнаёміцца не толькі з мясцовымі прадстаўнікамі фауны, але і з культурамі, якія вырошчваюцца ў раёне.

Наступная экспазіцыя прысвечана народным рамёствам, побыту і таму, што з'яўляецца візітнай карткай раёна, — шапавальству: прылады шапавалаў і іх вырабы. Упрыгожвае пакой выява своеасаблівага дрэва ў форме раёна, на якім пазначаныя вёскі, дзе было найбольш развіта гэта рамяство. У райцэнтры нават створана аматарскае аб'яднанне "Шапавал", дзе майстры-шапавалы вучаць дзяцей і падлеткаў гэтай справе. Алена Мікалаеўна падкрэсліла, што ў ім займаецца вельмі шмат моладзі, бо, авалодаўшы майстэрствам шапавальства, можна мець добры заробак. Адзін мужчына нават спецыяльна прыехаў з Мінска жыць да маці ў вёску Пакуцце, каб утрымліваць сваю сям'ю ў сталіцы. Са сваімі вырабамі шапавалы ўдзельнічаюць не толькі ва ўсіх раённых мерапрыемствах, але і прадстаўляюць іх на такіх рэспубліканскіх святах, як Дажынкі, Дзень беларускага пісьменства...

Яшчэ адна зала музея ўтрымлівае калекцыю ручнікоў і традыцыйнага народнага касюма. Фонд музея своеасаблівы тым, што раён з'яўляецца перасяленчым, і тут сабраныя матэрыялы з розных мясцін: Краснапольскага, Чэрыкаўскага, Слаўгарадскага раёнаў і мясцовыя вырабы. Вылучаюцца ручнікі Краснапольскага раёна — самабытныя і яркія з пераважаючым насычаным чырвоным колерам. Фонды ўстановы пастаянна папаўняюцца дзякуючы мясцовым жыхарам. Алена Рабкавец прызнаецца, што ў людзей шмат яшчэ чаго засталося ў "загашніках". Але, едучы ў экспедыцыі па раёне, прыходзіцца ўсё прасіць задарам. Бо за пяць гадоў — столькі часу Алена Мікалаеўна ўзначальвае музей — не атрымалі ніводнай капейчыны на закупку экспанатаў.

У прыродазнаўчай зале можна пазнаёміцца не толькі з мясцовымі прадстаўнікамі фауны, але і з культурамі, якія вырошчваюцца ў раёне.

Наступная экспазіцыя прысвечана народным рамёствам, побыту і таму, што з'яўляецца візітнай карткай раёна — шапавальству: прылады шапавалаў і іх вырабы. Упрыгожвае пакой выява своеасаблівага дрэва ў форме раёна, на якім пазначаныя вёскі, дзе было найбольш развіта гэта рамяство.

Таксама своеасаблівая апошняя зала — тут прадстаўлена калекцыя абразоў, канфіскаваная на брэсцкай мытні. У экспазіцыі сто ікон, для астатніх проста няма месца, і яны знаходзяцца ў сховішчы. Экспазіцыя пабудавана па ўсіх царкоўных канонах, пачынаючы ад нараджэння Багародзіцы, затым нараджэнне Хрыстова, разнастайныя абразы Божай Маці, розных святых... Зараз рыхтуюцца дакументы для паказу гэтай калекцыі ў Мілане. Справа ў тым, што з Дрыбінскім раёнам працуе група італьянцаў: робяць рамонты, аказваюць спонсарскую дапамогу, аздараўляюць дзяцей. Дык вось, яны наведаліся ў музей, убачылі выстаўку абразоў і сказалі, што ў Мілане будзе "бум", калі яе туды прывезці.

Сапраўды, супрацоўнікі музея (а іх усяго два чалавекі разам з дырэктарам) — адданыя сваёй справе энтузіясты. Бо нават калі нехта хоча наведаць музей (смех казаць, але ўваходны квіток у музей каштуе ўсяго 200 рублёў) у выхадны дзень, яны ідуць насустрач, нікому не адмаўляюць і адчыняюць дзверы ўстановы. Акрамя таго, самі ходзяць, як кажуць, у людзі: праводзяць музейна-педагагічныя заняткі, этнаграфічныя святы, конкурсы, распрацоўваюць дакументы і прадастаўляюць музейную літаратуру...

Што ж, застаецца пажадаць музейшчыкам палёгкі ў працы і найхутчэйшага пераезду ў новы будынак.

Віктар КАВАЛЁЎ

Фота аўтара

У Хоцімска — свой твар

Месца на карце

Хоцімскі раён разам з гарадскім пасёлкам Хоцімск знаходзіцца ў самым усходнім кутку Беларусі, у своеасаблівым геаграфічным "апендыксе". Трэба сказаць, што і дабрацца туды — задача не з лёгкіх. Прыйшлося ехаць з Мсціслава цэлы дзень: праз Крычаў, Клімавічы, Касцюковічы — перасадкі з надзеяй прыспешыць шлях у паўтары сотні кіламетраў, расцягнуўшыся на дванаццаць гадзін дарогі, нарэшце вывелі да раённага цэнтра. Не выходзіла з галавы наступная думка: мясцовым уладам не грэх было б паклапаціцца пра транспартнае абслугоўванне насельніцтва...

Упершыню ў пісьмовых крыніцах Хоцімск узгадваецца ў 1430 годзе. З канца XIX ст. налічваў каля трох тысяч жыхароў, меў два гарбарныя заводы, бровар, два вадзяныя млыны і пачатковае вучылішча. Пры савецкай уладзе ўваходзіў то ў склад Гомельскай вобласці, то адносіўся да Магілёўскай (Касцюковіцкі раён), але стаў нарэшце раённым цэнтрам. Горад кампактны, з насельніцтвам каля сямі тысяч чалавек. Адзінае, што ўражвае (але ўражвае выключна моцна) — гэта дабротны праваслаўны храм, Хоцімская Свята-Троіцкая царква. Міжволі думаецца, што тут некалі жыццё вірыла, не кожны абласны цэнтр можа пахваліцца такім саборам. Акрамя царквы, з архітэктурных помнікаў захаваліся два жылыя будынкі пачатку XX ст. ды дзесятак старажытных курганоў.

Бой за Беларусь

Віхлястая стужка чыстай рачулкі Асінаўкі да таго невялічкая, што, кажучы народным выслоўем, акурат вераб'ю па калена. Але менавіта гэтая рачулка і служыць мяжой, па гэты бок — Рэспубліка Беларусь, а па той — Расійская Федэрацыя. Пакутная зямля памежжа. Чаму народ даў рэчцы такое дзіўнае імя — Асінаўка?

Недалёка ад гэтай межавой рэчкі 16 жніўня 1941 года разыгралася трагедыя, пра якую нам распавёў начальнік аддзела культуры Хоцімскага райвыканкама — Мікалай Хучаў. Напамінам пра тыя падзеі цяпер з'яўляецца мемарыяльны комплекс і помнік вершніка з аголенай шабляй. Так здарылася, што 112-ы асобны кавалерыйскі корпус апынуўся ў гэтых мясцінах без сувязі. Не дачакаўшыся загаду, воіны-кавалерысты ўступілі ў няроўны бой з нямецкім матарызаванымі часцямі — з "шаблямі на танкі". Загінулі ўсе да аднаго. Мясцовыя жыхары пахавалі загінуўшых воінаў на месцы бою. Да самай зімы сіратліва блукалі коні па полі бітвы, шукаючы сваіх гаспадароў, пакуль не разабралі іх па дварах мясцовыя людзі. За час пасля вайны на былым полі паспеў вырасці лес, а ў мясцовых жыхароў з'явілася традыцыя: у дзень вяселля маладыя прыязджаюць сюды і павязваюць на дрэвы каляровыя стужкі, намагаюцца звязаць два дрэвы, напрыклад, малады дубок з бярозкай, ці сасну і клён, верачы ў тое, што такім чынам умацоўваюць будучыя сямейныя повязі.

Заўважым, што Хоцімскі раён адным з першых быў вызвалены з-пад акупацыі (25 верасня 1943 года), а ў 1991-м зноў апынуўся на памежжы дзяржаў. Дарэчы, першая вёска на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі: па аналогіі з назвай рачулкі таксама называецца Асінка.

Кім ганарыцца Хоцімшчына?

Кожная мясцовасць Беларусі выхоўвае знакамітых людзей, якімі потым ганарацца не толькі землякі. Не засталася ў баку і Хоцімшчына: дадала ў агульнанацыянальную культурную скарбонку некалькі выбітных асоб, сярод якіх паэты: Аляксей Зарыцкі і Міхаіл Карпенка, Аркадзь Куляшоў і Пятро Прыходзька, Алег Мінкін, Мікалай Саўчанка, Іван Раманенка... Услед падрастае і годная літаратурная змена, у Хоцімскай цэнтральнай бібліятэцы з гонарам паказалі два зборнікі маладых паэтаў: Алены Шалак і Аляксандра Аляксандрына, якія выйшлі ў свет, дзякуючы клопату бібліятэкараў. Паводле п'есы Аляксандра Аляксандрына "Прынцэса і трубачыст" мясцовы Дом культуры паставіў навагодні дзіцячы спектакль.

Хоцімскі раён — радзіма астранома С. Блажко, Герояў Савецкага Саюза Я. Суско і М. Піліпенкі, поўных кавалераў ордэна Славы С. Луцікава і Н. Лясковскага.

Славянскае братэрства без межаў

Пад такім дэвізам некалькі гадоў Хоцімскі раённы аддзел культуры сумесна з суседнім раёнам Бранскай вобласці праводзіў фестываль народнай творчасці. Свята народных промыслаў, конкурсы калектываў мастацкай самадзейнасці, выстаўкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народныя гулянні і спартыўныя спаборніцтвы — усё гэта фестываль змяшчаў у сваёй праграме. Было штосьці і надзвычай адметнае: мясцовыя ўлады з абодвух бакоў спецыяльным заканадаўчым актам замацавалі права ўласнасці на зямлю, паводле якога, кавалачак зямлі на Браншчыне (у некалькі сотак) перадаваўся беларусам, і такі ж сімвалічны кавалак зямлі на беларускай тэрыторыі аддаваўся ў "вечнае карыстанне" рускім. А ўсё рабілася дзеля таго, каб беларусы на расійскай тэрыторыі, і, адпаведна, рускія на беларускай зямлі адчувалі сябе як дома. Начальнік Хоцімскага аддзела культуры выказаў шкадаванне, што фестываль спыніў сваё існаванне.

Але гэта, пэўна, агульнарэспубліканскае пытанне, бо з раней існуючых двухсот сямідзесяці разнастайных фестываляў па ўсёй рэспубліцы засталося толькі пяцьдзесят сем...

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Як дбаем, так і маем

Мне яшчэ і дасюль помніцца тэлефонная размова з адным "дзеячам" прыватнага кааператыўна-гандлёвага прадпрыемства "Віцебскі аблкаапкнігагандаль". Я прапанаваў, каб тое набыло для рэалізацыі пяць экземпляраў кніжкі вершаў аднаго майго калегі па пяры. Што вы! Мы нават класікаў столькі не заказваем, — адказалі там. — Ну, можа, экземпляр-другі... Прайшло каля пяці гадоў. Што змянілася? Як прадаецца, а значыць, і прапагандуецца мастацкая літаратура, у тым ліку і наша родная?

Літаратура заўсёды была запатрабавана грамадствам, бо яна, як і іншыя віды мастацтва, — люстэрка гэтага грамадства і адрасавана перш за ўсё тым, хто хоча выверыць у ім стан сваёй душы гармоніяй, а не алгебрай, вобразна кажучы. І на якія б жыццёвыя цяжкасці і хто б ні спасылаўся, ніколі не зразумею тых, хто ўвесь час заклапочаны толькі ежай і вопраткай, і хто за сваё жыццё прачытаў дзветры мастацкія кніжкі, а потым перайшоў на чытанне тэлепраграм, або так моцна засеў у Інтэрнеце, што свету божага не бачыць...

Наведваючы бібліятэкі, кнігарні, упэўніваюся ў тым, што людзі чытаюць. І сваё, і чужое. На жаль, апошняга больш: "спажываюць" пераважна данцовых, хармсаў, марыніных, райсаў, а не беларускіх класікаў і сучасных творцаў.

— План ёсць план, і не выконваць яго нам ніхто не дазволіць.

Так пачалася мая размова з дырэктарам кнігагандлёвага прадпрыемства "Віцебскккніга" Станіславам ДАМАНЕЎСКІМ. З ім разам мы зацікаўлена пагаварылі пра кнігу як пра духоўны набытак і як пра тавар. Аказалася: кніжным гандлем у Віцебскай вобласці займаюцца пятнаццаць кнігарняў, пяць кіёскаў, адзін павільён, сем прыватных магазінаў, а таксама шэраг ларкоў на рынках гарадоў і пасёлкаў. Штогод прырост продажу кніг складае больш за дваццаць працэнтаў. Усё гэта — пацвярджэнне маёй думкі пра неўміручасць кнігі. Чытае прыдзвінскі люд. Засмучае толькі тое, што мастацкай літаратуры, выдадзенай выдавецтвамі рэспублікі, рэалізуецца толькі пяцьдзесят працэнтаў па аб'ёме і дваццаць пяць — па назвах.

Як бачна, кіраўніцтва "Віцебскккнігі" з усімі выдавецтвамі працуе шчыльна і мэтанакіравана. А лічбы, якія сведчаць не на карысць айчыннай літаратуры, кажуць пра тое, што падатак на дабаўленую вартасць беларускай кнігі складае ў нас васемнаццаць працэнтаў, а ў нашай суседкі Расіі — дзесяць. Чаму такая значная разбежка, адказаць цяжка, бо калі разабрацца, то выдавецкі працэс — адзін і той жа. І дужа ўразіў мяне яшчэ адзін факт з прачытанага на дырэктарскім стале часопіснага артыкула: на сацыяльна значную кніжную прадукцыю другой нашай суседкі — Украіны — устаноўлена нулявая стаўка на дабаўленую вартасць.

Аднак, нягледзячы на гэта, "Віцебскккніга" працуе, як любяць казаць журналісты, досыць паспяхова. Планы выконваюцца і нават перавыконваюцца. Адна з кнігарань — віцебскі "Глобус" — узнагароджана дыпломам Міністэрства інфармацыі. Дарэчы, мой суразмоўца Станіслаў Даманеўскі, апрача розных узнагарод, мае і ганаровае званне "Выдатнік друку".

Зноў вернемся да супрацоўніцтва з выдавецтвамі. Добра яшчэ помняцца выступленні ў кнігарнях нашага горада "Светачы" і "Глобусе" і мясцовых пісьменнікаў, і сталічных, якія працуюць у выдавецтве "Мастацкая літаратура". З сумам даводзіцца канстатаваць, што такія сустрэчы прыпыніліся, што мы, літаратары, самі сабе на шкоду, не клапоцімся пра рэалізацыю і прапаганду сваіх твораў, а мякка кажучы, чакаем, пакуль тыя выдавецтвы паклапоцяцца пра нас, любімых: збяруць тыраж, выдадуць...

"Віцебскккніга" працуе, як любяць казаць журналісты, досыць паспяхова. Планы выконваюцца і нават перавыконваюцца. Адна з кнігарань — віцебскі "Глобус" — узнагароджана дыпломам Міністэрства інфармацыі.

Расказала пра работу гандлёвай кніжнай сеткі і таваразнаўца Алеся ЖВІКАВА. Так, у канцы кожнага года вядучыя выдавецтвы дасылаюць свае планы, на якія арыентуюцца ўсе гандлёвыя кропкі. Для забеспячэння бесперабойнай пастаўкі кніг на рынак вывучаецца попыт на тую ці іншую літаратуру. Праведзена камп'ютэрызацыя асартыментнай службы. Неаслабная ўвага надаецца камплектацыі бібліятэк — толькі за 2008 год, напрыклад, ім прададзена кніжнай прадукцыі на 626 мільёнаў рублёў. Большая палова прададзенай літаратуры — з ліку сацыяльна значнай. Дзякуючы святу Дажынак, якія адбыліся ў Оршы, адрамантавана і перабсталявана мясцовая кнігарня і таваразварот павялічыўся тут у паўтара раза.

Усё б, здавалася, большменш добра. Але без "але" не абысціся. Да гэтага часу не магу даўмецца, чаму кніжны кіч, чытво ўсё ж перасільваюць сур'ёзную літаратуру і нават дамініруюць? Чаму, дзеля чаго большая частка кніжных паліц аддадзена іншай літаратуры, пэўнага кшталту раманам — забаўляльным жаночым, любоўным? Дзеля таго ж славутага плана любой цаной? А каго тады мы выхоўваем: беларуса ці глабаліста ў самым дрэнным значэнні слова, патрыёта ці касмапаліта без імя і радзімы? Ну, скажуць, зноў ён пра высокае. Менавіта пра высокае і вечнае, чалавечнае павінны думаць усе, пра дзяцей сваіх і ўнукаў, каб засталася ў іх хаця б часцінка светлай і радаснай душы, пачуццё павагі і любові да ўсяго свайго, спрадвечнага, роднага. Дык няўжо так змянілася наша пакаленне, што трэба плыць па хвалях лёсу і брудным моры масавай культуры? Няўжо ў людскіх душах такі разлад, які ўжо нельга супыніць? Упэўнены, што не. Сам разлад пачынаецца не ў народзе, не ў грамадстве, а паводле Булгакава, у людскіх галовах. Ёсць людзі начытаныя і ўдумлівыя, а ёсць проста тыя, хто чытае, каб забіць час, не адстаць ад прывіднай моды: "і я вось прачытаў (прачытала) нядаўна: як лёгка напісана, займальна, цікава"... А якім духоўным і душэўным спусташэннем усё гэтае чытво адгукаецца потым — не задумваюцца.

Не ведаю, не магу выпісаць нейкі рэцэпт супраць бездухоўнасці. Добра ўсведамляю толькі адно: трэба заўсёды памятаць, што ты перш за ўсё — беларус, што на беларускім літаратурным небасхіле ззяюць і не згараюць зоркі Багдановіча і Чорнага, Купалы і Гарэцкага, Мележа і Багушэвіча, Коласа і Танка... Трэба і чыноўнікам усіх рангаў, якія маюць непасрэднае дачыненне да кнігі, ставіцца да ўсяго свайго з павагай, шукаць ці пракладаць непракладзеныя яшчэ сцежкі-дарожкі да чытача, а не так, як гэта робіцца ў закутках — інакш іх і не назавеш — раённых універмагаў, дзе толькі адна палічка з кніжкамі сярод іншага набору шырспажыву. І ў "закутках" гэтых не ведаюць выдавецкіх планаў, не цікавяцца выпускам мастацкай літаратуры. Пытаюся неяк у аднаго дырэктара такога універмага, калі было апошняе паступленне беларускай літаратуры ў кніжны аддзел, і чую: "Не памятаю ўжо!"

А я глядзеў на таго дырэктара і думаў: а што, калі б тут не стала раптам каструль, вёдраў, электралямпачак? Пакаралі б некага, як піць даць! Дык чаму не караюць за абыякавыя адносіны да роднай кніжкі?

Зрэшты, калі загаворыш з гандлярамі кнігай любога рангу пра рэалізацыю беларускай мастацкай літаратуры, то яны знойдуць шмат апраўданняў. Апраўдаць можна што заўгодна. Але ці апраўдаеш абыякавасць, ды і ўвогуле, ці падлягае яна апраўданню? Дык па якіх жа тады якасцях падбіраюцца тыя работнікі, якія здольны апраўдаць усё?..

Алег САЛТУК
Віцебск
Фота Кастуся Дробава

Мне чамусьці хочацца называць яго мастаком, мастаком слова. Як чалавек эмацыйны, неспакойны да рознабаковых праяў жыцця, кожны раз пры сустрэчы ён уражвае здаровым зарадам энергетыкі, якая трымае чалавека ў добрым працаздольным тонусе. Заўсёды пры сустрэчы я бачу шчырага, моцнага духам і целам беларуса. Здаецца, што чалавек, які з самага маленства апынуўся ў невыносна цяжкім віры жыцця (страціў бацькоў, ішоў праз страшнае ваеннае і пасляваеннае ліхалецце) не зможа так моцна любіць жыццё, глядзець на яго вачыма з вясёлым жыццесцвярджальным агеньчыкам, які сяды-тады ад успамінаў крыху цяжэе і прыгасае. Пісьменнік, Аляксей Філатаў, нягледзячы ні на што, мае моцныя жыццёвыя карані, якія жывяцца народным непахісным духам, вераю ў лепшае будучае і цвёрдай грамадзянскай пазіцыяй...

Талент мастака

Аповесці, апавяданні, лірычныя замалёўкі і гумарэскі Аляксея Георгіевіча кранаюць чытача сваёю каларытнаю моваю, жывапісناсцю, запамінальным сюжэтам... Проза літаратара захапляе своеасаблівасцю жыццёвых сітуацый, з густам паказаных Аляксеем Філатавым, які ў сваіх творах моцна трымаецца народнага жыцця Палесся не толькі берасцейскага, але і суседняга — валынскага. Ён выступае і як сведка апісаных падзей, і як іх удзельнік. Гэта адлюстроўваецца заўсёды і ў той народнай мове, якую Аляксей Георгіевіч удала выкарыстоўвае ў сваіх празаічных творах.

Арыгінальная манера пісьма, праўдзівасць апісання роднага краю, яго побыту, гаворкі надае творам пісьменніка непаўторны каларыт. Працуючы не так даўно над мастацкім афармленнем яго кніжкі "Страла жыцця" (2007 год), якая складаецца з мініяцюр, апавяданняў, гумарэсак, я вельмі ўважліва перачытваў усе тэксты, каб як мага мацней адчуць душу аўтара, яго літаратурны талент, яго адносіны да герояў сваіх твораў. І недарма гэтая кніжка была адзначана ў тым жа годзе літаратурнай Мядовай прэміяй, якая ўручаецца па ініцыятыве ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама пчаляром і паэтам Міколам Папекам. Асаблівую цікавасць у гэтай кніжцы выклікае раздзел "Не забуду вас, хлопцы", у якім шмат аповедаў пра сяброў-пісьменнікаў. Таму так пранікнёна і чула піша пра жабінкаўскіх паэтаў Васіля Гадульку, Васіля Сахарчука, якія заўчасна пайшлі з жыцця, пакінуўшы запамінальную паэтычную спадчыну. З асаблівай любоўю ўзгадвае пра такіх літаратараў як Васіль Жуковіч, Мікола Сянкевіч, Аляксей Бакуменка, Сцяпан Крываль...

З цеплынёй і ўдзячнасцю Аляксей Філатаў успамінае літаратурныя "чацвяргі" — пасяджэнні літаратурнага аб'яднання пры абласной газеце "Заря" ў Брэсце, дзе вучыліся адзін у аднаго Мікола Засім, Уладзімір Калеснік, Міхась Рудкоўскі, Мікола Купрэеў (некалі ён сказаў у прыватнай размове Аляксею Філатаву: "Ты, Філатаў, не празаік! Ты — мастак, ты — паэт!"), Васіль Жуковіч, Іван Мельнічук, потым Мікола Пракаповіч, Алесь Каско ды іншыя.

Ім было ўтульна знаходзіцца побач. Што ні чалавек, то асоба.

А нарадзіўся юбіляр у 1939 годзе ў вёсцы Бабінічы Віцебскага раёна. Сям'я Філатавых прыехала на Берасцейшчыну пасля вераснёвых падзей 1939 года. Маці, Фядора Восіпаўна, пасля заканчэння Віцебскага педагагічнага інстытута працавала ў Брэсцкім педвучылішчы. Бацька, Георгій Фёдаравіч, атрымліваў вышэйшую адукацыю ў Маскве, адкуль і трапіў на фронт.

Аляксей з маці жылі ў Маларыце ў цёткі Марыі Восіпаўны, якая працавала завучам Маларыцкай сярэдняй школы № 1. У першыя ж гадзіны вайны Аляксей асірацеў: маці загінула ад першага нямецкага снарада, які разарваўся ля школы ў Маларыце. Хлопчык, паранены ў галаву, трапіў у мясцовы шпіталь, які ў хуткім часе захапілі немцы. Так для будучага пісьменніка пачалася вайна.

Усынавіў хлопчыка Аляксей Нічыпаравіч Афанасьеў — дырэктар Ляхавецкай школы. Шмат чаго давялося перажыць Аляксею ў маленстве, у тым ліку фашысцкі канцлагер. Сям'ю Афанасьевых Аляксей Георгіевіч заўсёды ўспамінае з пяшчотай, бо найлепшыя чалавечыя якасці ў яго былі выхаваны там.

Пасля школы Аляксей Філатаў закончыў Брэсцкі чыгуначны тэхнікум. Вучыўся завочна на філалагічным факультэце Брэсцкага педагагічнага інстытута, які скончыў у 1971 годзе. У інстытуце завязалася шчырае сяброўства з Уладзімірам Калеснікам і Аляксеем Майсейчыкам.

Працаваў пісьменнік майстрам на чыгунцы, галоўным інжынерам у дарожным будаўніцтве, журналістам і настаўнікам — гэта дало багаты жыццёвы вопыт і матэрыялы для шматлікіх празаічных твораў, для будучых кніг. Да таго ж, Аляксей Георгіевіч доўгі час быў трэнерам па лёгкай атлетыцы, сам займаўся спортам. Усё гэта сёння спрыяе яму ў фізічным стане і дапамагае трымацца ў літаратуры, выжываць у няпросты час фінансавага крызісу: нешта зарабляць і да пенсіі...

Аляксей Філатаў даўно жыве ў пасёлку Мухавец Брэсцкага раёна, дзе працаваў настаўнікам. Але пра родныя Ляхаўцы ў Маларыцкім раёне гаворыць, што "гэта была не проста вёска, а нейкі цуд: нешта першароднае і непаўторнае"... Менавіта таму галоўным аб'ектам творчасці празаіка сталі родныя мясціны, землякі — маларытчане. А кніжка "Ляхавецкая торба" (1992г.) зрабіла ляхаўчан падобнымі да сусветнавядомых габраўцаў. У сваіх творах, блізкіх да анекдотаў, пісьменнік натуральна выкарыстоўвае жывую гутарковую мову вяскоўцаў.

Увогуле ўся біяграфія Аляксея Філатава змешчана на старонках яго кніг.

За ўсе пяць грунтоўных кніжак прозы Аляксей Філатаў уганараваны ў 2007 годзе дыпломам імя Уладзіміра Калесніка берасцейскай філіі СБП, які атрымаў з рук Ніны Мацяш, у той час — старшыні літаратурнай філіі.

Гатовы на цяперашні час і рукапіс новай кніжкі прозы пісьменніка "Жывому — жыць!" Засталося толькі пачакаць дня яе выдання. Мы зноў сустрэнемся з лірычнымі замалёўкамі родных мясцін, трагікамічнымі аповедамі землякоў. Пісьменнік падкрэслівае, што ўсё яшчэ не перастае здзіўляцца нараджэнню новага дня, бо кожны новы дзень прыносіць асалоду назірання за жыццём, новыя творчыя набыткі... І вельмі хочацца, каб у хуткім часе збор лепшых твораў Аляксея Філатава выдала б дзяржаўнае выдавецтва, каб з творчасцю берасцейскага празаіка маглі пазнаёміцца шматлікія чытачы нашай роднай Беларусі.

Лявон ВАЛАСЮК

Грунтоўнае вывучэнне літаратуры патрабуе спасціжэння многіх крыніц. Поруч з самімі мастацкімі тэкстамі ідуць літаратурная крытыка і літаратуразнаўства. Сваю ролю, несумненна, адыгрываюць і архіўныя матэрыялы, знаёмствы з публікацыямі ў перыядычным друку таго ці іншага перыяду. Асаблівае месца належыць персаніфіцыраваным, аўтабіяграфічным артыкулам, нарысам, эсэ. Нездарма вялікім попытам у беларускага чытача карыстаюцца даўно выдадзеныя зборнікі "Пяцьдзесят чатыры дарогі" (1963), "Пра час і пра сябе" (1966), "Вытокі песні" (1973). Аўтабіяграфія, калі пакінуць убаку яе вызначэнне як афіцыйнага дакумента, ёсць "апісанне свайго жыцця, літаратурны жанр. Ад біяграфіі адрозніваецца тым, што грунтуецца на ўласных успамінах і належыць пяру аўтара, у той час як біяграфія ствараецца паводле архіўных, друкаваных і вусных крыніц іншых асоб — біёграфам".

На шляху да сябе

У РВУ "Літаратура і Мастацтва" на пачатку 2009 года пабачыла свет кніга аўтабіяграфій пісьменнікаў Беларусі — "З росных сцяжын" (укладальнік — Мікола Мінзер). Пад адной вокладкай сабраны 54 аўтабіяграфіі. Як быццам укладальнік і выдавецтва вяртаюць цікаўнага чытача да даўняй традыцыі, збору пісьменніцкіх жыццяпісаў, да кнігі "Пяцьдзесят чатыры дарогі"... У салідным томе (каля трыццаці друкаваных аркушаў!) "Пра час і пра сябе" расказваюць: Генадзь Аўласенка, Анатоль Аўруцін, Раіса Баравікова, Міхась Башлакоў, Алесь Бельскі, Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Яўген Гарадніцкі, Валянціна Гіруць-Русакевіч, Уладзімір Гніламёдаў, Сяргей Давідовіч, Генрых Далідовіч, Зінаіда Дудзюк, Алесь Жук, Анатоль Зэкаў, Анатоль Казлоў, Мікалай Калінковіч, Іван Капыловіч, Уладзімір Карызна, Наталля Касцючэнка, Тамара Краснова-Гусачэнка, Яўген Крупенька, Мікола Купрэеў, Міхась Курыла, Леанід Левановіч, Уладзімір Ліпскі, Валянцін Лукша, Уладзімір Мазго, Васіль Макарэвіч, Уладзімір Мароз, Алесь Марціновіч, Таццяна Мушынская, Мікола Мятліцкі, Алесь Наварыч, Міхась Пазнякоў, Сяргей Панізнік, Генадзь Пашкоў, Алесь Пісьмянкоў, Ігар Пракаповіч, Вячаслаў Рагойша, Людміла Рублеўская, Уладзімір Саламаха, Алег Салтук, Рыгор Семашкевіч, Міхась Сліва, Васіль Ткачоў, Сяргей Трахімёнак, Юрый Фатнеў, Уладзімір Федасеенка, Мікола Чарняўскі, Сяргей Чыгрын, Мікола Шабовіч, Віктар Шніп, Уладзімір Шугля. Празаікі, паэты, літаратуразнаўцы, літаратурныя краязнаўцы, дзіцячыя пісьменнікі. У кожнага — свае здабыткі ў літаратуры. Некаторыя з аўтараў ужо пайшлі з жыцця.

Мікалай Калінковіч загінуў у 1990 годзе ў Тбілісі. У кнізе надрукавана аўтабіяграфія, якую пісьменнік занатаваў 21 кастрычніка 1985 года па просьбе Лунінецкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея. Вядома ж, пяць гадоў (з 1985 па 1990) дадалі да творчага і жыццёвага лёсу Мікалая Калінковіча шмат новага. Завяршыў работу над дысертацыяй, стаў кандыдатам гістарычных навук. Напісаў аповесці пра Браніслава Тарашкевіча і Аляксандра Грыбаедава. З першай аповесці друкаваўся невялікі раздзел у часопісе "Полымя". Аповесць пра повязь аўтара неўміручай паэмы "Гора ад розуму" з Берасцейшчынай з працягам друкавалася ў абласной газеце "Заря".

Зборнік "З росных сцяжын" выдадзены накладам 2000 асобнікаў. Для параўнання: "Вытокі песні" ў 1973 годзе — 5000 экземпляраў. Час пакажа, ці знойдзе свайго чытача новая кніга пісьменніцкіх аўтабіяграфій. Добра было б, каб выданне прыйшло ў школы краіны. Хаця б — у сярэднія.

Даўно пайшоў з жыцця паэт Яўген Крупенька (1936—1990). Укладальнік "З росных сцяжын" прапаноўвае чытачу тэкст з гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць" Шклоўскага раёна (Яўген Крупенька нарадзіўся на Шклоўшчыне). Шкада, што няма пазнакі, з якой нагоды і калі дакладна была напісана аўтабіяграфія. Гэтая заўвага падштурхоўвае і да наступных разважанняў. Калі ў зборніка "З росных сцяжын" будзе працяг, то, відавочна, кнігі падобнага кшталту патрабуюць уключэння каментарыяў, а мо яшчэ і паказальнікаў — імяннога, геаграфічнага.

Зварот укладальніка да кнігі "Памяць" у выпадку з аўтабіяграфіяй Яўгена Крупенькі паказвае на вартасць выкарыстання матэрыялаў з гісторыка-дакументальных раённых летапісаў. "Замест аўтабіяграфіі" пад назвай "Абрысы творчай постаці пісьменніка" друкуецца інтэрв'ю Леаніда Галубовіча з Міколам Купрэевым. Вядомае і па ранейшых публікацыях, яно з'яўляецца дастаткова сур'ёзнай крыніцай для вывучэння жыццяпісу, творчага шляху аўтара "Палескай элегіі" і іншых шчымлівых аповесцяў. З цікавасцю ўспрымаецца і раней публікаваны тэкст Алеся Пісьмянкова "Думаць вершы". Пра Рыгора Семашкевіча (1945—1982) красамоўна распавядае яго верш "Аўтабіяграфія". "*Нарадзіўся ў сорак пятым. Беларус. / Ахрысціла вайна. Гадавала маці. / Жыве вайна. Жыве і маці. / Вайны не бачыў. / А чуў, што туляецца па завуголлях*". Магчыма, структура кнігі гэтай публікацыяй у некаторай ступені парушаецца. Але ж верш дастаткова ўражлівы і адметны.

"З росных сцяжын" — кніга аўтабіяграфій пісьменнікаў розных пакаленняў. Уладзіміру Гніламёдаву, Уладзіміру Карызну, Леаніду Левановічу, Валянціну Лукшу, Юрыю Фатневу, Уладзіміру Федасеенку — за семдзесят... Анатоль Аўруцін, Раіса Баравікова, Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Сяргей Давідовіч, Генрых Далідовіч, Алесь Жук, Іван Капыловіч, Тамара Краснова-Гусачэнка, Уладзімір Ліпскі, Алесь Марціновіч, Сяргей Панізнік, Вячаслаў Рагойша, Уладзімір Саламаха, Васіль Ткачоў, Мікола Чарняўскі — з тых, хто адмераў свой шасцідзесяцігадовы рубеж. Хтосьці з аўтараў аўтабіяграфіі набліжаецца да гэтай мяжы. Відаць, так, што палова "герояў" зборніка — пісьменнікі, якія аддалі літаратурнаму занятку па тры-чатыры і больш дзесяцігоддзі, падказвае ўкладальніку наступнай кнігі аўтабіяграфій і некаторыя прыярытэты. Чаму б перш-наперш не ўключаць у зборнік расповеды пісьменнікаў старэйшага пакалення? У Брэсце жыве літаратар Васіль Ласковіч, якому за 90 гадоў. На Міншчыне — Васіль Гурскі, Рыгор Ігнаценка... Прыкладаў можна прыводзіць шмат. Па зразумелых прычынах (уступілі ў творчы саюз пазней 1973 года, у якім ужо выйшла апошняя са згаданых кніг пісьменніцкіх аўтабіяграфій, і іншыя важкія акалічнасці) у зборніках "Пяцьдзесят чатыры дарогі", "Пра час і пра сябе", "Вытокі песні" няма аўтабіяграфій Пятра Бітэля, Сяргея Новіка-Пяюна, Зоські Верас, Захара Біралы, Алеся Траяноўскага, Нэлі Тулупавай, Віктара Хаўратовіча, Артура Цяжкага, Тамары Чабан, Івана Чыгрына, Яўгена Шабана, Івана Шальманава, Лявона Шырына... Пералік, канечне ж, вельмі агульны. Шмат тых, хто не "ўвайшоў" у першыя выданні аўтабіяграфій, мажліва, і не пакінулі ўласнаручна напісаных творчых расповедаў пра саміх сябе. Але ж хіба нельга знайсці афіцыйныя аўтабіяграфіі, якія літаратары пісалі, паступаючы на вучобу ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, уладкоўваючыся на працу. Яшчэ адзін важны абсяг — матэрыялы пра пісьменнікаў даваеннага пакалення, тых, хто быў рэпрэсіраваны ў 1930-я гады альбо загінуў у Вялікую Айчынную вайну. Як прыклад — некаторыя аўтабіяграфіі, змешчаныя ў кнізе "Вытокі песні". Біяграфія Андрэя Ушкова (загінуў на фронце ў 1942 годзе) надрукавана па рукапісе, які захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. Вельмі лаканічны тэкст, усяго дзве кніжныя старонкі. Напісана аўтабіяграфія ў Віцебску ў 1931 годзе. У 1932 годзе напісаў аўтабіяграфію Сымон Баранавых. На рускай мове. Тэкст, які дагэтуль быў вядомы толькі архівістам, пераклаў на беларускую мову ўкладальнік "Вытокаў песні" Янка Казека.

Але ж вернемся да кнігі "З росных сцяжын". Аб'ём аўтабіяграфій досыць розны. Хтосьці свае "абрысы" выклаў зусім лаканічна — на тры-чатыры кніжныя старонкі. Нехта "разышоўся" на ўсе дваццаць... Аўтабіяграфіі большасці пісьменнікаў сведчаць, што нацыянальная літаратура выйшла з вёскі. Гэта відаць ужо і па іх назвах — "Ёсць на Валожыншчыне вёска Пугачы" (Віктар Шніп, "З хаты на Пляцы Волі" (Вячаслаў Рагойша), "Апошні жыхар старога Палесся" (Мікола Мятліцкі), "Патапаўка — мая буслянка" (Анатоль Зэкаў), "А я ў Баяры, дамоў хачу..." (Анатоль Бутэвіч)... Чытаючы шчырыя, часам надзвычай шчырыя, эсэ, наноў адкрываеш ужо і раней знаёмыя творы аўтараў кнігі "З росных сцяжын", па-новаму пачынаеш ставіцца да пісьменнікаў. Разумееш, чаму з літаратуразнаўства ў мастацкую прозу сышоў вядомы крытык, дасведчаны ў літаратурнай тэорыі акадэмік Уладзімір Васільевіч Гніламёдаў: "*Я не таму стаў займацца прозай, што мне так захацелася. Тут пазітыўна адбілася пашырэнне ў нашым грамадстве сектара свабоды, калі ў гістарычным пазнанні выявілася мноства белых плям і раней невядомых літаратурных імёнаў. Столькі ўсяго мы не ведалі і, зразумела, не маглі пра яго расказаць, і раптам такая магчымасць з'явілася*". І далей: "*Я, помню, аднаго разу паехаў у сваю вёску Кругель — гляджу і думаю: хто раскажа пра ўсё тое, што адбывалася на гэтай вуліцы, у гэтых мясцінах? Чаго тут толькі ні было, якая тут толькі ўлада ні панавала. Толькі адзін я помню, як у верасні 1939 года ішла чырвоная кавалерыя, як прыехала аўтамашына з вялікай бочкай газы — налівалі людзям у розны посуд, каб можна было асвятляць лямпамі хаты. Помню нямецкія абозы і танкі, стомленых каўпакаўцаў, вызваленне. Дык гэта — эпахальныя падзеі, а штодзённае жыццё, побыт... У кожнай хаце, на кожным падворку адбывалася нешта сваё, для кожнага канкрэтнага чалавека важнае і непаўторнае. Думаю, вось гэта энтрапія, як кажуць фізікі, усё праглыне і ніхто нічога не будзе ведаць. З аднакласнікаў адзін я звязаў сябе з філалогіяй, мовай і літаратурай. І мне ад пачуцця ўдзячнасці да сваіх продкаў, бабы і дзеда, бацькоў захацелася расказаць пра іх, пра тое, як яны жылі на гэтай старажытнай зямлі, працавалі, любілі, радаваліся і пакутавалі...*"

Зборнік "З росных сцяжын" выдадзены накладам 2000 асобнікаў. Для параўнання: "Вытокі песні" ў 1973 годзе — 5000 экземпляраў. Час пакажа, ці знойдзе свайго чытача новая кніга пісьменніцкіх аўтабіяграфій. Добра было б, каб выданне прыйшло ў школы краіны. Хаця б — у сярэднія. Вывучаць сучасную літаратуру Беларусі, карыстаючыся менавіта матэрыяламі, якія носяць характар першакрыніцы, пагадзіцеся, нашмат лягчэй.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

Навобмацак

Твор = т(а)вар

Наяўная культурная сітуацыя ў культурнай часткі інфармацыйнага грамадства асацыятыўна звязваецца з чарговай версіяй дэкадансу. З асаблівай жорсткасцю сучаснасць паставілася да сённяшніх лоўцаў слоў, якім людзі "пазакультурныя" нават адмаўляюць у праве Пісьменнікамі звацца!..

Адным з вынікаў доўгіх унутрылітаратурных дыскусій пра стан і перспектывы найноўшага беларускага мастацтва слова сталася выснова-"адкрыццё" пра тое, што гаротны стан літаратуры абумоўлены неймавернай (*невылечнай*) сціпласцю айчынных творцаў: не ўмеюць нібыта ні сябе падаць ("распіярыць"), ні сваё прадаць (зацікавіць спажыўцоў выробленым "прадуктам"). Як і варта было чакаць, пастаўлены дыягназ не стаўся нагодаю для лячэння: не можаш (не хочаш) ператварацца ў медыяперсону — сядзі галодны (у шырокім сэнсе). Гэтак — тут. Там (нават у недалёкім, блізкім "там") — іначай.

Летась ва ўкраінскім Львове ў межах пятнаццацага Форуму выдаўцоў прайшоў Трэці міжнародны літаратурны фестываль, у якім планавалі ўзяць удзел больш як паўтары сотні пісьменнікаў з пятнаццаці краін свету. Галоўнай тэмай фестывалю сталася "*Літаратура в епоху мас-медія*", спецыяльным госцем — Аўстрыя. Арганізатары фэсту абяцалі шмат "*ефектних несподіванок, гепенінгів та концептуальних читань*", а таксама музыкі, відэа; дапаўняць літаратуру закліканы былі найноўшыя камп'ютэрныя тэхналогіі.

Здавалася б, знайшлі сякеру пад лаваю: здараюцца і ў нас — *з нагоды літаратуры* — семінары-фэсты-святы, па кулуарах якіх блукаюць з разгубленымі ўсмешкамі госці-пісьменнікі, свае і чужыя. Але ніводны з іх не ўражвае гэткім клопатам пра пісьменніка ды ўвагаю да яго, як традыцыйны Форум выдаўцоў (!) у Львове. Справа ў тым, што да яго пачатку быў выштукаваны "Альманах", на трох сотнях старонак якога знайшлося месца амаль дзевяці дзесяткам літаратараў. Класікам і "мэтрам" сучаснага пісьменства з розных краін (гасцям Юдзіт Герман, Янушу Главацкаму, Таццяне Талстой ды інш., а таксама "найлепшым украінскім літаратарам") у выданні адводзіцца ад двух да шасці старонак; фармат лаканічны, але дастатковы для таго, каб змясціць фота творцы, не абцяжараную доўгім спісам заслуг і ўзнагарод біябібліяграфічную даведку і кароткі мастацкі тэкст (ці ўрывак з яго). Крыху сціплей былі прадстаўленыя юныя ўкраінскія версіфікатары, якім у абсягу раздзела "Маладая рэспубліка паэтаў" адводзілася па старонцы. Такім чынам, дзякуючы "Альманаху" ўкраінская публіка займела магчымасць без асаблівых інтэлектуальных высілкаў ды часавых выдаткаў "персаніфікаваць" свае ўяўленні пра напаўміфічнага сучаснага пісьменніка, які, бы снежны чалавек, недзе ёсць, але яго мала хто з простых людзей бачыў.

Заўважым — *між іншым* — што арганізатары фэсту парупіліся прадставіць у "Альманаху" і беларускіх аўтараў — Наталку Бабіну ды Зміцера Вішнёва, прычым у "мэтрава"-"слупавым" фармаце: з партрэтнай выявай, звесткамі пра жыццятворчасць і ўзорамі літаратурнай прадукцыі. Вось як сабе хочаце, але беларускаму пісьменніку і сёння "Бог не роўна дзеле": рэпрэзентаваныя на Форуме ўкраінскіх выдаўцоў беларускія літаратары не пакутуюць на хранічную "сціпласць" (што выракае іх калег на сусветную невядомасць), даволі рэгулярна выдаюць кнігі, так ці інакш актуалізуюцца ў медыяпрасторы... І няхай родныя чытачы маюць прыблізнае ўяўленне пра іх *творы*, але затое выдаўцы, прычым замежныя (еўрапейскія!) маюць шанц запомніць іх *твары*. Не ведаю, ці рады такой канкурэнцыі ўкраінскія калегі Н. Бабінай і Зм. Вішнёва, а вось асабіста мне кніга з непрэтэнцыёзнай назвай "Альманах" дала магчымасць насамрэч парадавацца: за выдаўцоў (найперш украінскіх), за чытачоў (здольных зарыентавацца ў тэкстах на ўкраінскай мове) і за літаратараў, якія не гальмакуюць на фэстах бязмэтна, але напружана шукаюць адказы на пытанне: "*Чи, "померши" наприкінці двадцятого століття, автор воскрес у двадцять першому, але вже як медіа-ікона, торгова марка, логотип з обкладинки?*"

Ірына ШАЎЛЯКОВА

Пра тое, выключна «пісьменніцкае»...

Што пісьменніку шчасце...

Самым цікавым творам нумара, безумоўна, з'яўляецца, раман-эсэ Андрэя Федарэнкі "Мяжа". Праўда, назвы хацелася б усё ж іншай — больш адметнай, больш уражвальнай. Нягледзячы на тое, што пісьменнік прапанаваў чытачу толькі першую частку, твор успрымаецца завершаным, цэласным, што і дае падставы пра яго паразважаць.

Увогуле "Мяжа" не ўласцівая творчай манеры А. Федарэнкі, яна відавочна адрозніваецца ад напісанага пісьменнікам раней. Зрэшты, на тое яна і "мяжа", каб стаць нечым такім — адрозным ад папярэдняга. Ці варта казаць, што чытаецца раман цікава? Тут ёсць і досціп, і сумная іронія, і трапныя жыццёвыя назіранні, і настальгічныя карцінкі так ці іначай шмат каму з нас роднага вясковага дзяцінства. Усё гэта па-мастацку паўнавартасна само па сабе — прытым, аднак, што гэта не галоўнае ў рамане і выконвае ролю толькі фону, матэрыялу, канвы. А. Федарэнка не пакідае чытача на самоце са сваімі развагамі адносна мастацкай задумы і без алегорый тлумачыць, што імкнуўся *"прасачыць на адной канкрэтна ўзятай біяграфіі, на гэтых зведзеных у адно выпадках, гісторыях, сітуацыях зародак творчасці. Як у народзе кажуць — што адкуль бярэцца? Чалавек дзякуючы такой біяграфіі абавязкова рана ці позна павінен быў бы пісаць, ці ён ужо нарадзіўся дзвінутым?"* (ці не гэтым кіраваліся і аўтары ўсіх вядомых у літаратуры мастацкіх апісанняў сваіх *"детства, отрочества, юности"*?)

Красамоўнае і вычарпальнае тлумачэнне, а вось адказам на пастаўленае пісьменнікам пытанне сам раман усё ж не з'яўляецца. Ды і ці можа быць адназначны адказ на такія пытанні? А само тлумачэнне падаецца сваёй гэтай вычарпальнасцю збыткоўным, празмерным. Аўтар нібыта арыентуецца не на чытача, а на яго бездапаможнасць. Апошняя, 27 глава, у якой "падводзяцца рахункі" менавіта таму падаецца лішняй — гэта тое, што павінна было б застацца "за кадрам", тое, пра што павінны разважаць, меркаваць пасля прачытання замест таго, каб проста прачытаць на апошняй старонцы. Пісьменнік сам сабе зрабіў мядзведжую паслугу — спрасціў успрыманне рамана, збядніўшы гэтым самым і ўражанне ад яго. Мабыць, боязь, што чытач не зразумее ці зразумее не так мастацкую задуму пераважыла меркаванні эстэтычнай *мяжы*.

"Мяжа" ахоплівае значна шырэйшы за акрэслены аўтарам — літаратурны — дыяпазон пытанняў і жыццёвых аспектаў. Галоўны герой хлопчык — падлетак — малады чалавек Андрэй, ідэнтычнасці з якім аўтар не тое што не хавае, а свядома падкрэслівае, бясконца рэфлексуе з нагоды ўсяго, што з ім адбываецца. Ён нават у дзяцінстве — не ідэальны герой, ён можа быць лянівым, безадказным і нахабным, словам, звычайным маленькім чалавекам, які пра жыццё ведае толькі тое, што яно ўсё яшчэ наперадзе. Невядома, ці то менавіта з-за аўтабіяграфічнасці вобраза, ці то са свядомай устаноўкі толькі на назіранне, але дзеянні, учынкі героя сапраўды не атрымліваюць аўтарскіх каментарыяў. А. Федарэнка занатоўвае факт, напрыклад: дзеля забавы з лепшым сябрам дзяцінства Сержыкам галоўны герой здзекуецца з хворай жанчыны, якая перастала размаўляць пасля таго, як яе збіў п'яны муж, а сам Сержык, дарэчы, па сведчанні аўтара, знаходзіцца цяпер *"недзе ў "суворай" аршанскай турме"*; некалі выселены са студэнцкага інтэрната (выселены несправядліва) герой *"п'яны, з цыгарэтаю ў зубах, з дзеўкаю (вольных паводзін) пад руку"* ідзе да каменданта, каб пахваліцца лістом ад Вольгі Іпатавай з рэдакцыі "Чырвонай змены": *"... вы вось мяне выгналі, а мяне хваляць, у Мінску ведаюць..."* Шэлепень (прозвішча каменданта) незалежна, з веданнем жыцця адказвае, што "і Героя Савецкага Саюза можна выселіць з абшчагі". *"Якая дурасць, шэрасць, душната! Я шчаслівы. Я не ваш. Я знайшоў сябе. Я цяпер ведаю, кім буду. Як мне жыць. Хто будзе мяне акружаць"*, — сам сабе прамаўляе герой. Крыху нечакана гучыць такая выснова, асабліва калі ўлічыць, у якім стане і ў якой кампаніі прыйшоў герой у інтэрнат. Гэта не падпарадкоўваецца звычайнай жыццёвай логіцы, аднак ніхто ж і не спрачаецца з тым, што пісьменнікі — людзі незвычайныя. Тут як у прымаўцы, "што рускаму добра — то немцу смерць": што пісьменніку шчасце, то звычайнаму чалавеку... Гэта без сарказму: раман А. Федарэнкі сапраўды пра тое выключна "пісьменніцкае", што незразумела, а часам і недаступна разуменню іншых.

На празаічных старонках, акрамя рамана-эсэ А. Федарэнкі, — апавяданні А. Якімовіча, І. Пракаповіча, а таксама нізкі вершаў М. Дуксы, А. Шпыркова, антычная любоўная лірыка ў перакладзе Я. Сіпакова, *"жарты, падколкі з Аўцюкоўскай брахамолкі"* ў "выкананні" У. Ліпскага. Аддзел крытыкі і літаратуразнаўства прадстаўляе артыкулы С. Андраюка, П. Сабіны, М. Мятліцкага, І. Штэйнера, Т. Шамякінай. А. Бадак распавядае пра творчы шлях кампазітара-песенніка У. Будніка, Э. Іофе разважае, чым жа на самай справе з'яўляецца кніга А. Раманько "Коричневые тени в Полесье. Беларусь 1941—1945", выдадзеная ў Маскве ў 2008 годзе.

Жыццё не па ролях

Пачынаючы чытаць аповесць Веры Зелянко "Родня", амаль фізічна адчуваеш трывогу — з-за нагнятання псіхалагічнай атмасферы, з-за таго, што аўтарка не дае магчымасці зразумець сутнасці таго, што адбываецца з галоўнай гераіняй (яна чамусьці збягае ад бацькоў і сястры з немаўлём, якое нарадзілася ўсяго толькі два тыдні таму, — збягае невядома куды і невядома дзеля чаго)... Зрэшты, чаканай разгадкі чытач так і не атрымае. Аднак ужо праз некалькі старонак, калі аповед набліжаецца да жыцця маладой жанчыны Жэні і яе сына Ванечкі ва ўкраінскай вёсачцы, з'яўляецца зусім іншае, настальгічна-цёплае адчуванне. Аповесць сапраўды напісана вельмі цёпла і, на першы погляд, вельмі проста. Няма ў ёй ні глыбокіх разваг, ні тонка-псіхалагічна выпісаных назіранняў, ні імклівага развіцця сюжэта. Жэня сама характарызуе сваё жыццё ў Баячыўцы не вельмі красамоўным словам "руціна". А некаторыя апісанні складаных перыпетый жыцця разгалінаванага сямейнага дрэва нават выклікаюць у памяці побытапісальную ўкраінскую літаратуру XIX стагоддзя. Галоўная гераіня нібыта піша дзённік, у якім падрабязна фіксуе ўсё, што з ёй адбываецца, не дзеля ўнутранага аналізу, а толькі дзеля таго, каб зафіксаваць у памяці. Стыль аўтаркі даволі стрыманы і часам нават безэмацыйны, складаецца такое ўражанне, што асноўнай сваёй задачай яна лічыла стварэнне яркіх, насычаных фарбамі карцінак, ад "разгляду" якіх чытач павінен атрымліваць такія ж эмоцыі, як ад разгляду сапраўдных мастацкіх карцін — аўтар, прадставіўшы чытачу / гледачу твор, застаецца нібыта збоку, не навязвае ніякіх "аўтарскіх канцэпцый".

Ёсць у гэтай аповесці нейкая загадкавая прыцягальнасць, магчыма, яна — у жыццесцвярджальным пафасе, магчыма, ва ўраўнаважаным стылі аўтаркі, пад уплывам якога і чытач на некалькі імгненняў насычаецца гарманічным светаадчуваннем. І гэта пры тым, што ў аповесці няма так званага "хэпі-энду". Збегшы як мага далей ад свайго звыклага ладу жыцця, а насамрэч — ад Андрэя, бацькі маленькага хлопчыка, Жэня не змагалася за выжыванне, як гэта падавалася ёй самой, а чакала, што несправядлівы каханак усё-ткі знойдзе яе і прыедзе прасіць прабачэння. Так яно і адбылося: Андрэй прыехаў, сказаў, што кахае іншую жанчыну, якая не можа мець дзяцей, і папрасіў аддаць яму сына. Толькі пасля гэтага Жэня адчула непатрэбнасць свайго "вялікага перасялення" ў іншы свет, іншую краіну (яна жыла ў Санкт-Пецярбургу) і вярнулася да бацькоў.

Нешта ёсць у гэтай звычайнай гісторыі са звычайнай развязкай такое, чаго так не стае ў сучасным жыцці. Магчыма, менавіта самой гэтай звычайнасці, калі чалавек, пазбавіўшыся ад другаснага і штучна навязанага, можа адчуць смак жыцця не па ролях, без масак.

Упершыню ў "Нёмане" прадстаўлены вершы Міланы Лявіцкай. Калі чытач акажацца цярплівым і прагным дайсці да сэнсу кожнай мастацкай з'явы, то ён будзе не адзін раз перачытваць радкі маладой паэткі (пры гэтым поспех не гарантаваны)...

Справа нават не ў цьмянасці паэтычнай думкі — калі-нікалі і гэта бывае станоўчай рысай, справа не ў мала зразумелым перапляценні вобразаў сучаснасці з вобразамі беларускай мінуўшчыны. Уласна мяне збянтэжыла адсутнасць элементарнага сэнсу. Не навіна сустракаць у вершах рознага ўзросту аўтараў выпадковае суседства абсалютна не звязаных паміж сабой слоў, метафар і вобразаў, створанае, верагодна, па прынцыпе "так напісалася". А паколькі натхненне — рэч невытлумачальная і сакральная, то і пытанняў яму ніхто не задае — ну, напісалася так, што ж тут будзеш рабіць... Аднак не навіна і тое, што за такой канцэпцыяй часта хаваецца звычайнае няўменне ці нежаданне працаваць над сваімі творамі.

...Толькі вось заманулася пасля такой прадмовы працытаваць некалькі недарэчных радкоў з вершаў М. Лявіцкай, але раптам прыгадалася — з рамана-эсэ А. Федарэнкі: *"Ні ў воднай крытыцы свету не прынята чапаць дэбютантаў. Толькі не ў нашай"*. Як на маё разуменне, дык, па-першае, дэбютанты розныя бываюць, а па-другое, некаторыя настолькі безадказна падыходзяць да сваіх першых выступаў у друку, што не "зачапіць" проста немагчыма. Што маецца на ўвазе ў радках *"Брошу голову в омут дней..."*? Яно, вядома, зразумела, што крыніцай вобраза стала прымаўка "броситься в омут с головой", але калі паспрабаваць уявіць сабе, як можна "бросить голову", то атрымліваецца непамысная карціна з не вельмі вытанчанага фільма жахаў. Альбо, напрыклад: *"Трамвай каблуками ножек / Губу мостовой сечет."* Гэта акурат той выпадак, калі імкненне да арыгінальнасці ставіць аўтара ў недарэчнае становішча.

Красавіцкі "Нёман" прадстаўляе паэтычныя нізкі Ф. Гурыновіча, Ю. Сапажкова, Н. Татур, В. Максімовіча, Е. Полеес, С. Валодзькі. Проза прадстаўлена працягам *сямейнай хронікі* У. Гніламёдава, апавяданнямі А. Башлакова. Літаратуразнаўчая прастора на гэты раз ва ўладзе І. Штэйнера і С. Андраюка. На старонках крытыкі А. Ждан сцвярджае, што "Хорошие книги появляются вовремя".

На мове метафар

Чарговы нумар "Маладосці" цешыць найперш паэтычнымі радкамі. У кожнага паэта ёсць некалькі радкоў, вершаў, метафар, з якіх складаецца паэтычнае аблічча часопіса. Усе аўтары, безумоўна, розныя. У тым і каштоўнасць іх вершаў. Лірычная гераіня Кацярыны Пікірэні смела размаўляе са светам на мове звышметафар, метафар шматузроўневых і таму мае права сказаць: *"Любы свет, ты занадта адказны"*. Ірына Бельская робіць скрушнае ***адкрыццё***, якое лепей пакідаць за дзвярыма свайго ведання:

Здаецца, такое было,
Я ўжо адчувала гэта:
Над сэрцам —
святло й цяпло.
Пад сэрцам —
квітнее лета.

...І вось яно, адкрыццё —
На сэрцы
няма
нічога.

А Сяргей Чыгрын дакарае каханую:

Ты жыла ў маім сэрцы,
Цяпер —
пераехала ў іншае...
І не паклікала мяне
на наваселле.

Гэты верш мог бы стаць пачаткам нізкі "цынічных вершаў пра каханне", здаецца, такога яшчэ не было. Цынізм сапраўды выкшталцоны, вытанчаны і — самае галоўнае — надзвычай паэтычны. Думаецца, мала каму захацелася б быць на месцы адрасата...

Апавяданне Андрэя Захарэўскага "Яйкі" больш нагадвае філалагічны абразок. Галоўны герой — студэнт факультэта журналістыкі і зноў Андрэй (у разгляданых і нёманскім, і палымянскім творах героі таксама былі Андрэі) на працягу ўсяго твора займаецца "філалагічнымі экзекуцыямі" над сваімі знаёмымі-сябрамі, што звяртаюцца да яго па дапамогу. Андрэй абураны тым, што журналістыку чамусьці шмат хто лічыць амаль тоеснай філалогіі і ўпарта намагаецца давесці, што паміж журналістам і філолагам такая ж розніца, як паміж патолагаанатамам і псіхолагам або эканамістам і інжынерам... Заканамернае пытанне: пры чым жа тут яйкі? А пры тым, што герой разважае на філалагічныя тэмы на пусты страўнік, марачы пра гарачую яечню. Адпаведна, "яечныя алегорыі" бачацца Андрэю ва ўсім, на што ён глядзіць: месяц з аблокамі — жаўток з бялком, белая прасціна, што сушыцца ў двары, — шкарлупіна ад яйка, пусты грузавік — патэльня... Карацей, апавяданне атрымалася наскрозь філалагічнае, нават і мастацкая абгортка *ў выглядзе* той самай яечні. Цяжка паверыць, што герой — будучы журналіст, затое абсалютна зразумела, што аўтар — будучы філолаг (студэнт факультэта беларускай філалогіі і культуры). У атмасферы сціранння сэнсу і смаку слоў, у якой цяпер усе словы вымушаны функцыянаваць, назіранні і высновы А. Захарэўскага падаюцца вельмі дарэчнымі і своечасовымі.

Акрамя гэтага, "Маладосць" прадстаўляе аповесць А. Казлова "Паразумецца з ветрам", працяг *дзённіка настрою* Я. Сіпакова, нізкі вершаў М. Мятліцкага, І. Бялькові́ч. *"Эскіз спасціжэння лірычнай мазаікі Рыгора Барадуліна"* зрабіла К. Сяржант, Р. Баравікова распавядае *гісторыю аднаго верша* Валянціна Тараса, В. Мартыненка прааналізаваў мас-культ Беларусі *ад "Песняроў" да "Мясцовага часу"*. Д. Марціновіч шукае адказ на пытанне "Калі прыйдзе беларускі Андрэ Маруа?", І. Запрудскі *"ветліва запрашае да размовы, што не азначае намер кагосьці "жаловать" або незаслужана ўганароўваць"* у крытычным артыкуле "Бадай-2".

▼ *Адно з галоўных непаразуменняў паміж пісьменнікамі і крытыкамі палягае ў тым, што першыя бачаць у крытычных артыкулах толькі чорнае і белае (зганілі або пахвалілі), а таму лічаць, што крытыкі бяруцца аналізаваць твор або з мэтай пахваліць, або з мэтай зганіць. І нават калі твор ацэньваецца станоўча, але ўсё ж нейкія заўвагі выказваюцца, то пісьменнік надае значэнне толькі апошняму. Настрой сапсаваны, твор недаацэнены. Чамусьці мала хто задумваецца пра тое, што нецікавыя, нявартыя творы ўвогуле не становяцца прадметам вострага абмеркавання.*

Жанна КАПУСТА

Мікола ЗАХАРАНКА

У маі спаўняецца 60 гадоў беларускаму паэту і пісьменніку Міколу Захаранку. Рэдакцыя "ЛіМа" шчыра віншуе шаноўнага юбіляра, зычыць яму здароўя і новых творчых здзяйсненняў.

З чаго пачалося

Людзі хочуць дабра.
Ды забілі бабра,
Ды застрэлілі ў лесе вавёрку.
Перабілі ваўкоў,
Патруцілі жучкоў,
Разбурылі лісіную норку.

Каб палепшыць прагрэс,
Людзі высеклі лес,
А затым асушылі балоты.
Кветкі ў лузе завялі,
Пчолы марна прапалі,
Апусцелі пчаліныя соты.

Зніклі выдра і собаль,
Узарваўся Чарнобыль,
Сумна стала
ў людскім наваколлі.
А хацелі ж дабра!
Ды забілі бабра,
І не будзе дабра ўжо ніколі.

Рабіна

Тонкая рабіна
Хіліцца самотная,
Без салаўя.
Любая дзяўчына,
Струнная, пяшчотная,
Ды — не мая.

Нікне рабіна —
Салавей пакружыць
І праміне.
Журыцца дзяўчына,
Вечарамі тужыць
Не пра мяне.

Да яе ў садочак
Салавей лятае,
Гожа пяе.
Разумець не хоча
Прыгажуня тая
Песні мае.

Не дагодзіш гордай
Песняю сваёю...
Лепш я пайду
Да рабіны горкай,
Мы падзелім з ёю
Гора-бяду.

Надвячоркам сінім
У згодзе ды ладзе
Мы пастаім.
Клёны ды асіны
Аб сваім заладзяць,
А мы — аб сваім.

Мізантропія

Я прашу цішыні, не шуміце,
Дайце беднаму сэрцу спачын.
Людзі-людзі, вы нават і спіце
Гэтак, быццам крычыце аб чым.

Спіць начное зямное паўшар'е,
Кантыненты пад зоркамі спяць,
Спіць, як волат,
Іван, дрэмле Мар'я, —
А нябёсы ад гвалту дрыжаць!

Я абшары жыцця і аблогі,
Заблукаўшы, усе абхадзіў.
Я пытаўся ў вас, сонных, дарогі,
Ды шкадую ўжо, што разбудзіў.

Я жадаю спакою зямнога,
(не тамтэйшага, што у труне!)
Для мяне вашай ласкі замнога,
Калі сціхнеце... дзеля мяне.

Суд чалавечы

Ад летніх росаў да зімы,
Ад вечара да рання
Пакутліва шукаем мы
Якогась апраўдання.
І спачування ў цяжкі час
Чакаем, як збавення,
Нібыта апантала нас
Нячыстае сумленне.

З гадоў юнацкіх і ажно
Да сівізны старэчай
Чакаем з дня у дзень адно
Чужой спагады нечай.
Ніхто жыццё сваё пражыць
Не хоча на адхоне,
І нават злодзей хоча быць
Зладзюгаю ў "законе".

Нас уратуе ад бяды
Знаёмае з маленства,
Пранесенае праз гады
Законапаслушэнства.
Нікога з нас у цёмны кут
Сумленне не загоніць,
Калі людскі прысяжны суд
Злачынства узаконіць.

Пяшчота

Задумліва, пакорліва і ціха
Наўсцяж плывуць сняжынкі на зары.
Прыйшла зіма. Мяцеліца-францыха
У белай сукні ходзіць па двары.

Як марыў я пушынку снегавую
Табе ў пакой прынесці, каб і ты
Заўважыла гульню яе жывую
І нараджэнне кропелькі вады.

Але хапала дотыку далоні,
Каб воблік той сняжынкі памяняць...
Я да цябе ні з чым прыйшоў на сконе
Зімовага заснежанага дня.

Але пяшчота ў сэрцы не растане.
У душах снегавая сумятня
Заб'ецца, як мяцеліца, да рання
І сціхне, як мяцеліца, да дня.

Двое

Вецер асеннім дажджом набрыняе.
Штосьці зарана прыйшла цемната.
Вечарам гэтым лісцё ападае,
Жах на начоўку на дах прылятае
І на парозе садзіцца бяда.
Вецер да хутара хмары зганяе
І з галашэннем снуе па кустах.
Ані іконы у хаце не маем.
Ані надзеі, ані ката.
Ані напалена нанач у печы,
Ані жадання сябе бараніць.
Чорная шыба пад ветрам звініць,
Полымя свечкі, як сэрца, дрыжыць.
Што ты збялела і хутаеш плечы?
Нам толькі гэтую ноч перажыць...

Дар'я ЛЁСАВА

* * *

А я — паэтэса ад сонечных даляў,
Ад самых таемных нябёс.
Прыйшла на зямлю, каб мяне пакахалі,
Каб песняй аздобіць свой лёс!

Каб кожны сустрэчны
зрабіўся шчаслівым,
Убачыўшы, што расцвіла
Я кветкай лірычнай і самаю дзіўнай
На роднай планеце Зямля!

Паэзія

Паэзія — як сонца,
Як дзень і ноч.
І я — яе ўлюбёнца —
З радкоў не зводжу воч.

Паэзіяй завецца
Пакута, што не спіць,
Яна не мае смерці,
Яна — з усіх крыніц.

Душою валадарыць
І сэрцайкам маім.
То стогне ад удараў,
То адчувае ўздым.

Бывае, скаланецца
Ад чорнае жуды...
Агонь паэта — ў сэрцы!
Не кожнаму туды!

...Не дэкларацыя!

Я — з пажару,
Я — з агню,
Я — абвугленая.
Анікому не зманю,
Кім прытуленая.
Беларусь мая — мой Бог,
Бацька мой і Маці!
Родны край мяне збярог
У сцюдзёнай хаце.
І калі скажу: "Люблю!" —
Людзі, верце,
Бо аднойчы захіну
Я Зямлю ад смерці!

* * *

Янку Сіпакову

Мо я прывідам шчасця
У пакутным жыцці?
Мне былінкай завясці
У асеннім лісці?
Не, не згодна, не згодна!
Я паўстану ў зары!
Я ж — ад сэрца народа,
Яго чую знутры!
І патрэбна ж, напэўна,
Мая песня цяпер.
О, вайны пакаленне,
У мяне хоць павер!

Баліць...

1.

Баліць душа...
Баліць калі —
Жывая значыць!..
Упала птушкай на палі —
І плача.
Ніхто не чуе.
Добра тут.
Спакой і ціша.
І вершы
траўкаю растуць
І сэрца
іх калыша.

2.

Трывогі маленства — ззаду.
Божа, не трэба яшчэ!
Хочацца белага саду,
Горыч былога пячэ.
Ўсіх абмінаю, што колісь
Ляпалі па плячы.
Гэта — ужо не боязь
Страшнае, злой начы.
Боль у вачах і на сэрцы —
Гурбы, завеі шум.
Але — не дай Бог памерці,
Перш, чым узыдзе сум
Самай шчымлівай песняй,
Той, што патрэбна ўсім,
Яблынькай беласнежнай,
Такой, каб і град не скасіў!

Мікола ЗГУБАРЭВІЧ

Я веру

Мяне трывожыць кані плач
І салаўя вясёліць спеў.
Я веру ў лёс, хоць ты заплач,
У талент існы, боль і гнеў.

Я веру ў геній дабрыні,
Жыву, сябрую на даверы.
Я веру ў зорку чысціні...
Бо як жа можна
Жыць без веры!?

Жонцы паэта

А ты застанешся адна
Ва ўтульнай, абжытай кватэры
І кубак самоты да дна
Дап'еш без надзеі і веры.

А ён без надзеі і веры
Ў няведамы кінецца свет,
Бо цяжка чамусьці паверыць,
Што трэба камусьці паэт.

Каму сёння трэба паэт,
Які ў паднябессі блукае
І д'яблаў падчас сілуэт
За воблік Анёла прымае?

Таму яго Бог і карае,
Што часта жыве ён не так.
Ён — воўк, ды з ваўчынае зграі
Ён выпаў, апошні дзівак.

Ліпеньскім ранкам

Мядовы водар яблынь, сена
З маленства сэрца захмяліў,
Таму так хочацца, напэўна,
Мне першы адкусіць наліў.

Чароўнай сілаю натоліць,
І я адчую ўсё паўней —
З зямлёю сэрца загамоніць,
А гэта мне за ўсё важней.

Хоць ставяць класіку не ў моду,
Што патураем прастаце, —
Злаўлю губамі асалоду
На росным, ягадным кусце.

У гэтай слодычы — вяршыня.
Спазнаў я гэта ўсёй душой.
Я нахілюся да вяргіні —
І — ў вір пачуццяў з галавой.

* * *

А ўсё ж пакуль я існую,
Калі калыша мары колас.
Я кросны зноўку асную —
На палатне пакіну голас.

Сатку я птушак першы крык,
Што к нам вяртаюцца здалёку.
Душу мне лечыць гэты зык,
І рвецца песня за аблокі.

Хачу

Каб я спяваў, што захацеў,
Пякельнай не пужаўся ночы,
І па вясковай мудраце
Ад нелюдзяў адводзіў вочы.

Мой кожны верш

...Нялёгка тым, чыя душа
Жывое пакідае цела.
Мой кожны верш, нібы імша
У мільгаценні звар'яцелым.

Фота Уладзіслава Басько

Зацяжная вясна



Алесь МАКОЎСКІ

Апавяданне

Была субота апошняга тыдня лютага той гнілой зімы. Гнілой, бо толькі восенню, у лістападзе, колькі дзён і начэй ціснуў мароз, а пасля пачалося. То сыпаў надакучлівы дождж, то ішоў густы, ліпкі, мокры снег. А над дамамі і галовамі людзей віселі бясконцыя, шэрыя, вільготныя, хоць выкручвай, туманы, насычаныя смуродам, на які так багаты вялікі індустрыяльны горад.

Менавіта тады бомж Кручаны (ён і сам не ведаў, ці то гэта яго сапраўднае прозвішча, ці то мянушка?) захварэў на праклятую хваробу, якой у народзе далі трапную назву, — калатун. Хаця чалавек ён у гэтай немачы быў дасведчаны, бо паесці не заўсёды выпадала, а вось на выпіўку — траціў апошняе.

Трэба было лекавацца, а як — Кручаны, поўны нуды і самоты, стрымліваючы ляскат зубоў ад холаду і нервовага ўзрушэння, — уцяміць не мог. Неяк прытупаў да універсама, дзе тапталіся, жабравалі і скідваліся на віно тутэйшыя выпівохі. Яны, яшчэ канчаткова не спітыя, мелі дзе прытуліць галаву, а таму, заўважыўшы бамжа, скіравалі на яго цікаўныя позіркі.

— Бачыў шмат бамжоў, але гэты бомж з бамжоў! — усклікнуў тонкім, здзеклівым голасам хударлявы і вяртлявы хлопец гадоў дваццаці пяці.

Сябрукі ягоныя рагатнулі, але не вельмі каб дружна. Штосьці іх стрымлівала ад адкрытай пагарды да гэтага чалавека. Наўрад ці жаласцівасць і спагада, хутчэй прадчуванне сваёй цьмянай, трывожнай будучыні.

— Кыш адсюль! — злосна загадаў той падшыванец і, каб падлашчыцца да дарослых, кпліва спытаў: — Дзе такое хвацкае паліто надыбаў? Дай панасіць...

На гэты раз нехлямяжая кампанія зарагатала заўзята, весела і было з чаго. На Кручаным вісела калісьці дыхтоўнае драпавае паліто на тоўстай ватняй падкладцы, з чорным каракулевым каўняром і абпаленым да калена левым крысом. Мінулай восенню грэўся каля цяпельца, размарыла, прылёг на левы бок і прыкімарыў. Прачнуўся ад пякельнага болю ў калене. Падхапіўся, у нос патыхнула едкім дымам — тлела вата. Скінуў паліто з плячэй, шпульнуў долу, пачаў таптаць нагамі. Дашчэнту выгарала ўсё левае крысо.

Кручаны паслухмяна павярнуўся і нетаропка, угнуўшы ў плечы галаву, падаўся прэч. Дайшоў да аўтобуснага прыпынку, прысеў на рабрыстую лаўку. Тут было трохі зацішней.

Але сядзець доўга не выпадала. Рупіла ісці немаведама куды, толькі б знайсці паратунак. "Пайду да булачнай, — падумаў ён. — Там павінны ўжо прывезці свежы хлеб. Гаспадыні прыбягуць па пакупкі. Яны больш спагадлівыя..." І ён, марудна ступаючы, пабрыў да булачнай. Спыніўся каля ўваходу. Заходзілі, абтрасаючы ад мокрага снегу і вады парасоны, жанчыны, шпарка прабеглі дзве гаваркія дзяўчынкі. Прытармазіла доўгая легкавушка, з яе вылез і ўпэўнена хадою прайшоў побач малады мужчына ў карычневым скураным паліто. Зірнуў на яго, адвёў вочы ў бок. Хвілін праз пяць выйшаў, падышоў, моўчкі сунуў у рукі цэлафанавы пакет з сухарамі. Кручаны гэтак жа моўчкі ўзяў. Хацеў падзякаваць, але не паспеў. Незнаёмец таропка, унурыўшы галаву, нібыта ў чымсьці быў вінаваты, пакрочыў да сваёй машыны.

Кручаны ўзважыў у руцэ пакунак, сухароў было з паўкіло. Не марудзячы, сунуў глыбей за пазуху і горка ўсміхнуўся. Учора ў яго сам па сабе вываліўся апошні гнілаваты і шчарбаты зуб. Ён ужо даўно прылаўчыўся жаваць ежу дзяснамі. "Урэшце, — супакоіў сябе, — сухары можна размачыць у вадзе. Няхай будуць. Не пашкодзяць..." Яшчэ крыху, прадаючы дрыжыкі, пастаяў, але на яго больш ніхто не звяртаў увагі. І ён павалокся да царквы. "Пастаю побач з бабулямі, можа, хто і зжаліцца", — падумаў ён.

Нягледзячы на непагадзь, прыгорбленыя старыя кабеты былі на сваім "дзяжурстве". Яны пільна ўзіраліся ў кожнага, хто заходзіў у храм ці выходзіў з яго. Кручаны чуў ад такіх, як сам, бамжоў, што за дзень яны маюць тысяч па сорак. А ў вялікія праваслаўныя святы, ды і прысвяткі, яшчэ больш. Аднак паміж хцівымі бабулямі і іхнім бамжыстым братам замірэння не было і ў паміне. Вось і цяпер, толькі прыкмецілі, што Кручаны мае намер прыладкавацца да іх гурта, зашыпелі, нібы гусі. Іхнія выцвілыя, але калючыя вочы загарэліся дзікай нянавісцю да гарапашніка, які наважыўся разжыцца на віно і хлеб надзённы. А іх вусны, тым часам, папікалі, дакаралі, сарамацілі. Было ўсё, на што здольныя крыклівыя, хітрыя, але не абцяжараныя розумам і спагадай кабеты. І Кручаны разгубіўся. Асабліва, калі адна з бабулек прыгразіла паклікаць міліцыянера.

Кручаны стаяў як укапаны. Бабулі сіпелі, кашлялі, кідаліся гнеўнымі і абразлівымі словамі. Менавіта ў гэты момант, азяблы, амаль наскрозь прамоклы, прыгнечаны безвыходнасцю, пад набрынялым вільгаццю небам, бомж адчуў, што дух яго зломлены, што больш змагацца з жыццём не стае сіл. Ён нерашуча падняў галаву, паглядзеў у вочы адной старой, другой, трэцяй... Акрамя варожасці, нічога там не стрэў. "За што яны так бэсцяць мяне? Мне ж многа не трэба, маглі б і падзяліцца, — падумаў ён. — А яшчэ хрысцяцца, шэпчуць малітвы, нечага просяць у Бога. Зайду і я ў царкву, пакаюся... Папрашу Усявышняга, каб не крыўдаваў, дараваў маё бязладнае жыццё... Такая, відаць, мая доля горкая..."

Ледзве перастаўляючы ногі, пад здзіўленымі позіркамі набожных бабулек, прайшоў вузкую металічную брамку, што вяла да храма. З цяжкасцю пераадолеў пяць бетонных прыступак, узяўся за медную, да бляску нацёртую ручку вялізных драўляных дзвярэй. Тузануў адзін раз, другі, трэці... Дзверы, мабыць, набрынялі і не паддаваліся, а можа, не толькі пакінуў дух, а і само цела аслабла, стала нягеглым. "Не хоча Гасподзь пускаць мяне ў храм, — падумаў ён. — Відаць, надта ўжо я грэшны. А чаму тады кажуць, што перад Богам усе роўныя: і праведнікі і грэшнікі? Можа, сам вінаваты, што насталі такія бядотныя дні? Прадаў некалі сваю аднапакаёўку добраму чалавеку за дзвесце долараў... Праўда, я гадоў дзесяць за яе не плаціў... Прапіў усё, што можна было ў ёй адкруціць, зняць і вынесці на продаж... Аднойчы пазваніў у дзверы таму добраму чалавеку, ён адчыніў, даў на бутэльку віна, але сказаў больш не прыходзіць... Не, у царкву я ўсё ж зайду. Гасподзь літасцівы, не да канца гневаецца і не навек абураецца. Даруе і мне мае грахі..."

Кручаны адчайна ўхапіўся за ручку, рашуча ірвануў дзверы на сябе і тыя, нібыта неахвотна, са скрыгатам, адчыніліся.

У царкве чуўся пах ладану, не вельмі зладжаны хор пеўчых услаўляў Збаўцу. На амбоне ў пазалачонай рызе стаяў бацюшка і махаў кадзілам. Бліжэй да амбона тоўпілася дзесяткі тры вернікаў. Кручаны зрабіў некалькі крокаў углыб царквы, але не да іканастаса, а збочыў управа, бліжэй да калоны, на якой вісеў вялікі абраз апекуна падарожнікаў, мытнікаў, усіх людцаў Міколы-ўгодніка.

Бацюшка зацягнуў "алілуя" і тут Кручаны ажно тарганўўся ўсім целам. Побач з ім на зэдліку стаяла скрыначка для ахвяраванняў, поўная купюр рознай вартасці — найбольш драбязы. Зверху, як на тое ліха, з адтуліны вонкі крышку вытыркалася тысячарублёўка — такая спакуслівая. Ён скасавурыўся на скрыначку і ўжо не адрываў ад яе вачэй. Усе яго думкі, памкненні цяпер круціліся вакол аднаго: як займець запаветную паперку? Зірнуў на бацюшку, той паправіў на грудзях вялікі крыж і зычным голасам запрасіў вернікаў памаліцца Госпаду Богу. Прыхаджане, хто таропка, хто паважна, схіліўшы галовы, пачалі жагнацца. Хор заспяваў "Святы Божа, Святы Крэпкі", а пасля адзін з псалмоў.

Мудрыя людзі звеку прасілі ў Госпада дзве рэчы: каб адвёў марнасць і няпраўду, не даваў галечы і багацця, карміў хлебам надзённым... Сухары ў Кручанага за пазухай меліся. Карцела да спазмаў у перасохлым горле, сутаргаў ва ўсім горле, выпіць. І ён, павярнуўшыся спінаю да іканастаса, бацюшкі і прыхаджан, грубымі, непаслумянымі, жоўтымі ад тытуню пальцамі дакрануўся да тысячарублёўкі. Купюра, яшчэ новая, пругкая, быццам дражнячыся, слізганула ўнутр скрыначкі. Ён прыняў руку і кончык шкадлівай паперчыны зноў вылез са шчыліны. Тое самае, таропка, як у ліхаманцы, бомж паўтарыў другі, трэці раз... Узмакрэў лоб, рукі калаціліся, сэрца бухала ў грудзях, а кроў у скронях . "Каб былі зубы, то зубамі дастаў бы", — падумаў ён. І хацеў наслініць два, указальны і вялікі, пальцы. Аднак язык быў шурпаты і сухі. У гэты момант за спінай пачуўся ціхі, дакорлівы і, разам з тым, цвёрды голас:

— Ты, няшчасны, вялікі грэх творыш: у царкве красці — святатацтва...

Кручаны ад нечаканасці крутнуў галавой і выцяўся лбом аб востры рубец калоны. З вачэй пасыпаліся іскры, а па лбе, твары пацякла кроў. Бацюшка звыкла, можа, толькі больш зычным голасам, заспяваў "Магутны Божа". Ніхто з прыхаджан нічога не заўважыў, а сведка ўсяму — Мікола-ўгоднік — будзе маўчаць.

Акрываўлены Кручаны, як з-пад кіпеню, выскачыў на вуліцу. Бабулі толькі паспелі разявіць раты ды так і стаялі, пакуль ён не знік з іхніх вачэй.

На перакрыжаванні вуліц святлафор не гарэў і ён спыніўся. Доўга не адважваўся перайсці на другі бок. Кручаны то ступаў з тратуара на асфальт, то вяртаўся назад. Урэшце побач спынілася маладая пара.

— Вам дапамагчы? — пачуўся спагадлівы звонкі дзявочы голас.

Кручаны павярнуўся тварам і тут прагучаў іншы, абураны і грубы голас хлопца:

— Ты што, Людка?! Гэта ж бомж!.. Не звязвайся...

— Вой! — ускрыкнула дзяўчына. — Ён жа паранены... А мы з табою будучыя медыкі — трэба чалавеку дапамагчы.

Хлопец трымаў над дзяўчынай вялікі чорны парасон, таптаўся, не ведаў, на што рашыцца. Дзяўчына тым часам узрушана і рашуча працягвала:

— Трэба выклікаць "хуткую". Пазвані, Андрушка... Хадзем, — звярнулася да Кручанага і ўзяла пад локаць. — Вунь там казырок над пад'ездам... Там суха...

Кручаны нахіліўся і кроў, разбаўленая дажджом, закапала на асфальт. Быў у нерашучасці, не ведаў, што рабіць. Адно напала абыякавасць да ўсяго, другое — у бальніцу не надта хацелася. Раптам, справакаваная алкаголем і нервовым узрушанем, вострым болем нагадала пра сябе запушчаная язва страўніка. Ён не стрываў, ціха застагнаў.

Неўзабаве пад'ехала машына "хуткай дапамогі". Да Кручанага даляцеў знаёмы голас міласэрнай незнаёмкі:

— Там хворы з адкрытай траўмай галавы. Прабачце, але мы спяшаемся на лекцыі...

Амаль у той жа момант ён пачуў другі, таксама малады, але зневажальны і пагардлівы голас медсястры:

— Зноў намаляваўся бомж! Цярпець не магу дзяжурыць у суботу ці нядзелю... Адна "эліта" трапляе... Вось і важдайся цяпер з такім...

У прыёмным пакоі бальніцы медыцынская сястра яшчэ раз марна паспрабавала высветліць у Кручанага імя, узрост, месца жыхарства і іншае, што ў такіх выпадках неабходна занатоўваць у картку хворага. Бомж унурыўся і ўпарта маўчаў. А вось на пытанне, дзе параніўся, адказаў надзіва ўпэўнена і цвёрда:

— У падвале напароўся на жалезны прэнт, які тырчэў са столі...

А пасля яго стрыглі. Санітарка Дуся, адмысловы спецыяліст у цырульніцкай справе, і гідлівая медсястра Кацярына, абое з гэтай нагоды ў спецыяльных халатах, у гумавых пальчатках вяршылі няпростую справу. Дуся, надта блізка да Кручанага не набліжаючыся, сціскала з усяе сілы нажніцы, валасы на галаве бамжа ажно патрэсквалі, і каменціравала з уласцівай санітаркам праматой:

— Яго трэба стрыгчы не гэтымі нажніцамі, а тымі, якімі авечак стрыгуць. Гэта ж трэба так чалавеку апусціцца...

Кацярына, радая, што ўдалося брудную работу спіхнуць на санітарку, ахвотна падтаквала і трымалася воддаль. Зайшоў дзяжурны хірург, агледзеў рану, коратка кінуў:

— Давядзецца пару швоў накласці...

— Навошта?! — здзівілася Дуся.— На іх і так усё, як на сабаках, зажывае...

У палаце на шэсць чалавек (месцілася сем) Кручанага стрэлі без асаблівых эмоцый. З забінтаванай галавою, маўклівы, ён паслухмяна сеў не на ложак, як большасць, а на зэдлік. Маўчаў ён і ўсе наступныя дні. Да астатніх хворых штодня прыходзілі бацькі, жонкі, сёстры, блізкія і знаёмыя, прыносілі прысмакі, распытвалі пра здароўе, суцяшалі і абнадзейвалі. Да бамжа ніхто не прыходзіў.

Паступова хворыя прызвычаіліся да маўклівага таварыша па палаце, дзяліліся з ім прысмакамі. Аднойчы, пры чарговым візіце ў бальніцу, маці аднаго хворага, які пакутаваў на падстраўнікавую залозу, прынесла Кручанаму трусіную шапку. З таго дня пайшло і паехала. Неўзабаве бамжу ахвяравалі пацёрты, але затое цёплы, кітайскі пухавік, які ён ашчадна схаваў у ложку пад матрацам. І самае галоўнае, разжыўся на амаль што новыя бацінкі на тоўстай пратэктарнай падэшве. У палаце час ад часу ўзнікала гамонка, як Кручанаму перагараваць зіму, дачакацца цяпла. Усе дружна сыходзіліся на адным: трэба яму ў бальніцы затрымацца як мага даўжэй. Пра тое не прамінулі сказаць і яму самому. Тым больш, што зробленыя аналізы аказаліся надта ўжо кепскімі.

— Табе і "касіць" не трэба, — даводзіў "сіні", увесь у наколках былы зэк Вадзім, хворы на тую самую падстраўнікавую залозу. — Будзе чарговы абход высокага начальства, на цябе прафесар толькі зірне і загадае паўгода трымаць пад замком. У цябе ж на фатаграфіі ўсе твае хваробы напісаны...

— Правільна! Правільна! — пагадзіліся астатнія. — Тут ёсць харч, цяпло, святло і мухі не кусаюць. Качайся на ложку, пакуль сонейка не прыгрэе і траўка не зазелянее. А там можна і на падножны корм....

Павячэраўшы, хворыя вярнуліся ў палату. Кручаны ў сталоўку хадзіў апошнім. Аднак на гэты раз у палаце яго не засталі. Не з'явіўся ён і праз гадзіну, дзве... Сталі думаць-гадаць, дзе мог падзецца. Былы зэк Вадзім падышоў да ложка бамжа, рашуча адкінуў матрац — курткі не было. Адкрыў дзверцы тумбачкі — пуста.

— Уцёк! — аўтарытэтна заявіў ён. — Як піць даць — уцёк наш бомж.

— Не можа быць! — запярэчыў хтосьці з пацыентаў. — Куды ж з цяпла ўцякаць?! На вуліцы такая халадэча... Гэта ж галавы на плячах не трэба мець...

— Нічога вы не цяміце ў гэтым жыцці! — загадкава і горка усміхнуўся былы зэк. — Ёсць такое салодкае слова: воля. Яна для чалавека саладзей за мёд, смачней за хлеб.

— Дык жа ў яго швы на галаве не знятыя! — успомніў адзін з хворых.

— Нічога, — разважліва супакоіў Вадзім. — Сярод іхняга брата ўсялякага люду хапае. Ёсць такія спецыялісты, што могуць блыху падкаваць. І былыя ўрачы там ёсць — здымуць...

А вясна, пасля той гнілой зімы, выдалася халодная і зацяжная.

Узорны тэатр-студыя "Паралель", які працуе пры Баранавіцкім гарадскім Палацы дзіцячай творчасці, адзначыў свой 10-гадовы юбілей. У калектыву шмат здабыткаў і ўзнагарод. Але галоўнае — любоў і прызнанне гледачоў, прычым і далёка за межамі роднага горада.

Паралельцы

Творчую канцэпцыю паралельцаў дакладна адлюстроўвае адзін з яго дэвізаў, які з'яўляецца цытатай з М. Гогаля: "Тэатр — гэта такая кафедра, з якой можна сказаць свету многа дабра". Паводле маіх асабістых уражанняў, "Паралель" нясе гледачу мудрую дабрыню. Неаднойчы назірала цуд, які адрозніваe сапраўднае мастацтва ад рамесніцтва або псеўдамастацтва, — прасвятленне чалавечых душ пасля спектакля. Уявіце паўкруглую залу з амфітэатрам. Сцэнічнай заслоны няма. Завяршаецца паказ спектакля. На апошніх рэпліках герояў гледачы, пераважна моладзь, інстынктыўна ўстаюць. Бо немагчыма апладзіраваць седзячы. Само відовішча і таленавітасць ігры акцёраў вымушаюць на нейкае дзеянне ў адказ. Крыкі "брава!" з усіх бакоў. Твары гледачоў здаюцца вельмі падобнымі, бо на іх агульны выраз — выраз захаплення. Ззяюць вочы дабрынёй і шчасцем. Апладысменты не сціхаюць, ніхто не спяшаецца пакінуць залу. Відаць, шкада вынесці на вуліцу, распляскаць, развеяць цудоўнае пачуццё дачынення да Жывога Мастацтва... Так бывае, бадай, пасля кожнага прэм'ернага паказу. Такая ж атмасфера і пасля дзесятага, і пасля дваццатага спектакля, ці то "Ваўкі", ці то "Чума на абодва вашыя дамы", ці то "Варшаўскі набат", ці то іншы з амаль 30 спектакляў, пастаўленых за 10 гадоў рэжысёрам Ларысай Сартаковай.

А пачыналася ўсё так. З 1997 года ў сярэдняй школе № 7 працаваў тэатральны гурток. На базе яго і быў створаны праз год тэатр-студыя "Паралель". Назва з'явілася да банальнага проста: у гуртку займаліся першапачаткова толькі навучэнцы паралельных 8-х класаў. Пазней пачалі прыходзіць дзеці розных узростаў. Прымалі ўсіх. І кожны быў заняты ў пастаноўках. Дзеля гэтага рыхтавалася два акцёрскія склады. Бо адзін з рэжысёрскіх прынцыпаў Ларысы Сартаковай — дазволіць дзіцяці быць самім сабой. Тады будзе цікава. Тады спектакль будзе сніцца кожную ноч. Тады спраўдзіцца сэнс назвы, зарыфмаваны студыйцамі ў радках пра паралель сусветаў, задум, дзівосных сноў, паралель сваёй мары — тэатр.

Рэжысёру ўдалося амаль неверагоднае. Усе самадзейныя артысты, якія напачатку асаблівых талентаў не выяўляюць, даволі хутка робяцца надзвычай адоранымі і таленавітымі. Многія з іх зрабілі б гонар і прафесійнай сцэне. Доказ таго — шматлікія ўзнагароды калектыву, склад якога амаль штогод абнаўляецца (у спектаклях жа занятыя пераважна школьнікі, якія ўрэшце разлятаюцца па розных кутках свайго новага дарослага жыцця), а высокае выканальніцкае майстэрства застаецца нязменным. Спрыяе гэтаму многае. І дух калектывізму, вызначаны першым запаветам: "Тэатр — мастацтва калектыўнае", — які захоўваецца ўсімі студыйцамі. І свой гімн, які цудоўна лечыць ад «зорнай хваробы», бо ёсць у ім цудоўны радок: "Тэатр, не мы табе, ты нам патрэбен!" І скіраванасць на цяжкую, але плённую працу: "Не магу" жыве на вуліцы "Не хачу!" Ды і апантанасць, захопленасць тэатрам рэжысёра перадаецца студыйцам.

Баранавічам з Ларысай Сартаковай, безумоўна, пашанцавала. Яна можа знайсці вельмі актуальную п'есу і надзвычай арыгінальна яе ўвасобіць. Яна ўмее так сплавіць надзённае і вечнае, што яе спектаклі набываюць гучанне прыпавесцяў. Яна ўмее надаць пастаноўцы відовішчнасць, надаючы вялікую ўвагу дэкарацыям, касцюмам, падбору музычнага афармлення, танцавальным устаўкам. Арганічнасць і пластыка ігры акцёраў — сведчанне таленту і неардынарнасці пастаноўшчыцы.

Ужо ў 2000 г. калектыў, створаны Л. Сартаковай, абараніўся на званне "ўзорны". Напачатку выпускалі па 4 невялічкія спектаклі на год. З часам п'есы браліся больш аб'ёмныя, працягласць некаторых пастановак — 2 — 2,5 гадзіны. Колькасць спектакляў зменшылася, але распрацоўвацца яны пачалі больш філігранна. У 2004 годзе "Паралель" запрасілі на фестываль "Тэатральныя скрыжаванні". Гэта форум аматараў тэатральнага мастацтва, які ладзіцца раз на тры гады і ў якім бяруць удзел лепшыя народныя тэатры краіны. Для тэатра-студыі "Паралель" зрабілі выключэнне. І гэтае выключэнне сталася шчаслівым для студыйцаў: дамоў яны вярнуліся з Гран-пры. Гэта ўзнагарода за цудоўны спектакль "Ваўкі" паводле п'есы Н. Булгакавай — аўтара з Якуціі, дзе пачынала сваю прафесійную дзейнасць Л. Сартакова. Вечная тэма нязбыўных каштоўнасцей: маральнасці, прыстойнасці, сяброўства, кахання — вось змест гэтага твора, разлічанага, у першую чаргу, на падлеткавую і маладзёжную аўдыторыю.

У наступным годзе — яшчэ адна перамога: 1-е месца на Рэспубліканскім фестывалі тэатраў сістэмы адукацыі "Жывая планета". Затым два гады запар "Паралель" станавілася пераможцай абласнога фестывалю-конкурсу "Тэатральнае Палессе". У 2008 г. тэатр-студыя быў запрошаны на II міжнародны фестываль дзіцячых і юнацкіх тэатраў, які праходзіў у Берліне. І там калектыў стаў пераможцам фестывалю з адноўленай п'есай "Ваўкі".

А ўзнагароды — магутны імпульс для новых здзяйсненняў. Таму ў "Паралелі" і яе рэжысёра шмат планаў і мар. Сярод бліжэйшых — пастаноўка спектакля "Каланісты" паводле Ю. Мачалава на аснове "Педагагічнай паэмы" А. Макаранкі. Сярод больш аддаленых — атрымаць асобны будынак і штат тэхнічных работнікаў. Галоўнае, што ёсць творчая каманда — маналітная і працаздольная. Поруч з рэжысёрам — харэографы Алена Кабак, Вольга Скамарох, аўтар касцюмаў Таццяна Рабецкая, прафесійны акцёр Іван Шыбун, студыйцы-аматары. Усе яны здолелі ажыццявіць параду Казьмы Пруткова: "Хочаш быць шчаслівым — будзь ім!"

Вольга ЖЫГАР

г. Баранавічы

Вобраз чыстае красы!

Віктар Альшэўскі нарадзіўся ў вёсцы Вуголышчына Бялыніцкага раёна. Вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве імя І. Ахрэмчыка (1965—1972), закончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (1980). Прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, Бялыніцкім раённым мастацкім музеі імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі, Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі ў Маскве, карцінных галерэях Германіі, Нарвегіі, прыватных зборах у Беларусі, Расіі, Нарвегіі, Германіі, Швейцарыі, Швецыі, ЗША, Польшчы, Мальты, Ізраіля, Італіі і інш.



Мне падаецца вельмі сімвалічным тое, што менавіта ў Год роднай зямлі вядомы беларускі мастак Віктар Альшэўскі менавіта з раённага мастацкага музея імя Вітольда Бялыніцкага-Бірулі распачынае ажыццяўленне свайго чарговага творчага праекта — паказ персанальнай выставы "Легенды нашай цывілізацыі", якая, дарэчы, і прысвячаецца Году роднай зямлі і 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта і першая персанальная выстава знакамітага жывапісца на яго Радзіме. Затым, на працягу года, яна будзе дэманстравацца ў музеях Шклова, Асіповічаў, Крычава, Бабруйска, Магілёва і завершыцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь.

Кажучы пра канцэпцыю выставы "Легенды нашай цывілізацыі", у якую ўваходзяць блізу паўсотні твораў мастака, Віктар Альшэўскі зазначае, што яна ўяўляе сабой сінтэз традыцый сусветнай культуры ў кантэксце нацыянальнай духоўнай спадчыны. Асноўнай жа задачай яе з'яўляецца "адлюстраванне глыбінных узаемасувязяў гісторыі і сучаснасці, адзінства гармоніі высокіх ідэалаў і духоўных каштоўнасцяў".

"Старонкі мінскай гісторыі", "Ружаны", "Сфінкс", "Рытмы готыкі", "Нікольская царква ў Магілёве", "Канверт з Кападокіі", "Вяршыня піраміды", "Венецыя"... Нават назвы твораў, прадстаўленых на выставе Віктара Альшэўскага, пацвярджаюць унікальнасць задумы мастака: паказаць адметнасць нацыянальнай культуры і гісторыі ў адзінстве здабыткаў сусветнай цывілізацыі. Таму на яго палотнах фрагменты Мірскага замка натуральна спалучаюцца з архітэктурнымі помнікамі Сірыі, а Ружанскі, Нясвіжскі замкі, Магілёўская і Шклоўская ратушы, гомельскія палацы Румянцавых і Паскевічаў арганічна суседнічаюць з пірамідамі Егіпта, найвыдатнымі помнікамі Візантыі, ствараючы міфалагічны падтэкст і гістарычны кантэкст непарыўнага адзінства сусветнай цывілізацыі і нібыта засноўваючы новую філасофскую рэчаіснасць.

Выстава сталася знакавай падзеяй у духоўным жыцці Магілёўшчыны і засведчыла вялікую цікавасць землякоў Віктара Альшэўскага да яго творчасці. На адкрыцці прысутнічалі і госці з Магілёва. Намеснік старшыні аблвыканкама Валерый Малашка падкрэсліў, што такія хвалюючыя мерапрыемствы нячаста адбываюцца ў глыбінцы. Што ж да Віктара Альшэўскага, то ён выйшаў з гэтай глыбінкі, узгадаваўся сокамі роднай зямлі і цяпер шчыра дорыць святло свайго таленту яе людзям.

Віктар Альшэўскі адзначыў, што гэтую выставу ён разглядае як справаздачу перад сваімі землякамі. "Пабываўшы ў многіх краінах свету, пазнаёміўшыся з іхнімі культурамі, я зразумеў, што беларуская культура з'яўляецца натуральнай і неад'емнай часткаю сусветнай духоўнай прасторы. І яна не менш значная, а ў нейкіх праявах — нават лепшая і больш цікавая. Спадзяюся, што мой творчы праект пасадзейнічае і выхаванню чалавека як духоўнай асобы, патрыёта, і фарміраванню пераемнасці традыцый пакалення, а таксама абудзіць у сэрцах сучаснікаў гатоўнасць берагчы родны край, прымнажаць сваёй працай яго прыродныя, духоўныя і культурныя багацці", — падкрэсліў мастак.

Міхась КАРПЕЧАНКА

На здымках: Віктар Альшэўскі каля раённага мастацкага музея імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі.

г. Бялынічы

Май запомніцца тым, што...



●●● беларуская грамадскасць развіталася з Фёдарам Шмакавым — старэйшым акцёрам Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, народным артыстам СССР, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі "За духоўнае адраджэнне". Вядучы майстар сцэны, ганаровы грамадзянін Віцебска, ён прайшоў сапраўды доўгі, багаты на яркія творчыя падзеі, жыццёвы шлях: 1 сакавіка Фёдар Іванавіч адзначыў свае 92 гады, а роўна праз два месяцы сэрца яго спынілася... Ураджэнец Санкт-Пецярбурга, ён атрымаў там выдатную тэатральную школу ў знакамітага Васіля Мяркур'ева і адразу пасля заканчэння Ленінградскага тэатральнага інстытута прыехаў на працу ў Дзяржаўны рускі драматычны тэатр Беларусі, што базіраваўся тады ў Магілёве. А з 1941-га стаў самаадданым коласаўцам: 67 гадоў, амаль да апошніх сваіх дзён, служыў роднай сцэне, сваім гледачам. Прыхільнікі рознабаковага таленту Артыста з'яўляліся ў розных пакаленнях. Хтосьці запомніў яго ў сакавітым вобразе Несцеркі, хтосьці апладзіраваў мудраму Дзеду ў спектаклі "Зямля" паводле Якуба Коласа, камусьці давялося пабачыць Ф. Шмакава ў чатырох версіях ролі Леніна. Ён быў арганічны ў спектаклях паводле А. Чэхава і А. Макаёнка, Ф. Шылера і М. Гогаля, У. Шэкспіра і М. Матукоўскага, К. Чорнага і М. Горкага. Не часта, ды паспяхова здымаўся ў кіно. З майстэрствам увасобіў сваю апошнюю ролю — адваката Маргарытава ў пастаноўцы "Позняга кахання" А. Астроўскага, што прымяркоўвалася да 90-годдзя Фёдара Шмакава. Пабыў ён і рэжысёрам, і мастацкім кіраўніком тэатра. Застаўся ж — легендарнай постаццю ў гісторыі беларускага сцэнічнага мастацтва.

●●● тры дабрачынныя тэатралізаваныя канцэрты за адзін дзень правёў у Вялікай зале сталічнай філармоніі Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам маэстра Міхаіла Фінберга. Заслужаны калектыў краіны прадставіў новую праграму "Ад Масквы да Брэста", складзеную з песень ваеннага часу, папулярных у першыя мірныя дзесяцігоддзі. Многія, ужо забытыя, давялося шукаць у архівах. Прадстаўленыя ў сучасных аранжыроўках, у яркай сцэнічнай форме, у выкананні маладых салістаў аркестра, яны ўразілі слухачоў розных пакаленняў. Прэм'ера падрыхтаваная да 65-годдзя вызвалення Беларусі. А сёння і заўтра Нацыянальны канцэртны аркестр ужо 14-ы раз праводзіць фестываль "Музы Нясвіжа" — папулярнае свята прыгожых і сур'ёзных мастацтваў, якое ладкуецца на грунтоўнай навуковай аснове. У яго насычанай праграме — канферэнцыя музыколагаў, мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў, асветнікаў; тэатральны паказ і вернісаж; музычная асамблея, прысвечаная беларускай школе выканальніцтва на струнных інструментах; разнастайныя канцэрты.



●●● у Мінску адзначылі 80-годдзе з дня нараджэння адметнага рэжысёра і педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Уладзіміра Маланкіна. Яго зямное жыццё перарвалася, калі майстру было толькі 48. Але зробленае ім не забываецца. Пра У. Маланкіна са шчырым захапленнем гавораць тэатралы-гледачы і колішнія калегі па Беларускім рэспубліканскім ТЮГу, па Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага, шматлікія вучні, сярод якіх, напрыклад, — рэжысёры Барыс Луцэнка, Валерый Раеўскі, Мікалай Пінігін, многія вядомыя акцёры. Памятаюць У. Маланкіна і ў Рызе — як рэжысёра Латвійскага ТЮГа... Сярод яго яркіх пастановак, што ўвайшлі ў гісторыю горкаўскага тэатра, — "Узыходжанне на Фудзіяму" паводле Ч. Айтматава і К. Мухамеджанава, "Мальер" М. Булгакава, "Апошнія" М. Горкага (сумесна з Б. Луцэнкам). І — "Адзіны спадкаемца" Ж. Ф. Рэньяра, спектакль, які ўтрымліваецца ў рэпертуары 35 гадоў. Да юбілею У. Маланкіна адбыўся яго 990 паказ. У Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі прайшла мемарыяльная вечарына з удзелам калег і вучняў У. Маланкіна.

●●● Нацыянальная бібліятэка Беларусі разам з Міністэрствам абароны краіны наладзілі ўрачыстую імпрэзу, прысвечаную Дню Перамогі. Называлася гэтае свята, на якім прысутнічалі жыхары Першамайскага раёна сталіцы, — ветэраны Вялікай Айчыннай, блакаднікі, былыя вязні фашысцкіх лагераў, — "Светлая радасць Перамогі...". Падчас імпрэзы адбылася прэзентацыя (з перадачай у дар бібліятэцы) кнігі "Основы идеологии обеспечения военной безопасности государства. Идеологическая работа в Вооружённых Силах Республики Беларусь", выдадзенай Міністэрствам абароны. Мастацкую праграму падрыхтавала творчая моладзь сталіцы, у тым ліку студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, навучэнцы харэаграфічнай школы № 2, ансамбль БДУКіМ "Грамніцы".

Лана ІВАНОВА

На здымках: народны артыст СССР Ф. Шмакаў; заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі У. Маланкін.

Працяг тэмы

Музыканты з канвеера?

Сапраўды надзённыя, набалелыя праблемы закранула дацэнт кафедры філасофіі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Наталля Сцепанцова ў артыкуле "Ад еўрапейскіх «тусовак» да любаснай правінцыі", які быў надрукаваны ў "ЛіМе" летась (гл. нумар за 19.09.08 г.). Чытацкі розгалас, выкліканы тым палемічным выступленнем, адлюстраваўся ў шэрагу наступных публікацый, сярод якіх — развагі вядомага музыказнаўцы, асветніка, лектара Беларускай дзяржаўнай філармоніі Анатоля Парэцкага ("Нельга пакідаць дзяцей ва ўладзе цемры!" за 17.10.08 г.), меркаванне нашай чытачкі з Жыткавічаў Аксаны Сулкоўскай ("Каб талент не знік" за 19.12.08 г.). Шматгадовая праца на ніве музычнай адукацыі — у адпаведных школах ці ў агульнаадукацыйных з музычным ухілам — умацавала ў намеры падзяліцца сваімі думкамі з чытачамі "ЛіМа" і аўтара гэтага артыкула.

Сёння шмат гавораць спра колішнія традыцыі, імкнуцца ўваскрэсіць некаторыя з іх. І гэта, мне падаецца, правільна: няма патрэбы "вынаходзіць веласіпед". У тым ліку — у справе музычнага выхавання.

Прыгадайма традыцыі. У часы далёкія і не надта ў шляхетных сем'ях ці ў асяроддзі інтэлігентных людзей дзяцей навучалі музыцы — спевам альбо ігры на музычных інструментах. Рабілася гэта не дзеля будучай прафесіі, а для хатняга грання і, як цяпер гаворыцца, для гарманічнага развіцця асобы.

У савецкі час (так і па сённяшні дзень) вельмі папулярнымі рабіліся самадзейныя калектывы, у якіх грамадзяне розных узростаў выяўлялі свае здольнасці. Некаторыя аматары выйшлі ў прафесійныя музыкі. А тыя, у каго была хоць нейкая музычная адукацыя, безумоўна, лічыліся мэтрамі. І немаведама чаму склалася так, што органы, якія кантралявалі дзейнасць музычных школ, узялі за ўзор якасці выкладання колькасць паступленняў іх выхаванцаў у музычныя альбо культурна-асветныя вучылішчы. Гэтая практыка не столькі стымулявала выкладчыкаў, колькі трымала ў жаху, калі сярод іх выпускнікоў абітурыентаў не было. Кантрактная сістэма працы абвастрыла праблему.

Такая практыка паўплывала і на бацькоў навучэнцаў музычных школ. Многія з іх лічаць, што добрыя адзнакі іх дзяцей — паказчык гатоўнасці да далейшага прафесійнага росту, хаця насамрэч адзнакі часцей за ўсе адлюстроўваюць поспехі вучняў адносна ўзроўню іх уласнай ігры, а не ступень падрыхтаванасці да прафесійнага выканальніцтва.

Памылковая ўстаноўка на колькасныя паказчыкі правакуе адміністрацыю музычных школ на негатыўнае стаўленне да тых выкладчыкаў, якія "не пастаўляюць" кожны год абітурыентаў у сярэднія спецыяльныя ўстановы. Бацькі таксама пачынаюць абвінавачваць выкладчыкаў, не разумеючы таго, што асноўнай і першачарговай мэтай музычнай адукацыі з'яўляецца **творчае развіццё асобы**. Праца выкладчыкаў-музыкаў — гэта перадусім **творчы працэс**, а не **вытворчасць музыкаў**, пастаўленая на канвеер. Музыкаў у нас у краіне даволі багата, нягледзячы на тое, што доўгія гады — і пры савецкай уладзе, і пасля — многія з'язджалі ў пошуках лепшага жыцця за мяжу. Эстэтычнае выхаванне, бачыцца мне (і спадзяюся, не толькі мне), дае дзіцяці тое духоўнае багацце, якое дасць яму магчымасць усебакова развівацца ў будучыні, і гэтага запасу яму хопіць на многія гады.

Фота Віктара Кавалёва

І яшчэ. Адміністрацыя школ (а за ёй і бацькі) раўніва сочыць за адзнакамі; выводзяць за кожную чвэрць сярэдні бал і наладжваюць паміж аддзяленнямі нешта кшталту сацспаборніцтва — быццам у гэтым ёсць нейкі сэнс. Такім чынам, сур'ёзныя людзі, прафесіяналы вышэйшай кваліфікацыі, ствараюць праблему на пустым месцы, хапаючыся за сэрца і страчваючы здароўе, — толькі таму, што нехта з чыноўнікаў вырашыў, быццам на падставе нікому не патрэбных колькасных дадзеных мажліва вызначыць ступень прафесіяналізму. Насамрэч гэтая сістэма накіраваная выключна на стварэнне яшчэ адной "пацёмкінскай вёскі", але не мае ніякіх адносін да ўласна музычнай адукацыі.

Але ёсць надзея, што калі сутнасць музычных выхавання і адукацыі будзе зразуметая ў міністэрствах культуры і адукацыі, тады бессэнсоўная папяратворчасць і неабгрунтаваныя прэтэнзіі да выкладчыкаў-музыкантаў сыдуць у нябыт.

У сённяшняй сітуацыі, мне здаецца, відавочная і бясспрэчная перавага школ з музычным ухілам перад музычнымі школамі. Музычныя школы спрадвек арыентыраваныя на падрыхтоўку прафесійных музыкаў, у той час як школы з музычным ухілам займаюцца ўсебаковым гарманічным развіццём дзіцяці, пачынаюць гэтую справу з 6-гадовага ўзросту выхаванцаў і вядуць яе да выпускнога класа. Незалежна ад таго, як складзецца далейшае жыццё вучня, музычнае выхаванне будзе не марным, бо акрамя навыкаў выканальніцтва, дасць яму любоў і густ да музыкі, разуменне яе, пашырыць кругагляд і, безумоўна, узбагаціць яго асобу.

Яшчэ адной перавагай, якая істотна адрознівае школу з музычным ухілам ад музычнай школы, з'яўляецца, на мой погляд, тое, што вучні могуць перайсці на іншы інструмент у выпадку неабходнасці — напрыклад, з акардэона на флейту ці з флейты на тубу і г. д. У музычнай школе такі паварот падзей практычна немагчымы. Я ведаю прыклады, калі перамена інструмента цягнула за сабой і змену месца навучання — бацькі забіралі дакументы з адной школы і неслі ў іншую. Пакутавалі ў гэтай сітуацыі ўсе: і дзеці, і выкладчыкі.

У школе з музычным ухілам дзеці могуць сумяшчаць навучанне на двухтрох інструментах і займацца ў некалькіх калектывах, што зусім немагчыма ва ўмовах музычнай школы — можа, таму, што заняткі ў музычнай школе ладзяцца на платнай аснове ці таму, што ў сістэме навучальных устаноў, падпарадкаваных Міністэрству культуры, не распрацаваная адпаведная дакументацыя.

Прыгадалася, як на педагагічнай канферэнцыі адна кіруючая дама з імпэтам усклікнула: "Хопіць з нас музыкі і танцаў!". Мне шкада яе: відавочна, ёй не давялося зведаць радасць ад судакранання з цудоўным — тую чароўную радасць творчасці, з якой мала што можа параўнацца. Чыноўныя людзі, ад якіх залежыць эстэтычнае выхаванне, у бальшыні сваёй лічаць яго дарагой празмернасцю, непатрэбнай для адукацыі. Перспектывы такога падыходу адназначныя: адсутнасць духоўнасці спараджае манкуртаў — людзей, якія не памятаюць роднасці, страцілі карані і не маюць будучыні. Я перакананы і ў тым, што такія бяздумныя дзеянні вядуць да разбурэння асобы і страчвання сапраўднага патрыятызму.

Канечне, эстэтычная, і ў тым ліку музычная, адукацыя вымагае немалых сродкаў. І зразумела, што гэта цяжка, асабліва ў крызісны перыяд. Але варта нагадаць, што ў часы непараўнальна больш цяжкія — пасля грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў дзяржава разумела важнасць культуры і мастацтва ў жыцці людзей і знаходзіла для іх развіцця грошы. Людзі рабілі ўсё, каб застацца людзьмі, — і духоўнае багацце мела для іх значэнне не меншае, а часцей і большае, за матэрыяльны дабрабыт. І музыка дапамагала ім у гэтым.

Можа, памятаючы пра неабходнасць духоўнага развіцця нацыі, трэба задумацца, за кошт чаго ўзяць на гэта сродкі, але ні ў якім разе не абдзяляць і не збядняць культуру, бо прагноз наступстваў такой "эканоміі" палохае ўсіх, хто разумее, што не хлебам адным...

Важна, каб азначаныя набалелыя праблемы, нарэшце, пачалі вырашацца і да гэтых рашэнняў падышлі сур'ёзныя, мыслівыя і адказныя людзі — а такія ў нашай айчыне ёсць.

Рыгор КАРПІЛАЎ

Паланезы вяртання

У чарадзе навукова-даследчых, арганізатарскіх, асветніцкіх клопатаў, якімі поўняцца будні супрацоўнікаў Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, з'явіліся справы, звязаныя з выбітнай падзеяй. Падзеяй не проста значнай, а знакавай для інтэлектуальнага і мастацкага жыцця беларускага грамадства, для больш глыбокага развіцця нашых патрыятычных пачуццяў і міжнародных кантактаў, асэнсавання надзённых і перспектыўных ідэй.

18 мая, у Міжнародны дзень музеяў, адзначаць сваё прафесійнае свята і рупліўцы на ніве гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі.

Летась тут прайшла прэзентацыя неацэннага музейнага набытку — архіва Міхала Клеафаса Агінскага, пра што "ЛіМ" даволі падрабязна распавядаў у нумары за 29 лютага 2008 г. Нагадаю перадгісторыю падзеі. Больш як паўтара стагоддзі таму, калі М. Кл. Агінскі пакінуў зямны свет, яго сын Ірэніюш перадаў з радзіннага Залесся ў Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў пяць куфраў з дакументамі свайго знакамітага бацькі. І толькі цяпер, дзякуючы ініцыятыве Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА (дакладней — энтузіязму яе старшыні Уладзіміра Шчаснага) і пры фінансавай падтрымцы бюро ЮНЕСКА ў Маскве, адбылося вяртанне ў беларускі асяродак спадчыны нашага вялікага земляка — аднаго з адметных дзеячаў еўрапейскай гісторыі і культуры, таленавітага музыканта, кампазітара, сенатара, дыпламата. Перамовы з расійскім бокам і ўсю падрыхтоўчую працу па перадачы архіва М. Кл. Агінскага ў Мінск (арыгіналы засталіся ў Расіі, наша краіна атрымала копіі ў выглядзе мікрафільмаў і кампакт-дыскаў) ажыццяўляў Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі на чале з дырэктарам Зінаідай Кучар.

Такім чынам, нерухомы і практычна не запатрабаваны ў Расіі музейны скарб, культурная каштоўнасць як мінімум для трох еўрапейскіх нацый — беларусаў, палякаў, літоўцаў, — пачынае новае жыццё. Дзякуючы даследчыкам гэтых дакументаў уяўленне пра шматгранную асобу Міхала Клеафаса Агінскага, пра яго асяроддзе дый пра супярэчнасці драматычнай эпохі, безумоўна, узбагаціцца.

З чаго ж складаецца незвычайны скарб? Як гавораць супрацоўнікі Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, гэта "каля 6 тысяч адзінак захоўвання ў электроннай версіі". Толькі ў эпісталярнай спадчыне налічваецца 5 912 лістоў. Яны сведчаць пра стасункі Міхала Клеафаса з сенатарам Мураўёвым-Апосталам, з князем А. Гарчаковым, з Леанардам Ходзькам. Цікавы і "след" шыфраванага ліставання бацькі Міхала Клеафаса — Андрэя Агінскага з каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім. Апроч пісьмаў, захаваліся разнастайныя занатоўкі, дзелавыя паперы; больш як тры сотні візітовак, што пакідалі гаспадару Залесся розныя асобы. У пераліку дакументаў — генеалагічная табліца, вынятка з дваранскіх кніг Віленскай губерні пра род Агінскіх. Інтрыгуюць сабраныя на 480 лістах вершы Агінскага, напісаныя па-французску, па-польску, па-англійску. А ёсць жа і 34 яго малюнкі, і 45 лістоў, названых "Літаратурныя працы М. Агінскага"!

Ёсць і нотны збор уладальніка залескай сядзібы муз. Дарэчы, аўтар унікальнай манаграфіі "Жыццё і творчасць М. К. Агінскага ў каардынатах яго часу і культурнага асяроддзя" малады музыколаг Святлена Немагай, спрычыніўшыся да гэтай часткі архіва, змагла не толькі скласці ўяўленне пра музычныя прыхільнасці героя свайго навуковага даследавання, але і падчас прэзентацыі архіва прадставіць у жывым выкананні тры не вядомыя раней творы Міхала Клеафаса.

Яго музыка прагучала кранальнай уверцюрай да сёлетняй выстаўкі "Паланезы на вяртанне": на вернісажы гралі вучні і выкладчыкі мінскай ДМШ №5. Сама экспазіцыя, зладкаваная супрацоўнікамі Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі з матэрыялаў, што датычаць розных аспектаў жыцця М. Кл. Агінскага, прапаганды яго творчасці, паказала пэўныя вынікі гадавой працы над архівам, апрацоўка якога працягнецца мінімум тры гады. Поліфанію імпрэзы ўзбагаціла прэзентацыя згаданай кнігі С. Немагай. А нечаканай іскрынкай сталася сустрэча з персанажамі п'есы У. Драздова "Фантазія ля мінор", пастаўленай некалькі гадоў таму ў Мінскім абласным драматычным тэатры яго мастацкім кіраўніком А. Міхальцовай. Ва ўлонні экспазіцыі, гэткім кутку XIX стагоддзя, ажылі сцэны і палемічныя дыялогі з ужо новай версіі твора: цяпер спектакль маладзечанцаў ідзе пад назвай "Паланез на развітанне. (Драматычныя варыяцыі на тэмы М. К. Агінскага)" у рэжысуры В. Баркоўскага...

Спецыялісты музея "працуюць на Залессе": хаця тамтэйшая сядзіба, іх колішні філіял, перададзены ў муніцыпальную ўласнасць Смаргоні, прафесійныя, навуковыя стасункі сталічных і мясцовых знаўцаў ды ахоўнікаў спадчыны М. Кл. Агінскага развіваюцца. Таму сёння ў гістарычным кутку Мінска, у доме № 5 па Музычным завулку, руплівыя музейцы дбаюць і пра стварэнне нотных муляжоў для залескай экспазіцыі, і пра падрыхтоўку пакуль яшчэ не хуткага выдання эпісталярнай ды мемуарнай часткі архіва нашага выдатнага земляка.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Фота Віктара Кавалёва

Не сустрэцца з Раісай Баравіковай я не магла сабе дазволіць хаця б таму, што яе творчасць стала аб'ектам майго дысертацыйнага даследавання. Ідучы на знаёмства са слыннай аўтаркай, адчувала хваляванне, якое невядома куды знікла пасля некалькіх хвілін нашай гутаркі. Раіса Андрэеўна – просты, шчыры чалавек у размове, абаяльная жанчына, а самае галоўнае – яна па-ранейшаму рамантычная ў жыцці, чым вельмі падобная да дзяўчынкі са свайго верша, якая лётае ў аблоках і шукае шчасця.

Кароткі летапіс рамантычнай дзяўчынкі...

А пачыналася...

Першы верш напісаўся ў шостым класе, і, як ні дзіўна, на тэму дня. Выйшла так, што ў моры загубілася баржа з маракамі, якую знайшлі толькі праз два альбо тры тыдні. Быў сакавіцкі халодны дзень. Для ўсіх людзей маракі былі сапраўднымі героямі. Мне таксама захацелася зрабіць нешта незвычайнае, гераічнае. Такім чынам напісаўся вершаваны твор у 2—3 страфы. На наступны дзень паказала верш сваёй настаўніцы беларускай мовы і літаратуры, а яна аднесла яго ў рэдакцыю раённай газеты. Верш быў надрукаваны, пасля чаго аднакласнікі віншавалі, гаварылі безліч прыемных слоў. У трыумфе дзіцячай славы прыйшла думка, што літаратура, творчасць — гэта мой шлях. З дзевятага класа займалася ў літаратурным аб'яднанні пры рэдакцыі раённай газеты, якім кіраваў Яўген Васільевіч Сяленя, дзе пазнаёмілася з Анатолем Казловічам і Алесем Разанавым. Алесь быў вельмі адметны ў творчасці. На яго хацелася раўняцца...

Марылася...

Напачатку марыла паступаць на факультэт замежных моў. Праўда, у пятым класе англійская мова мне не давалася. Паўставала нават пытанне: паставіць за паўгоддзе адзнаку два альбо тры. Класны кіраўнік пашкадавала мяне і паставіла тры. На канікулах я, каб не бянтэжыцца на ўроках пасля, наперад разабрала некалькі тэкстаў. На першым уроку акурат і давялося адказваць. Настаўніца была прыемна здзіўлена маімі ведамі. Сказала добрыя словы на мой адрас, што надало імпэту. Пасля гэтага выпадку англійская мова была самым любімым школьным прадметам. Аднак не паступіла на філфак, куды спачатку паступала, менавіта з-за замежнай мовы — атрымала толькі 4 балы. У гэтым, мабыць, быў, нейкі знак лёсу, які ад пачатку абраў для мяне літаратуру.

Пра паэзію...

Мне думаецца, што паэзія — стан душы, калі чалавек працуе ў парыве натхнення, у якім ёсць нешта боскае. Натхненне, ва ўсялякім выпадку мне так думаецца, гэта від касмічнай энергіі. Космас, лічу, яшчэ не даследаваная як след прастора, якая, я ўпэўнена, выпраменьвае шмат самых розных энергій. Некаторыя людзі здольныя адчуваць іх на сабе. Чалавек, які прыхінуўся да Слова, нярэдка выглядае чалавекам не ад гэтага свету. У хвіліны натхнення здаецца, што ты адарваны ад Зямлі. Надараюцца выпадкі, калі чакаеш з'яўлення таго самага натхнення, а яно не з'яўляецца, тады літаральна "лезеш на сцяну". Можна абудзіць натхненне, напрыклад, слуханнем пэўнай музыкі. Для мяне, натхненне — загадка, паколькі складваецца ўражанне, што нехта дыктуе радкі. Паэзія ж, паўтаруся, стан душы. Творчай працы дапамагае многае. Ёсць такое паняцце, як псіхалогія творчасці... Аднойчы, калі доўгі час не пісалася, не магла зразумець чаму. А справа была ў

тым, што пры пераездзе на новую кватэру, я памяняла гардзіны. Белы колер не спрыяў творчасці.

Вопыт...

Мінаюць гады і, з узростам з'яўляецца творчы вопыт, тое самае майстэрства: паэт ведае пэўны набор рыфмаў, метафар. Можна сесці і пад адпаведны настрой напісаць колькі заўгодна вершаў. Але напісанае такім чынам, я лічу мёртвай матэрыяй. Няма таго энергетычнага слоя, на які б накладваліся радкі, што дае толькі натхненне.

Упэўнена, жыць у часе застаюцца вершы, акрыленыя натхненнем. У гэтым і загадка сапраўднай паэзіі...

Пра ўплывы...

Так, добрыя творы іншых аўтараў, напэўна па-свойму, уплываюць. Але лепш у дадзеным выпадку гаварыць пра захапленне творчасцю таго ці іншага паэта. Што да мяне, дык люблю Багдановіча, Някляева, Дранько-Майсюка, рускіх Блока, Ахматаву, замежных Шэкспіра, Петрарку...

Пра інтымную лірыку...

Так, пагаджаюся, пішу пераважна інтымную лірыку. У творах пра каханне можа прысутнічаць глыбокая філасофія, паколькі каханне само па сабе — шматграннае пачуццё. Паэт павінен быць трошачкі закаханым... Але закаханасць абавязкова павінна быць недасягальнаю... Калі, што называецца, усё "о'кей", вершы, на жаль, не пішуцца.

Пра сучасную літаратуру, пра сябе і свет...

Сёння ўсе мы жывём у вельмі складаным свеце: глабальнае пацяпленне, эканамічна-фінансавы крызіс... на фоне бясконцых забаўляльных шоў на тэлевізійных каналах. Чалавеку найчасцей робіцца няўтульна. Колькі выпадкаў, калі людзі пачынаюць збягаць ад цывілізацыі, бліжэй да прыроды. Думаецца, што ў сучасным свеце няўтульна пачувае сябе і літаратура... Мастацкае слова — матэрыя тонкая, яму цяжка суседнічаць са словам "выжыванне"...

Запісала Наталля ГЕТМАН-КРЫВЕЦКАЯ

Нататкі краязнаўца

«Адзіны чалавек...»

11 мая 1848 года, на золку, з Орскай крэпасці ў казахскі стэп, у бок Аральскага мора, выступіў вялікі транспартны атрад. Наперадзе конна ехалі казахі-праваднікі, якія цудоўна ведалі стэпавыя караванныя дарогі. Крыху наводдаль, асобна ад роты, ішоў невялікі чалавек у шэрым штацкім паліто. Гэта быў радавы чацвёртага батальёна Тарас Шаўчэнка — апальны паэт і мастак.

Ззаду засталася цяжкая служба, прыцясненні маёра Мяшкова, які чамусьці адразу неўзлюбіў ссыльнага Тараса. Але сябры палегчылі цяжкую долю Шаўчэнкі. Яны расказалі пра яго маладому капітан-лейтэнанту Аляксею Бутакову, прызначанаму кіраўніком так званай Аральскай экспедыцыі, і ён праз арэнбургскага ваеннага губернатара Уладзіміра Обручава дамогся дазволу ўзяць "радавога Шаўчэнку ў экспедыцыю ў якасці мастака".

Раніцай 15 мая атрад падышоў да ракі Карабутак. У гэты дзень на высокім беразе гэтай ракі быў закладзены новы форт — Карабутакскі. Шаўчэнка пра гэтую падзею піша так: "Тут у нас была днёўка. І паколькі з намі ішоў святар, то на наступны дзень быў адпеты малебен і асвечана месца для форта. Мяне, у ліку іншых, запрасіў будаўнік форта раздзяліць яго паходны абед у кібітцы, і вось тут я і пазнаёміўся з ім, адзіным чалавекам ва ўсім бязлюдным Арэнбургскім краі. Пасля доўгай, самай шчырай размовы мы з ім развіталіся ўжо ноччу. На дарогу падараваў ён мне бутэльку астрагону і пару лімонаў, найкаштоўнейшы дарунак у такой пустэльні, як Кара-Кумы, дзе я і ацаніў гэтую каштоўнасць як належыць". Гэтым адзіным чалавекам аказаўся штабс-капітан генеральнага штаба Карл Іванавіч Герн. З цэнзурных меркаванняў Тарас Шаўчэнка не мог назваць яго імя, каб не наклікаць непрыемнасцяў на новага сябра.

Варта сказаць, што імя Карла Герна даўно вядома шаўчэнказнаўцам, такім, напрыклад, як М. Бельчыкаў і Л. Хінкулаў. Складаючы ў пачатку 1960-х зборнік "Т. Г. Шевченко в воспоминаниях современников", яны ўключылі ў яго і ўспаміны Карла Герна, надрукаваныя ўпершыню ў 1898 г. у часопісе "Русский архив". Аднак у заўвагах яны дапусцілі істотную памылку, пазначыўшы, што Карл Іванавіч "родам з Латвіі". Гэтая акалічнасць не дазволіла іншым даследчыкам літаратуры і краязнаўцам працягнуць пошукі матэрыялаў пра К. Герна, таму цягам некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў яго імя зусім не ўзгадваецца ў найноўшых даследаваннях, прысвечаных Т. Шаўчэнку. І дарма!

Карл Герн паходзіў з дваран Віцебскай губерні, лютэранскага веравызнання, дата нараджэння вызначаецца прыблізна — каля 1816 г. Адукацыю ён атрымаў у Галоўнай інжынернай вучэльні. У студзені 1835 г. К. Герн быў камандзіраваны ў Арэнбургскую інжынерную камандзіроўку. У чыне паручніка ў лістападзе 1840 г. ён паступіў у Ваенную акадэмію, пасля заканчэння якой, у 1842 г., быў залічаны ў генеральны штаб і вярнуўся служыць у Арэнбург. Увесну 1848 г. К. Герну было даручана ўзвядзенне форта на рацэ Карабутак. Менавіта ў гэты перыяд ён і сустрэўся з апальным Тарасам Шаўчэнкам. Сустрэча ў казахскім стэпе і паклала пачатак таму сяброўству, якое яны пранеслі праз усё жыццё.

"Пабыўшы ў гэтай экспедыцыі, — прыгадваў К. Герн, — Тарас прывёз з сабою мноства эскізаў, зробленых ім падчас шляху стэпам і падчас плавання па моры... Ён вярнуўся ўжо не ў Орскую (крэпасць. — **В.А.**), а наўпрост у Арэнбург, жыў спачатку разам з Бутаковым, а па ад'ездзе Бутакова ў Пецярбург перайшоў жыць да мяне".

Варта адзначыць, што Карл Іванавіч быў чалавекам вялікай культуры і прагрэсіўных поглядаў. У яго доме часта збіраліся цікавыя людзі. Заўсёднымі гасцямі былі Серакоўскі, Залескі, Турно і іншыя. Як піша Фёдар Лазарэўскі, там жа даволі часта бываў і Шаўчэнка, "окуриваемый фимиамом лести и ухаживаний". Нягледзячы на строгую забарону, тут пастаянна гучалі вершы Шаўчэнкі: і тыя, якія прывялі яго ў далёкую Арэнбургскую губерню, і новыя, якія ён паспеў напісаць у выгнанні.

Святое дрэва. Малюнак Т. Шаўчэнкі 1848 г.

Форт Кара-Бутак. Малюнак Т. Шаўчэнкі 1848-1850 г.

"Жывучы ў мяне, — працягвае свае ўспаміны К. Герн, — ён (Шаўчэнка — **В.А.**) шмат маляваў, асабліва партрэтаў, і зрабіў некалькі цудоўных пейзажаў акварэллю з прывезеных з Аральскага мора эскізаў; пачаў алейнымі фарбамі партрэт мой і маёй жонкі..."

Аднак гэта, на жаль, працягвалася нядоўга. Справа ў тым, што ў Арэнбург прыбыў на службу толькі што выпушчаны з нейкага кадэцкага корпуса прапаршчык Ісаеў. Неўзабаве па горадзе папаўзлі чуткі, што гэты юны Аданіс пачаў заляцацца да жонкі Карла Іванавіча. Шануючы гонар сябра, Шаўчэнка раскрыў яму вочы на нізасць і подласць Ісаева. Для таго, каб адпомсціць, Ісаеў напісаў данос, у якім паведамлялася, што радавы Шаўчэнка парушае "найвышэйшую волю", ходзіць у цывільным адзенні, малюе і піша вершы. Ваенны губернатар У. Обручаў, баючыся "манаршага гневу", даў гэтаму даносу ход.

Шмат улік магло быць знойдзена падчас вобыску, калі б Карл Іванавіч не даведаўся пра яго крыху раней. У агонь былі кінуты дзесяткі лістоў, малюнкаў і чарнавікоў вершаў. Тады ж быў спалены і няскончаны партрэт самога Герна. Тых вынікаў, на якія разлічвалі даносчык і яго заступнікі, вобыск не даў. Тым не менш, Шаўчэнка аказаўся на гаўптвахце, а затым, 12 мая 1850 г., яго зноў выслалі ў Орскую крэпасць. Адбыўшы ў орскім каземаце каля двух месяцаў, апальны кабзар па прамым указанні цара быў накіраваны ў Новапятроўскае ўмацаванне.

"Адтуль, — напіша К. Герн праз шмат гадоў, — я атрымаў ад яго цудоўны малюнак пясчанага бурана ў Мангышлацкай пустыні, які захоўваю як адзіную дарагую для мяне памяць; усе эскізы, што захоўваліся ў мяне, паперы і кнігу з маларасійскімі яго вершамі я яму вярнуў".

Сам Тарас Шаўчэнка вельмі даражыў сяброўствам з К. Гернам. Да нас дайшоў ліст, дасланы паэтам з берагоў Каспія Браніславу Залескаму: "Добры мой дружа! Атрымаў я з тваім апошнім лістом сэрцу мілыя партрэты. (Гаворка ідзе пра малюнак "Шаўчэнка сярод польскіх ссыльных", выкананы мастаком Аляксеем Чарнышовым — **В.А.**). Бясконца ўдзячны табе; я цяпер нібы паміж вамі і слухаю ціхія задумлівыя вашыя прамовы. Калі б мне яшчэ партрэт Карла, тады б я меў усё, што для мяне дорага ў Арэнбургу". Карла Іванавіча на тым малюнку не было.

Як жа склаўся далейшы лёс Карла Герна? За ўзвядзенне форта Карабутакскі ён атрымаў ордэн св. Анны 2-й ступені... Па выхадзе ў адстаўку з узвядзеннем у генерал-маёры Карл Герн быў прызначаны міравым пасрэднікам 4-га ўчастка Арэнбургскага ўезда. На жаль, нам невядома, калі ён памёр і дзе пахаваны. Цьмяныя намёкі на тое, што ён мог вярнуцца на радзіму ў Віцебскую губерню, ёсць у яго ўспамінах: "... калі-небудзь жа Бог дасць мне вярнуцца дадому і вырвацца з гэтай мёртвай пустыннай Арды, у якую, верагодна, за нейкія цяжкія грахі мае, лёс мяне засадзіў". Магчыма, далейшыя росшукі дадуць адказ на гэтае пытанне.

Вячаслаў АФАНАСЬЕЎ

Мост над зачараванай ракой

На помніку вялікаму філосафу і паэту Рыгору Скаварадзе напісаны крылатыя словы: "Свет лавіў мяне, але не спаймаў".

Паэты і філосафы ўсіх часоў і народаў марылі аб белай вежы са слановых біўняў, дзе яны змаглі б схавацца ад гэтага вялікага спакушальніка, што перашкаджае ім выканаць боскае прадвызначэнне і наканаванасць. Менавіта схавацца, бо змагацца з ім немажліва. Але часцей за ўсё яны ў вечных пошуках ідэалу, сіняй птушкі, духоўнага Эльдарада ператварыліся ў вечных вандроўнікаў, пілігрымаў, агасфераў.

Такім і быў Р. Скаварада, які, кінуўшы такую прэстыжную і грашовую, як сказалі б цяпер, працу ў Харкаўскім калегіуме, на тры дзесяцігоддзі сыходзіць у народ і да самай смерці вандруе па Слабадской Украіне, прапагандуючы свае ідэалы не толькі ўласнымі творамі, многія з якіх фальклярызаваліся, але і жывым словам, і самім ладам уласнага быцця.

З самага маленства Арцюр Рэмбо не мог нідзе знайсці сабе прыстанку — ні ў сям'і, ні ў родным краі, з гадамі толькі пашыралася прастора ягоных вандраванняў — Францыя змянілася Амерыкай і Малайзіяй. І толькі гангрэна і, як вынік, ампутацыя нагі, спыняе фізічную і віртуальную вандроўку вялікага бадзяжніка і па сумяшчальніцтве рэфарматара паэзіі.

Эдгар По адначасова шукаў сябе паўсюдна і ўцякаў ад сябе, таму і памёр непазнаным на лаўцы невядомага парку невядомага яму горада.

Куды і ад каго ўцякалі паэты, каго шукалі?.. У шэрагу згаданых вышэй творцаў (а спіс можна працягваць бясконца) выразна бачыцца і постаць беларускага паэта Міколы Купрэева, які ўвасобіў у сябе і абязножанасць француза, схільнасць да acva-vitae амерыканца, філасофскае бадзяжніцтва ўкраінца. Тым болей, што ён па-майстэрску спалучыў, як і яго вялікія папярэднікі, рэальнае жыццё і літаратурны пачатак, а таму цяжка адрозніць, дзе першае, а дзе другое.

Невыпадкова ў фінале сваёй другой кнігі ўсклікаў: *"Сястра! Няўжо ты на ганку роднай хаты, Караткевіч пад бярозамі ля Дняпра, і для вас, і ўсе мы тут, мёртвыя і жывыя, — **літаратура**?.."*

Сам паэт ужо за смугой часу, таму спалучэнне міфу і рэальнасці правамернае. Нарадзіўшыся на Рагачоўшчыне ў 1937 годзе, зведаўшы жахі вайны, у дзесяцігадовым узросце вымушаны пакінуць маленькую радзіму, да якой назаўсёды захавае самыя цёплыя пачуцці, і пераехаць на Палессе, дзе здабудзе вышэйшую адукацыю, сталую працу (завуч, настаўнік), але потым ўсё пакіне-забудзе і пачне бадзяжнічаць-вандраваць па Брэстчыне, наводзячы жах на мясцовае начальства і выклікаючы жаль і спагаду ў нешматлікіх сяброў, перш за ўсё мастакоў і пісьменнікаў (хаця зразумеў яго па сутнасці толькі паэт і крытык Л. Галубовіч.

Мікола Купрэеў задаваў сабе анталагічнае пытанне: *"Як мне жывецца ў маім Хаосе?"* Горка-салодкая чара, якую паднёс паэту Хаос, пераварочвае звыклае светаўспрыманне, менавіта таму ў ягоным свеце разам жывуць смех і слёзы, каханне і здрада, ціша і тлум, а ў адну і тую ж хату заходзяць акупанты і госці. Сімвал роднага краю, апетая белая птушка дарэмна ладкуе гняздо на Каложы, ратуючы сябе Святым Духам, бо ўжо крывінкай сцякае пад Сожам, тужліва клякоча пад Бугам.

Матыў расстання — асноўны, вядучы, дамінуючы, і асабліва ён уражвае, калі гучыць адтуль, куды ўзносяцца малітвы аб літасці і даступніцтве:

Жураўлі журлівыя мае —
Праплывае новае растанне.
Зноў над Шчарай
шчыры крык растане, —
ў гэтым свеце вечна не стае...

Птушкі — найважнейшая частка сусвету М. Купрэева, бо ўжо не столькі славяць Бога і створаны ім сусвет, яны, нібы дазорцы ў Кіплінга, першымі ўздымаюць трывогу. Яны роўнавялікія ў сваёй значнасці і векавым прызначэнні — птахава крыло і рука паэта. Невыпадкова М. Купрэеў марыць стаць пасля сыходу з зямлі калі не птушкай, то хаця б яе крылом.

Найбольш яскрава і тужліва ўвасоблены роспач расстання з былым у паэме *"З сястрой і Уладзімірам Караткевічам на Рагачоўшчыне"*, дзе згубленыя векавыя бярозы, алешнікаў вал у былым балотцы, "Галашэнне русалкі" з маленькай слязы-ўспаміну перарастае ў лямант, трэнас. Так рабілі жанчыны-плакальшчыцы, што пасля вайны хадзілі па вёсках: *"Пачыналі галасіць ціха-ціха, потым — рыдалі на ўвесь свет і канчалі зноў ціха..."*

Той свет, калі можна было жыццё апантана ўдыхаць, таропка, аж захлынаючыся, дзівіцца лотаці на лугавіне, збіраць у жменю травы па расіне і ёй умывацца, знікнуў назаўсёды, застаецца толькі стаць на калені на доле зямным і ўзнесці, як Богу, малітву радзіме:

Не трэба мне больш нічога —
дзякуй за поле.
І ў далях далёкіх,
куды адвядуць мяне ціха,
мне цяжка не будзе —
будзе вечна і лёгка.
Тваё зерне ў зямлі свіціцца...

Вось чаму ён не будзе станавіцца ў позу аратара ці нават пракурора і шукаць вінаватых у трагедыі. Вінаваты ўсе, у тым ліку і літаратура. Так лёгка ўсё мяняецца ў свеце: *"...сёння — стол пад веснавое свята, заўтра — памінальны стол"*. І ўчора ён быў як Бог, як *Пан* (старагрэцкі!), лес быў ягонымі пенатамі, бярозы прывялі сваіх *беразанятак* (як прыгожа!) паслухаць казку і каб ім расчасалі косы-вецце. Сёння гучыць "Новая беларуская песня", у якой маці тлумачыць па-новаму класічныя дзявочыя сны: не будзе ў яе дачушкі вяночка, гняздзечка, жаніха, бо ўзышоў Чарнобыль, а таму плача Беларусь, з якой дзікімі гусямі лятуць нашыя душы.

Не заіржуць коні, што некалі ляцелі на Грунвальд і Воршу, бо цяперашніх іх нашчадкаў павязуць у Гродна тыграм; алешына з-пад Начы згарэла ў печы і ператварылася ў хмарку... Хаос, як і ля вытокаў Быцця, заняў месца Бога, а плач русалкі падхопліваюць звяры, птушкі і людзі.

Нежаданне жыць сярод людзей, *так, як усе*, у паэтаў тлумачыцца па-рознаму. Байран шукаў *"прибежище среди безмолвного мира звезд и волн, потому что боялся людей"* (А. Маруа), герой навелы Э. По, шукаючы адзіноты сярод натоўпу, пачынае нагадваць д'ябла.

Нешта іншае бачыцца М. Купрэеву ў пасланні "Юліяну Тувіму":

Як помста
будзеш ты блукаць па свеце
ад народа да народа...
Не замяце ніколі вецер
твае сляды ад Палесціны
да Варшавы,
ад магілы да Наўрота.

Ён амаль тэкстуальна паўтарае славутае купалаўскае: *"А хто там па мосце шырокім з немай ідзе журбой?"*. Але адказ далёка не аптымістычны:

Беларусь мая ціхімі крокамі...
Мост над глыбокай вадой.
Мы ўсе адыходзім, каханая,
з гэтай юдолі зямной.

Для М. Купрэева значна бліжэй "Паязджане", з іх незразумелай вандроўкай па краі. Родны край — гэта адзіная суцэльная дарога, якая становіцца сімвалам руху, часцей за ўсё броўнаўскага, неўсвядомленага, а таму бессэнсоўнага. Усё жыццё праходзіць ля трасы Масква—Варшава ("Рэліктавы беларус"); жыццё плыве між берагоў у неба; рэкі (Ясельда, Прыпяць, Лань, Нача, Дняпро) ператвараюцца ў дарогі; у страшэнную вандроўку ператвараецца апошняе вяртанне на радзіму чэрапа Каліноўскага (аднайменны верш)...

Беларуская літаратура ў асноўным імкнулася ў неба, *да сонца, да зор*. Хаця мы памятаем і купалаўскае — "раскрыйся нанова магіла, страшней цябе людзі і свет". У вершы ў прозе "2086 г." як бы ўзнаўляюцца падзеі праз стагоддзе з дня сусветнай тэхнагеннай катастрофы. Збываецца мара Дзяржавіна, чалавек з цара нарэшце ўвасабляецца ў самае прымітыўнае стварэнне:

Чарвяк я. Чырвонай халоднай вадою напоўнены клеткі майго пакручастага цела. З падземнае цемры выпаўз наверх праз калючы пясок у світанак золкі пад дубам струхнелым. Не ведаю: восень? вясна? Навокал ні лісціка, ні травінкі. З чорных комінаў Калыбані белы чарнобыл-пальн у жоўтае неба віецца.

Істота, у якую ператварыўся паэт, усё разумее, адно сказаць нічога не можа, таму і піша-малюе згібамі цела на вострым пяску (новая форма літаратуры — *sic!*). Чарвякі, у якіх ператварыліся некалі слынныя людзі, што мелі адносіны (станоўчыя і не вельмі) да Чарнобыля і ўсяго з ім звязанага, шукаюць, як і на зямлі, месца для сябе, бо і там, у новай сутнасці і іпастасі, захоўваюць свой першародны пачатак.

Але і там яны шукаюць адно і тое ж, вечнае:

Б'юць з нябёсаў званы беларускіх цэркваў — толькі яны й жывыя, і ў іх апантаным звоне я, чырвонай халоднай вадою напоўнены, чую крык маёй колішняй роднай мовы, чую ціхае ў звоне высокім маленне нашай вечнай Жанчыны Полацкай. Дайце дарогу, браты-чарвякі, прапусціце, Стаміўся — паўзу я спачыць у нетры пад роднае Ямнае.

У свой час Гогаль імкнуўся да ідэалу: *"Не связывать себя никакими узами на земле"*. М. Купрэеў не змог дасягнуць такой самоты. Ён лічыць шчасцем, калі над яго целам заплача хоць адна жанчына. Для абязножанага паэта жанчына — гэта цуд, дзівосы, у якіх спалучыўся вырак боскі і рэальны, зямны пачатак. Менавіта яна можа вачыма паклікаць пад дрэва густое, дзе, як у Эдэме, схавана насалода і шчасце, кінуць у неба каралі, што расцвітаюць зоркамі ("Жанчына"); у траве стаіць *"ветрык яе дыханнем, яна прыгожа кальша свой цень"*. У той жа час яна можа быць і жорсткай, здрадзіць у небе з Марсам ("Мая муза"); можа схавацца ад вас, таму што вы згубілі душу.

Запавет М. Валошына *"Пройдемте па миру как дети"*, узяты М. Купрэевым для паэмы, ягоныя героі не могуць ажыццявіць. Але чаму ж яны ўсе нават пасля смерці вяртаюцца на радзіму — і Кастусь Каліноўскі, і невядомыя свету Вася, Валодзя, Міша, і сын Іван, што чуе голас сівенькай маці, і шматлікія персанажы балады "А ў полі вярба". Мост над глыбокай вадой не становіцца калінавым, няма старажытнай заставы паміж светам жывых і мёртвых, як і паміж светам людзей і прыродай, усім жывым. Вось чаму слёзы валадара пушчы роўнавялікія чалавечым ("Воўк"), як і плач птушыны, як і існаванне кожнай былінкі, у чым паэт пераканаўся рэальна.

...Адчыні мне дзверы.
Я стаміўся.
За мной лістапад,
лістапад.
Дай пастаўлю ў куток
свой мяшок, —
свой мяшок...
ён багаты і бедны —
ён з небам і ветрам.
Дай спачыць.
Зноў пайду ў лістапад —
у палескія нетры.
Той самай дарогай.
Назад.

Іван ШТЭЙНЕР

Небяспечнасць аўтабіяграфіі

Водгалас

Мікола Мінзер, укладальнік кнігі аўтабіяграфій пісьменнікаў Беларусі "З росных сцяжын", прапанаваў мне напісаць сваю — для наступнага тома. Пасля другога напаміну я ўжо было ўзяўся за справу — усе дык усе. Але на сваю бяду (ці на шчасце?) прачытаў у Інтэрнеце артыкул Ганны Кісліцынай "Многа кліканых..." Даючы ацэнку кнізе жыццяпісаў, яна ставіць такое пытанне: "Але каму прыйшло ў галаву збіраць пад адну вокладку жука і жабу, пісьменнікаў і графаманаў, і з якой мэтай?" Я адклаў пяро. Выходзіць, перш чым распавядаць чытачу пра сваё жыццё-быццё, трэба вызначыцца: да якога класа заалагічных відаў ты належыш. Я не супраць прадстаўнікоў атрада цвёрдакрылых. І супраць жаб нічога не маю. Хоць яны і з сямейства бясхвостых земнаводных, але адрозніваюцца адсутнасцю зубоў у верхняй сківіцы, што вельмі цаню.

Словам, усё нічога, можна згаджацца і на тых, і на другіх. Але ў кантэксце крытыка жукі спадабляюцца "вядомым аўтарам актуальнай літаратуры", а жабы — "графаманам". Вось гэта спыняе і наводзіць на роздум. Невядома, якіх жукоў мела на ўвазе Ганна Кісліцына. Калі каларадскіх, напрыклад, то сапраўды — іх побач з жабамі лепш не змяшчаць. Апошнія іх ахвотна ядуць. Таму жаб нават ловяць і развозяць па бульбяных палетках. Дапамагае лепш усякай хіміі. А іншаму жуку, скажам, майскаму хрушчу, чаго баяцца жаб? Дурное.

Такім чынам, я выбіраю жабу. Толькі — самую вялікую, з сямейства Галіяфаў. Але няўжо і ў гэтым выпадку спадарыня Кісліцына ў сваім чарговым артыкуле будзе пісаць мяне з маленькай літары? Як і іншых ёю пералічаных сярод "многіх кліканых". Уласныя імёны тых людзей, па меркаванні крытыка, набылі ўласцівасць агульных слоў. Калі гэта адбылося, невядома. Але напісала з маленькай літары, значыць, так і трэба.

Баюся я брацца за аўтабіяграфію і па іншых прычынах. Ну, скажам, раптам прабяруся ў кнігу раней за вялікіх! У іерархічным спісе літаратуразнаўцы гэта Ул. Арлоў, Л. Галубовіч, А. Глобус, Л. Дранько-Майсюк, Ф. Сіўко, Ю. Станкевіч, А. Федарэнка і "многія-многія іншыя пісьменнікі", якіх яна, на жаль, не называе. Пэўна, іх занадта шмат.

Страшнавата мне і расчуліць аўтара артыкула, паколькі, мяркуючы па ўсім, яна вельмі чуллівая. Ледзь што — і ў слёзы. "Шчыра кажучы, калі чытаеш кнігу, іншым разам становіцца да слёз шкада людзей, якія ўжо стаяць адной нагой у Харонавым чоўне, а ўміляюцца сваім першым вершам". Перачытаўшы гэтую фразу, адчуваю халадок — Кісліцына яшчэ і празорца! Ведае, ці падышоў ужо чалавек да ракі Стыкс, ці яму яшчэ ісці ды ісці да яе. Так, глядзіш, западзе думка, што жыць табе — дзве дзюркі ў носе і сканчалося. А як паверыш, дык і скапыцішся адразу: псіхалагічная ўстаноўка спрацуе. Не, лепш далей ад нядобрага вока.

Альбо вось крытык дэманструе сваю надзвычай развітую інтуіцыю, што, зрэшты, паіншаму і быць не можа ў вяшчунні. "Шкада і тых, хто кінуў цікавую і прыбытковую працу з-за "інтуітыўнага адчування свайго прызначэння — пісаць. Бо і сама, як чалавек, які сваёй прафесіяй абраў літаратуразнаўства, інтуітыўна адчуваю — не вырвацца гэтаму чалавеку з шарагоўцаў, ні на дзяржаўных хлябах, ні на вольных...". Гэты суровы прысуд (мабыць, безапеляцыйнасць у беларускім літаратуразнаўстве стала прыкметай добрага тону) вынесены пісьменніцы Наталлі Касцючэнцы. Але Наталля Касцючэнка даказала сваю здольнасць да інтуіцыі, напісаўшы цудоўныя аповеды, адзін з іх, "Маўчанне", стаў, на мой погляд, адкрыццём у літаратуры. А вось Ганна Кісліцына дарэмна думае, што ёй "дано предугадать". Някепска было б, каб літаратуразнаўцы сваю інтуіцыю развівалі чытаннем. І не толькі сваіх любімых аўтараў, але іншых, напрыклад, тых, пра каго яны пішуць. І, дарэчы, назавіце мне чалавека, які б ішоў у літаратуру, стопрацэнтова ведаючы, што ў яго ўсё атрымаецца, што ён напіша штосьці значнае. Але адно літаратар павінен дакладна ведаць: стаўшы на гэты шлях, ты робішся публічным чалавекам. Адкрытым як для добрай крытыкі, так і для здзеку і глуму. І — ніякіх крыўд, чырвоных ад слёз вачэй, ніякага жадання адказаць тым жа. "Хвалу и клевету приемли равнодушно".

Так і не вырашыў, ці пісаць біяграфію. Ці пачакаць? А мо ўжо замаячыў човен з Харонам? Трэба спытацца ў Кісліцынай.

Юрый САПАЖКОЎ

Роднае зямлі ўдзячны сын

Нядаўна споўнілася пятнаццаць гадоў, як не стала Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага (1936—1994). У Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Багдановіча прайшла прадстаўнічая навукова-практычная канферэнцыя "Каханоўскі і яго час". Удзельнікі канферэнцыі прынялі зварот да мясцовых улад з просьбай прысвоіць Мінскаму абласному краязнаўчаму музею (г. Маладзечна) імя Каханоўскага. Адным словам, у год роднае зямлі ёсць усе падставы згадаць добрым словам гэтага руплівага вучонага-гісторыка, краязнаўца, літаратуразнаўца.

Генадзь Каханоўскі — з тых апантаных патрыётаў, на якіх трымаюцца народ, нацыя, дзяржава. Бяссрэбранікі і альтруісты, яны прыходзяць на свет, каб сваёй руплівай працай зрабіць яго лепшым, больш утульным, жыццядайным і шчасцядайным. Яны клапоцяцца не пра ўласны дабрабыт і не пра ўласную славу. Пры жыцці ў іх асаблівага дабрабыту звычайна не бывае. А слава... Слава калі і прыходзіць, то каб сваімі запознемі промнямі сагрэць заўчасную магілу.

З цікавымі краязнаўчымі публікацыямі Генадзя (так я да яго звяртаўся пры жыцці) я сустрэўся адразу, як толькі яны з'явіліся ў "ЛіМе", — у маім аспіранцкім 1964 годзе. Прывабіла мяне, як і іншых чытачоў, іх "вокаадкрывальная" сутнасць: хоць крышку, але па-новаму глянуць на аб'ект і прадмет даследавання. Пазнаёміліся ж мы гады праз два, пасля таго ўжо, як я вярнуўся са службы ў Савецкай Арміі, а ён стаў працаваць у Мінскім абласным краязнаўчым музеі ў родным Маладзечне. Звычайным месцам знаёмства тагачасных прыхільнікаў і даследчыкаў беларушчыны быў беларускі аддзел "Ленінкі" — тагачаснай Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна. Я тады, пасля вымушанага "вайсковага адпачынку" ад аспірантуры, "націскаў" на сваю кандыдацкую дысертацыю. Генадзь (як, зрэшты, і другі маладзечанец — Мікола Ермаловіч) не толькі ў выхадныя дні, але часам і пасля работы "вырываўся" ў Мінск, каб пагартаць яшчэ нядаўна забароненыя "Узвышша", "Маладняк" ці нейкую толькі што "рэабілітаваную" кнігу. Не помню ўжо, хто нас пазнаёміў. Але помню тэму нашай гутаркі: пра майго валожынскага земляка Старога Уласа, якога тады для шырокага чытача адкрыў якраз Генадзь...

Не скажу, што мы з таго часу сталі блізкімі сябрамі, але шчырымі прыяцелямі — несумненна. Я не раз быў у яго маладзечанскім гасцінным доме ў завулку Палярным, а ён — у маёй бацькоўскай ракаўскай хаце. Пазнаёміліся сем'ямі. Ездзілі мы з ім у Івянец да народнага мастака Апалінарыя Пупко, па дарозе наведалі магілу Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў Тупалышчыне. З ім як з "найлепшым беларускім краязнаўцам" я пазнаёміў польскіх прафесараў-беларусістаў Базыля Белаказовіча і Тэлесфора Позьняка ў часе нашай паездкі ў Маладзечна. Асабліва нас зблізіла сумесная праца ў 1991—1994 гг. у Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Францыска Скарыны. Я тады працаваў намеснікам дырэктара Цэнтра (г. зн. Адама Мальдзіса), ён — загадчыкам аддзела. Громам сярод завейнага студзеня 1994 года адгукнулася ягоная смерць у сэрцы кожнага "скарынаўца", якія паважалі Генадзя Аляксандравіча не толькі як навукоўца, але і як далікатнага, спакойнага, паважанага і паважлівага чалавека.

Генадзь сапраўды па натуры быў спакойны. Можа, нават залішне спакойны. Гаварыў ціха, не павышаючы голасу. Інтанацыйныя мадуляцыі заўсёды былі скіраваны быццам бы не на тое, каб проста выказаць ісціну, а найперш каб пераканаць суразмоўцу ў гэтай ісціне. Але дзе найбольш выяўляўся яго неспакой і змаганне за ісціну, дык гэта ў друку і ў практычнай дзейнасці. З аднаго боку, ён мог востра выступіць у абарону несправядліва пакрыўджанага чалавека ці нават... "У абарону млына" (так называўся адзін з яго газетных допісаў). З другога боку, працуючы намеснікам дырэктара, а затым дырэктарам Мінскага абласнога краязнаўчага музея (г. Маладзечна), старшым навуковым супрацоўнікам ІМЭФ НАН Беларусі, загадчыкам аддзела Скарынаўскага цэнтра, ён доўга не заседжваўся за адміністратарскім ці пісьмовым сталом. Яго цягнула на волю, на шляхі і сцяжынкі роднага краю, асабліва — роднай Маладзечаншчыны, дзе ён, разам з другім руплівцам-патрыётам Вячаславам Антонавічам Ляшковічам, імкнуўся

практычна адрадзіць гістарычную памяць народа. Адрадзіць у выглядзе розных мемарыяльных знакаў, назваў вуліц, музейных комплексаў. Тэорыя, такім чынам, набывала практычныя абрысы.

Тут я хацеў бы добрым словам згадаць і былога сакратара па ідэалогіі Маладзечанскага райкама партыі В. Ляшковіча. Сёння, на жаль, стала звычным агульна ганіць усё ранейшае, савецкае, партыйнае. Асабліва стараюцца ў гэтым некаторыя маладыя людзі, якія зусім не засталі альбо слаба помняць савецкі час, дакладней — другую палову XX стагоддзя (не стану гаварыць пра іншыя перыяды). Безумоўна, нават у гэты перыяд было ўсялякае, што не варта і ўспамінаць. Але ж было і светлае, станоўчае, пераможнае. І былі прыгожыя, таленавітыя, альтруістычныя асобы. Не забудзем, што менавіта ў гэты час Генадзь Каханоўскі стаў такім, якім мы яго ведаем. І стаў дзякуючы падтрымцы многіх сумленных і патрыятычна настроеных людзей, сярод якіх не апошняе месца займае Вячаслаў Ляшковіч. Тандэм вучонага, апантанага краязнаўца Каханоўскага і надзеленага рэальнай уладай нацыянал-камуніста Ляшковіча змаглі стварыць па тым часе цуды на Маладзечанскай зямлі. Бадай, нідзе столькі не ўвекавечылі тады сваіх выдатных землякоў, не адзначылі столькі выдатных гістарычных і культурных падзей, чым тут, на Маладзечаншчыне. Ды ўвекавечылі і адзначылі так, што на гэта ад дзяржавы не запатрабавалася амаль ніякіх выдаткаў. Каханоўскі прадуцыраваў ідэі, Ляшковіч, запаліўшыся імі, дапамагаў увасобіць іх у жыццё. Два маладзечанскія патрыёты выбіралі месца мемарыялізацыі, потым доўга мясілі палі ў пошуках неабходнага валуна. Затым гэты валун нейкі старшыня калгаса (хіба ж адмовіш сакратару райкама партыі!) дастаўляў на месца мемарыялізацыі, знаходзіў пару "лішніх" мяхоў цэменту і акультурваў мясціну. Падобным чынам з дапамогай Ляшковіча выраблялiся і шыльды, тэксты якіх, вядома, прыдумваў Каханоўскі...

Так быў зроблены арыгінальны помнік дарозе "Мінск — Маладзечна — Вільня" каля вёскі Мясата, увекавечана пабыўка Максіма Багдановіча ў Ракуцёўшчыне каля Краснага, адзначаны іншыя падзеі і асобы. Гэткім чынам устанаўліваліся мемарыяльныя дошкі ў гонар Янкі Купалы ў Яхімоўшчыне, Браніслава Тарашкевіча ў Радашковічах і інш. Традыцыя, вартая пераймання і сёння. Бо хіба паменела ў нас выдатных знаўцаў роднай гісторыі і культуры, а таксама разумных і патрыятычна настроеных кіраўнікоў мясцовых органаў улады? Тым больш, што цяпер Беларусь — самастойная, незалежная дзяржава. Усе пытанні мы можам вырашаць самі. Нам не трэба, як у часы СССР, ехаць у Маскву, каб атрымаць згоду не тое што на стварэнне музея, а на асфальтаванне нейкага кіламетра шашы...

Генадзь Каханоўскі быў выдатным вучоным-гісторыкам. Пра гэта сведчаць паўтара дзесятка выдадзеных ім кніжак, а таксама абароненыя ім у Вільнюсе і Мінску адпаведна кандыдацкая і доктарская дысертацыі, прысуджэнне яму звання доктара гістарычных навук.

Бываюць даследчыкі, якія дзейнічаюць па прынцыпе: і сам не гам, і другому не дам. Генадзь быў не такі. Калі ён недзе ў архіве або ў бібліятэцы адшукваў нейкі цікавы матэрыял, але не мог з той ці іншай прычыны яго "апрацаваць" (а сярод прычын былі не толькі іншыя навуковыя зацікаўленні, але і цяжкія хваробы, аперацыі), то ён рэкамендаваў зрабіць гэта іншым. Так, толькі ў Скарынаўскім цэнтры ён забяспечыў матэрыяламі з паўдзесятка сваіх калег. Калі Генадзь (а гэта было яшчэ да працы яго ў цэнтры) даведаўся пра мой намер скласці першую (а пакуль што і адзіную) кніжку твораў Старога Уласа, то ён сам прапанаваў мне ўсё тое, што ў ягоным хатнім архіве засталося пасля публікацыі артыкулаў пра гэтага паэта-самавука. У прадмове да кнігі "Год беларуса" (1990) я, зразумела, шчыра дзякаваў яму (як і свайму земляку, таксама нястомнаму краязнаўцу — Генадзю Равінскаму) за дапамогу ў адшуканні некаторых твораў Старога Уласа, удакладненні асобных момантаў яго біяграфіі. Удзячны я яму за гэта да сённяшняга дня.

Часам думаю: Генадзь Каханоўскі калі б не стаў вучоным-гісторыкам, краязнаўцам, літаратуразнаўцам, то стаў бы, напэўна, цікавым празаікам. Ён умеў пісаць жыва, вобразна, падчас нават займальна. Што ж, не адзін беларускі руплівец на ніве роднага слова ззамаладу "наступіў на горла ўласнай песні", пераключыў свае здольнасці, час, намаганні на навуку. Зрэшты, можа яно і няблага. Пісьменнікаў у нас, дзякуй Богу, нямала. Вунь ажно на два пісьменніцкія саюзы набралася. А вось выдатных вучоных-гісторыкаў, руплівых і дасведчаных краязнаўцаў яўна не хапае...

І яшчэ на адно я хацеў бы звярнуць увагу, гаворачы пра Генадзя Каханоўскага. Неяк у мяне склаліся такія радкі (магчыма, у падсвядомасці падключылася і памяць пра Генадзя):

Годзе ныць:
"Загіне Айчына..."
Лепш з сябе пачынай
Без прынукі:
Навучы роднай мове
Сына,
Навучы роднай мове
Унука!

Я ведаю асобных прадстаўнікоў айчыннай культуры і літаратуры, якія, вобразна кажучы, "ныюць" па Беларусі, але не думаюць пра будучыню беларусаў як нацыі і Беларусі як дзяржавы. Сваіх дзяцей яны не толькі не вучаць беларускай мове, але нават адгаворваюць ад паступлення на гуманітарныя факультэты. Больш за тое, стараюцца адправіць іх вучыцца, а пасля і жыць за мяжу. Часам у такіх "культурных" сем'ях нават архіў бацькоў пасля іх смерці ўпарадкаваць няма каму... Як мы ведаем, зусім іншы быў у гэтым сэнсе Генадзь. Разам са сваёй вернай спадарожніцай жонкай Зінай яны не толькі далі дзецям патрыятычную закваску, прывучылі да роднай мовы, але скіравалі на беларусазнаўчыя спецыяльнасці. Сын Аляксандр, як і бацька, стаў гісторыкам, кандыдатам гістарычных навук, паспяхова працягвае і развівае бацькавы традыцыі ў сценах Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Дачка Таццяна набыла спецыяльнасць філолага, любоў да беларускай мовы і літаратуры прышчэплівае маладзечанскім школьнікам.

Людзей, якія гэтак, як Генадзь Каханоўскі, паслужылі роднай зямлі, родная зямля не забывае.

Вячаслаў РАГОЙША

Гістарычны пляц

Загадка князя Віценя

"Запісы пра княжанне Віценя" — умоўная назва летапіснага твора пра асобу і дзейнасць Віценя, які княжыў у ВКЛ прыкладна два дзесяцігоддзі — ад 1293 да 1316 г. Сацыяльнае паходжанне і этнічная прыналежнасць князя Віценя дагэтуль, нажаль, застаюцца таямніцай. Адметная характарыстыка Віценя, а таксама звесткі пра яго гаспадаранне ў ВКЛ змешчаны ў летапісных "Запісах пра княжанне Віценя".

Летапісец найперш адзначыў, што Віцень не належаў да княжацкай дынастыі, а атрымаў трон ВКЛ, выключна дзякуючы асабістым рыцарскім здольнасцям. У "Запісах..." пералічаны вайсковыя паходы Віценя на польскія землі, што былі здзейснены ім у 1296, 1297, 1306 і 1307 гадах.

Твор паведамляе пра паспяховы рэйд Віценя на Прусію, у выніку якога войскі ВКЛ здабылі шматлікія трафеі і ўзялі шмат палонных.

Найбольш яркая сцэна "Запісаў..." — з'яўленне на небе, каля 1315 г., дзвюх камет і трох месяцаў, пасля чаго наступіў страшэнны голад, які працягваўся два гады.

Рэканструкцыя і пераклад "Запісаў пра княжанне Віценя" ажыццёўлены паводле "Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага" (ПСРЛ. М., 1975. Т.32. С. 34—35) і "Хронікі Быхаўца".

Іван САВЕРЧАНКА,
доктар філалагічных навук.

Запісы пра княжанне Віценя

У 1293 годзе Трайдзенеў сын Лаўрэнцій добраахвотна саступіў трон Вялікага княства Літоўскага Віценю — колішняму маршалку яго бацькі.

Імкнучыся даказаць сваю адданасць дзяржаве, Віцень вёў шматлікія войны з палякамі. Але гэтым ён надта шкодзіў краіне, бо польскі кароль Лешка Чорны неаднаразова ўшчэнт разбіваў літоўскія войскі паміж Нарвай і Нёманам.

II

У 1296 годзе літва, прусы і жамойты без абвяшчэння вайны ўварваліся ў *Добрынскую зямлю*. Галоўны горад зямлі, Добрын, акружылі і штурмавалі ў нядзельку, калі ўсе людзі чынілі набажэнствы ў касцёле. Горад узялі, шмат месцічаў пазабівалі, малых дзетак адрывалі ад грудзей матак. Усе мястэчкі, вёскі і фальваркі спустошылі, а людзей павялі ў палон.

Потым (каля 1297 г. — І.С.) літоўскае войска на чале з Віценем выправілася ў *Прускую зямлю*. Агнём і мячом спустошылі яе і з вялікай здабычай вярнуліся ў Літву.

III

Затым (каля 1306 г. — **І.С.**) літоўскі князь Віцень напаў на *Куяўскую зямлю*. Спаліў мноства паселішчаў, захапіў шмат палонных і безліч трафеяў. А пасля вярнуўся дадому без аніякіх стратаў.

IV

Праз нейкі час (каля 1307 г. — **І.С.**) Віцень з вайсковай харугвай у колькасці 1800 жаўнераў ціха, праз лясы, увайшоў у *Ленчыцкую зямлю*. Кляштары і касцёлы пабурыў, людзей духоўнага і свецкага станаў — простых і заможных — павёў у няволю. Потым абрабаваў вёскі і мястэчкі і, урэшце, — павярнуў назад.

Ленчыцкі князь Казімір з войскам дагнаў Віценя непадалёк ад Сахачова. Бітва адбылася каля вёскі Траянава. Казімір мужна змагаўся, баронячы сваю зямлю ад непрыяцеля, але быў разбіты. Ён не хацеў жывым здавацца ў палон, каб пазбегнуць няславы. Казімір стаяў да апошняга, але быў забіты на пляцы рукой Віценя.

Пасля тае бітвы кожны літвін, у выніку падзелу палонных, атрымаў ва ўласнасць па 20 палякаў.

V

У дзень Хрыстовага Нараджэння (каля 1315 г. — **І.С.**) на небе з'явіліся дзве каметы і тры месяцы. Каметы палалі яркім святлом ажно да апошняга дня лютага. А потым у Польшчы, Літве, на Русі і ў прылеглых землях здарыўся вялікі голад. Людзям не ставала зерня, караняплодаў і іншай ежы.

Няшчасныя маткі і бацькі елі сваіх дзетак. Кармiліся мерцвячынай, гніллю і ўсялякімі адкідамі, абы толькі суняць невыносны голад. Калі хтосьці ішоў вуліцай — мужчына ці жанчына, хлопец ці дзеўка — згаладалыя людзі выскоквалі з хат і двароў, хапалі іх, забівалі і адразу ж з'ядалі. Той голад трываў ажно два гады.

VI

Вялікі князь літоўскі, жамойцкі і рускі Віцень гаспадарыў да глыбокай сівізны. Ён часта ваяваў з прускімі і інфлянцкімі крыжакамі, а потым памёр.

Віцень пакінуў пасля сябе на вялікім княжанні свайго сына Гедзіміна.

Пераклаў
Іван САВЕРЧАНКА

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" выказвае шчырае спачуванне пісьменніку Леаніду Дранько-Майсюку ў сувязі са смерцю БАЦЬКІ.

Як усё ж такі добра, што германскія вучоныя XIX — пач. XX стст. грунтоўна распрацавалі эстэтыку, паклалі магутны базіс эстэтычнай навукі, зрушыць які было ўжо немагчыма. Зроблена была каштоўная паслуга для ўсходніх славян XX стагоддзя, бо зусім нечакана паспрыяла гэта захаванню філасофскай думкі ў савецкі час. Пасля афіцыйнай забароны філасофіі ва універсітэтах эстэтыка ператварылася ў адтуліну, куды можна было схавацца мысляру. Ратавала гістарычная накіраванасць. Гісторыя эстэтычных катэгорый, як і дакументазнаўства, класічная філалогія, семіётыка, статыстычнае вершазнаўства працавалі на поўную магутнасць, бо гэтыя галіны гуманітарыстыкі цалкам маглі абысціся без ідэалагічнай “надбудовы”.

Святло праўдзівай думкі

Творчы шлях Уладзіміра Міхайлавіча Конана, чыё 75-годдзе мы сёлета адзначаем, лучыцца ў маёй свядомасці з шляхам Аляксея Фёдаравіча Лосева. Прафесар Лосеў, які выдаў у 20-я гады 8 знакамітых рэлігійна-філасофскіх манаграфій, быў выпраўлены, урэшце, на дапамогу будаўнікам Беламора-Балтыйскага канала. Па вяртанні Лосеў сыходзіць у гісторыю антычнай эстэтыкі, прысвяціўшы ёй дзесяткі гадоў жыцця. Свабоднага дыялагічнага мыслення ў Савецкім Саюзе быць не магло (такія выключэнні, як М. Мамардашвілі, толькі пацвярджаюць правіла). Як і Лосеў у свой час, Уладзімір Конан з надыходам адлігі пачаў і працягвае дагэтуль ствараць, па сутнасці, адну кнігу: гісторыю беларускай эстэтыкі ад Кірыла Тураўскага да нашых дзён. Калі паспрабаваць выставіць яго кнігі ў тэматычна-храналагічны шэраг, то карціна атрымаецца красамоўная: “Беларуская мастацкая культура эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесансу” (2006), “Ад Рэнесансу да класіцызму” (1978), “Праблемы мастацтва, эстэтыкі і грамадскай думкі Беларусі пачатку XX ст.” (1985), “Дэмакратычная эстэтыка Беларусі 1905—1917 гг.” (1977), “Святло паэзіі і цені жыцця: лірыка Максіма Багдановіча” (1991), “Развіццё эстэтычнай думкі Беларусі ў 1917 — 1934 гг.” (1968), “Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі” (2003), “Адам Бабарэка: крытыка-біяграфічны нарыс” (1974).

Уладзімір Конан, ахвяраваўшы ўласным філасофскім “я” выступіў у 1960—1990-я як захавальнік скарбаў. Ён адкрываў і адкрывае таямніцы недасведчаным, нагадвае пра напаўзабытае. Пытанні беларускага мыслення і эстэтыкі былі грунтоўна разгледжаны У. Конанам і ў дзесятках энцыклапедычных артыкулаў, асабліва гэта відаць на прыкладзе Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі”.

Чынны ўдзел прымаў юбіляр і ў памежных для сябе дысцыплінах: літаратуразнаўстве, крытыцы, фалькларыстыцы (“Ля вытокаў самапазнання”, 1989), паўсюль уносячы дух анталагічнага разумення рэчаіснасці. Калі піша Конан, усе разумеюць — гаворка будзе весціся пра самае галоўнае, пра першаасновы, першапрычыны творчасці таго ці іншага літаратара, паэта, мастака, публіцыста. Бадай што менавіта конанаўскі стыль і вабіў чытачоў. Атручанае псеўдапляханаўскай літаратурнай сацыялогіяй і, часам, банальнай публіцыстыкай, беларускае літаратуразнаўства з асалодай успрымала ў савецкі час гаючую навізну артыкулаў і кніг Уладзіміра Конана. Тут адчувалася багатая інтэлектуальная культура, распрацаваная логіка і доказнасць, “перажытасць” матэрыялу. Даволі адкрытай для ўсіх, хто ўмеў чытаць між радкоў, была і светапоглядная адраджэнская пазіцыя аўтара. Гэта стварала вакол Уладзіміра Конана прыязную атмасферу аднадумцаў — сяброў і вучняў — за якіх філосафу не раз даводзілася змагацца (прыгадаем вядомы выпадак з Алегам Бембелем). Юбіляр заўсёды знаходзіўся ў полі прыцягнення перадавой гуманітарнай навукі, адным з першых ён пачаў прымяняць на беларускім матэрыяле тэарэтычныя канцэпцыі М. Бахціна, Д. Ліхачова, А. Лосева, М. Конрада, У. Пропа.

Трэба яшчэ адзначыць унёсак Уладзіміра Конана ў справу пачэснага вяртання спадчыны загубленых дзеячаў беларускай культуры. Непасрэдны ўдзел ён прымаў у выданні твораў І. Замоціна, Л. Гмырака, А. Станкевіча. Працэс гэты і сёння яшчэ далёкі ад завяршэння...

Значны розгалас меў у 1990-я цыкл артыкулаў Уладзіміра Конана, прысвечаны архетыпам, першавобразам беларускай культуры і ментальнасці. Тым больш, што само даследаванне вялося не ў адчужана-сцыентысцкім кшталце, а ў святле традыцыйна-народнага і хрысціянскага светабачання. На жаль, гэтыя каштоўныя працы так і не пабачылі свет асобнай кнігай. Напрошваецца на перавыданне і корпус матэрыялаў па гісторыі эстэтыкі, цяпер ужо дастаткова поўны. Будзем спадзявацца, што выдаўцы зробяць Уладзіміру Міхайлавічу такі падарунак. Бо менавіта сёння жывога конанаўскага слова адчувальна не хапае ў прасторы нашага, як кажуць, дыскурсу.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Палеміка

Што на даляглядзе?

Назавіце мне творы сучасных аўтараў. Ага, усё ж дзесятак вы здолелі назваць, і апраўдалі гэты свой мізэрны спіс тым, што для такой маленькай краіны, як наша Беларусь, гэтага цалкам дастаткова.

Алесь Паплаўскі

На памяць прыходзіць выказванне Ніла Гілевіча пра тое, што любая краіна, маючы толькі аднаго пісьменніка ўзроўню Янкі Брыля, павінна была б ганарыцца сваёй літаратурай.

Віктар Казько

Дыягназ не суцяшае

(палемічныя развагі пра стан сучаснай беларускай літаратуры)

Спадар крытык уздымае шмат балючых пытанняў, датычных стану сучаснай беларускай літаратуры. Найбольш істотныя, на мой погляд, можна было б сфармуляваць як наяўнасць талентаў сярод маладых аўтараў і знітаваная, па меркаванні А. Паплаўскага, з гэтым цікаўнасць да беларускамоўнай літаратуры (“на мове ўвогуле цяпер мала людзей чытае і не таму, што не разумеюць яе, а таму, што чытаць няма чаго”).

Чым вымяраецца згаданая цікаўнасць? Колькасцю чалавек, якія прачыталі кнігу? Тады, зірнуўшы на наклады беларускамоўных кніг, можна роспачна канстатаваць заняпад цікаўнасці да нашай літаратуры (асабліва калі прыгадаць колішнія ўсесаюзныя наклады). Аднак колькі б яшчэ мільёнаў чытачоў ні далося ў Дэна Браўна, гэта не зробіць “Код Да Вінчы” добрай кнігай. Вядомасцю твора і творцы сярод школьнікаў? Зайдзіце ў любы дзесяты клас і спытайцеся, ці чытаў хто “Уліса”. Або спытайце выпускнікоў любой ВНУ (апрача, натуральна, філолагаў), ці шмат хто яго дачытаў. Хіба мізэрная колькасць станоўчых адказаў “выпхне” гэты твор з шэдэўраў літаратуры?

Колькасць чытачоў і вядомасць аўтараў, такім чынам, даволі падманлівыя паказнікі. Тым не менш, каб кніга заваявала сваю аўдыторыю, шырокую ці глыбокую, яна павінна адпавядаць пэўным запытам гэтай аўдыторыі, а найперш — быць на зразумелай мове. І гаворка не пра тое, што дзеткам трэба захаплільна і пра прыгоды, дзяўчатам — саладжава і пра каханне, а інтэлектуалам спрэс эстэтычныя вычварэнні ды эксперыменты. Гаворка пра малую колькасць людзей, якім чытанне па-беларуску даецца лёгка. Набілі аскоміну гісторыі беларусаў, якім у крамах не падкажуць, дзе шукаць шкарпэткі, панчохі ці бурштын. Хіба, скажыце, прадавец, які замест насоўкі дае прэзерватыў (“Фрашкі ды пляшкі” С. Квяткоўскага), замест гарбаты паляпае жартаўніка па спіне (уласны досвед), а ў слове “лаяць” чуе адно сабачы брэх, здолее ацаніць стылізацыі “Імя грушы”? А яны ў рамане Сяргея Балахонава не менш каштоўныя за яркі сюжэт, часцяком становяцца крыніцай гумару і да таго ж надаюць твору дадатковых сэнсаў — паводле даследавання Наталлі Харытанюк, тры моўныя сітуацыі, пададзеныя ў кнізе, сімвалізуюць тры ўладныя дыскурсы, ад якіх паслядоўна пазбаўляецца герой, каб стаць сабе гаспадаром.

Той, хто мову ведае, сучасную беларускамоўную літаратуру мае за жыццёвы асяродак — ледзь не адзіны, калі сябры, бацькі, суседзі, журналісты па радыё і тэлебачанні рускамоўныя. Самарэалізавацца, атрымаць эстэтычную асалоду ці эмацыйную падзарадку альбо проста адпачыць сярод тых, хто не вылупіць вочы, пачуўшы “родную мову”, можна падчас літаратурных імпрэз. Вось сталічны расклад на красавік: 2-га пісьменнік і перакладчык Павал Касцюкевіч ладзіў аўтограф-сесію ў галерэі “Падземка”, 3-га адбылася вечарына “ўеж-най” паэзіі літаратурнага тэатра “Арт-С”, 4-га — прэзентацыя кнігі мастацтвазнаўцы Пятра Васілеўскага, 5-га — Першы купалаўскі слэм, 6-га — закрыццё фестывалю Unreal student life, на якім літаратура была прадстаўленая ў розных жанрах, 10-га — сустрэча-імправізацыя з маладымі паэткамі Аленай Беланожкай і Вікай Трэнас, 25-га — акцыя “Рыбны дзень”, прысвечаная выхаду новага нумара літаратурна-мастацкага праекта “Тэксты”, 30-га — студэнцкі слэм “Бітва паэтаў”... Хіба такая шчыльнасць літаратурных падзей не сведчыць прынамсі пра наяўнасць літаратуры, што іх спараджае? Тады цяжка пагадзіцца, што “ваша беларуская літаратура гэта ўсяго толькі — міф, яе не існуе ў прыродзе”. Мо адукаваны і выхаваны знаёмца А. Паплаўскага, які дазваляе сабе такое выказванне — дарэчы, сапраўды выхаваны чалавек тут засумняваўся б, ці не закране ён гонар і годнасць свайго сябра, носьбіта беларускай культуры, — проста не цікавіцца беларускай літаратурай? На літаратурных імпрэзах заўсёды людна, а найчасцей і цеснавата, хаця розныя фарматы вечарын прыцягваюць, натуральна, розную аўдыторыю. Вядома, гэта яшчэ не гаворыць пра якасць літаратуры ці таленавітасць аўтараў — але можа лакмусаваць наяўнасць у публікі цікаўнасці да літаратуры.

Ці ёсць чым тую цікаўнасць задаволіць? Алесь Паплаўскі заўважае, што ў кнігарнях беларускіх кніг мала: “дзесятак, не больш, але і тыя, пераважна заляжалыя”. Дазвольце не пагадзіцца: кніг нярэдка бывае мала па колькасці асобнікаў на адну кнігарню, але найменняў свежых выданняў хапае. На паліцы паэзіі побач з новымі творамі вядомых аўтараў (Р. Барадулін “Выпаў грук у грома з рук”, Л. Дранько-Майсюк “Цацачная крама: кніжка для вялікіх і малых”, В. Шніп “Страла кахання, любові крыж”, Н. Галіпяровіч “Насцеж: вершы, навелы”, А. Хадановіч “Бэрлібры: гісторыя ў чатырох фільмах” ды іншыя) упэўнена займаюць месца іншыя імёны — В. Жыбуль, В. Бурлак, С. Мінскевіч, Зм. Вішнёў, А. Кавалеўскі, В. Морт, М. Мартысевіч, В. Гапеева, В. Трэнас, В. Кустава, А. Спрынчан... Адмахвацца ад гэтай літаратуры, назваўшы яе амбіцыйнай ці несур'ёзнай, нявартa, бо менавіта яна паўстае “тут і цяпер”, з'яўляючыся адлюстраваннем сучаснай культурнай сітуацыі. Ці ёсць сярод іх камяні, з якіх затым зробяць святых, пакажа час — неабходная адлегласць, на якой толькі і бачна сапраўды вялікае. Што ж да прозы, якая выспявае даўжэй за паэзію і патрабуе ад аўтара большай дасведчанасці і сталасці думкі, тут назаву адно імя (у дадатак да прыведзеных А. Паплаўскім): Альгерд Бахарэвіч. І маю процьму аргументаў на карысць сцвярджэння, што яго проза (найперш раман “Сарока на шыбеніцы” і аповесць “Ніякай літасці Валянціне Г.” з аднайменнага зборніка) выводзіць беларускую літаратуру на якасна новы ўзровень. Добрую прозу прадуцыруюць Л. Рублеўская, Е. Вежнавец, С. Балахонаў, Ю. Каляда (хаця маем пакуль толькі адну кнігу гэтай аўтаркі, але яркасць “Галоўнай памылкі Афанасія” прымушае чакаць працягу), Р. Баравікова, А. Глобус, Баба Броня, П. Васючэнка ды іншыя аўтары, якія працуюць у розных жанрах, для розных аўдыторый, з рознымі паэтыкамі, што спрыяе разнастайнасці беларускага літаратурнага ландшафту. Новыя краявіды тут таксама ўтварае вяртанне рэпрэсаванай ды эміграцкай літаратуры, а таксама пераклады, вялікая колькасць якіх выйшла літаральна за апошнія некалькі гадоў.

Новыя творцы з'яўляюцца, як грыбы пасля дажджу. Стваpаецца маса тэкстаў, неабходная, каб захаваць і развіць мову ў няпростых варунках. Да таго ж, чым большая колькасць удзельнікаў у літпрацэсе, тым большая верагоднасць, што адзін з іх пры пераліку літаратараў на вачах рускамоўных сяброў, якія сумняваюцца ў існаванні беларускай літаратуры, запатрабуе сабе асобнага пальца на вашай руцэ.

Ці ёсць каму прадстаўляць беларускую літаратуру ў гэтым стагоддзі, пабачым. Калі, канечне, будзе каму чытаць і думаць па-беларуску.

Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

Сумніўная дыягностыка

Вучыцца ў класікаў стала нямодна, адусюль чутны адны павучанні. Нават ад стопрацэнтных графаманаў. З гэтым трэба звыкнуцца, як з неабвержнай аксіёмай, а не бясконца *стагнаць* на старонках перыёдыкі. Любы від дзейнасці не можа быць заўсёды на ўздыме, у тым ліку і творчасць. Ёсць час поспеху, а ёсць час правалу. І тое, і другое чаргуюцца, даводзячы жыццё да гармоніі і пэўнай стабільнай раўнавагі. На гэтым, уласна, пабудаваны і законы прыроды.

Берасцейскі пісьменнік Алесь Паплаўскі, якога я ведаю як даволі эмацыянальнага чалавека, нягледзячы на пройдзеныя жыццёвыя вёрсты, па-ранейшаму блукае ў сферы наіву і ідэалізму, аб чым засведчыў яго чарговы артыкул “Дыягназ не суцяшае”, змешчаны ў “ЛіМе” за 3 красавіка 2009 года. Навошта ўздымаць вечныя пытанні, якія пасля шчырых абурэнняў так і застануцца нявырашанымі?! Таварыш Ленін пра такую тэндэнцыю ў свой час трапна заўважыў: “Паменей пустой балбатні, паболей простых, будзённых спраў”.

Пісьменнік А. Паплаўскі заклапочаны тым, каб пакінуць пасля сябе памяць нашчадкам — “*нешта значнае*”. А ці патрэбна яно наступным пакаленням? Многія хочуць, каб іх любілі і помнілі пасля зыходу ў іншасвет. Давайце будзем шчырымі і ўзгадаем тую ж Біблію, на якую многія, не чытаўшы, любяць спасылацца. У кнізе Эклезіяста даходліва і зразумела напісана, што за адным пакаленнем прыходзіць другое, і так было, і так будзе. І тыя, хто жыве, забывае тых, хто жыў да іх. І, зразумела, лічаць сябе самымі разумнымі, што мы і бачым на кожным кроку. У тым ліку і ў слоўнай творчасці.

Так, беларуская літаратура мае шмат набыткаў у мінулым стагоддзі. Але гэта не азначае, што яны павінны быць пастаянна. У 1990-х гадах абазначыўся пэўны спад. І нічога страшнага ў гэтым няма. Таму я не лічу, як А.Паплаўскі, гэты перыяд “*застойным*”, які “*выпадае з айчыннага творчага працэсу*”. Нічога ніадкуль не выпадала, а проста запаволілася і стала не настолькі кідкім, а значыць, і прыцягальным, улічваючы змену літаратурных пакаленняў.

Аўтар артыкула відавочна хітруе, быццам “*нам і пахваліцца сёння асабліва няма чым*”. Няўжо? Сёння мы маем тое, што маем і чаго, урэшце, заслугоўваем па аб'ектыўных прычынах. Ні больш, ні менш. Класікамі адразу не становяцца, а геніі натоўпамі не ходзяць. Так, плённа і вынікова працуюць В. Казько, А. Разанаў, Р. Баравікова, Ю. Станкевіч, А. Федарэнка, А. Наварыч, М. Южык, У. Сцяпан... Другая справа, што не ўсё з напісанага імі застанецца вечным і актуальным, а ў некаторых выпадках і наогул з'ўляецца па-мастацку вартым. Бясспрэчна адно: выбіраць ёсць з каго. Пустыні няма.

Але А. Паплаўскага хвалюе другое: хто на падыходзе? А там не надта людна... У сэнсе не-графаманаў. Маладыя аўтары ўсё ж пішуць нешта. А вось **што** канкрэтна, узгадаць сапраўды цяжка. Дапусцім, у паэзіі ўжо досыць сур'ёзна заявілі пра сябе А. Хадановіч, В. Трэнас, Я. Дашына, С. Прылуцкі, А. Кавалеўскі, Р. Малахоўскі, В. Гапеева, В. Морт... Можна не пагаджацца з іх творчымі метадамі і пошукамі, але моладзь расце. У прозе становішча, праўда, горшае. Гэта абумоўлена спецыфікай літаратурна-раманнага адлюстравання жыцця. Таму тут не надта густа.

Што датычыць закідаў А. Паплаўскага ў адрас кнігарняў і мастацкага афармлення выданняў, то тут з ім пагадзіцца немагчыма. Беларускіх кніг процьма, прычым у самым сучасным афармленні. Паглядзіце на новы збор твораў таго ж М. Танка, серыйныя выданні М. Купрэева, А. Казлова, А. Федарэнкі... Выдавецтвы сваю справу ведаюць.

Выбар у чытача ёсць. Праблема не столькі ў тым, што “*няма каго чытаць*”, а ў тым, што літаратура перастала быць запатрабаванай. І не толькі беларуская. Сёння яна фактычна абслугоўвае саму сябе. Няма зваротнай сувязі з чытачом, які страціў да літаратуры цікавасць. Сярод сучасных прыярытэтаў найважнейшым з'яўляецца дабрабыт. А для душы — калі часу хопіць ці жаданне будзе. Запатрабаваны тыя пісьменнікі, што абслугоўваюць гламурны клас. Ясна: у нас такіх аўтараў, у адрозненне ад суседняй Расіі, пакуль няма, хаця з'ява ёсць. Чаго сядзіце, каго чакаеце, пісьменнік А. Паплаўскі? Запрашэнняў не будзе. Рынак. Круціцеся самі. Захапляйце, пакутуйце, тварыце...

А ўрэшце, абурацца суцэльным графаманствам можна бясконца. Куды важней — шукаць выйсце, а не выступаць у ролі сузіральнікаў пагружэння ў балота. Надзея, А. Паплаўскі, штука хоць і утапічная, як вы пішаце, але вельмі неабходная, калі падмацаваная рэальнымі справамі (найперш уласнымі), а не аднымі охамі-ахамі.

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ

Марыя ВАЙЦЯШОНАК. *Нарадзілася ў 1939 годзе на Алтаі ў горадзе Змеінагорску ў сям'і польскага асадніка, высланага напрыканцы 30-х гадоў з асады Соўчына на Пастаўшчыне. Дакладная дата нараджэння пісьменніцы невядомая. Выхоўвалася ў дзіцячых дамах на Алтаі, у Маскве, Ракаве, што на Валожыншчыне, у цёткі Марылі ў вёсцы Грыдзькі. Скончыла філалагічны факультэт БДУ. Настаўнічала ў вясковых школах. Пазней працавала журналісткай у мінскіх выданнях. Сябра Саюза журналістаў і Саюза пісьменнікаў. Выдала зборнікі прозы "Сярод блізкіх людзей", "Жанчына каля люстэрка", "Сад нявіннасці", "Кола" і кнігу для дзяцей "Каму расказваюць казкі на вушка".*

Зусім нядаўна пабачыў свет яе першы паэтычны зборнік **"СЕРПЕНЬ"** (выд-ва Логвінава, малюнкі Яны Галай, 96 стар. 300 асобн.)

"Крыві маёй згусткамі
корміцца верш мой,
як сын адзіны,
дзе сын яшчэ ёсць,
каб крыві столькі выпіў
з грудзей жанчыны."

Габрыэла МІСТРАЛЬ

З Марыяй Вайцяшонак я знаёмы даўно. Больш за тое, можна сказаць, перыядычна бачымся і цёпла таварышуем. І тут недзе пасярод зімы яна мне раптам паведамляе: *запісваю* вершы. Не, гэта не здзівіла, хутчэй нават узрадавала: нарэшце і наша Марыя *зачала* ад духу *вышняга*... Не блюзнеру, гэтак метафарычна падумалася. Але і занепакоіўся тут жа, ахаладзеўшы, а што ж яе арыгінальная, ні на чыю іншую непадобная і непадробная проза, хоць і яна ў пэўным сэнсе была для яе творчасцю *лірычнай*... Возьмем першы, што патрапіў на вока, абзац з прозы М. Вайцяшонак. Ну вось хоць бы з аповеда "Сведка":

"Ісці і ісці ўздоўж ракі, знайсці незамураваны берег, нізкі, скрылёк намытага пяску, пена як у несцішонай гаворцы хваль праз усю ноч. Чайкі над табой бы гойдаючыся на неспакойнай цяжкой вадзе."

А цяпер уявіце, што гэты тэкст выдрукаваны ў вершаванай форме, і ў вас не застанецца сумнення ў яго паэтычным патэнцыяле.

Таму цяперашнія верлібры М. Вайцяшонак ёсць ні чым іншым, як квінтэсенцыяй яе прозы... Можна дапусціць, што менавіта шырокая плынь гэтай прозы пэўным чынам "падмывала і размывала" аснову яе творчага празаічнага русла, што і сталася прычынай збудавання своеасаблівай плаціны, каб сабраць разрознены лірычны паток у адно цэлае ды абрынуць яго ўсёй моцай на лопасці турбіны-душы, і такім чынам выпрацаваць такую энергетычную магутнасць, якая запаліць агонь у чытацкіх сэрцах... Адным словам, заманулася выказаць сябе коратка і ёмка, але ярка і ўзвышана. Бо ж вось яна, тая перадумова:

У мяне яшчэ
не было імя,
я яшчэ
не нарадзілася.
Круцяцца
пустыя
жорны.

Яшчэ ў мінулым годзе прачытаў у "НН" два яе дэбютныя вершы і насцярожыўся. А нядаўна тэлефануе сама Марыя і палахліва-ўзрушана паведамляе: *"Лёня, у мяне кніжачка вершаў выйшла... вершаў, разумееце, Лёня?.."* І паўзу трымае, услухваецца, як я дыхаю і што адкажу на тое... Што ж, цікава, пачытаем, кажу з глыбокім выдыхам... Адчуваю, як на тым канцы провада яна хвалюецца, *як* перажывае, каб хоць добра ўсё абышлося, каб кніжка гэтая не расчаравала мяне і лягла на душу... А ў мяне сваё трымценне: бо калі ўражанне будзе не зусім пазітыўным і станоўчым — як пісаць, каб не пакрыўдзіць яе?.. І гэтак мы на двух супрацьлеглых берагах адной ракі застыглі, углядаючыся ў яе спрадвечную плынь...

Аднак Бог злітасцівіўся, вершы — не паверыце — захапілі сваёй нязмушанасцю, адсутнасцю манернасці, прасцей кажучы, прыцягнулі адкрытасцю і мастацкай сапраўднасцю. Гэта нас і выратавала. Абодвух. Дало нам права быць шчырымі і разняволенымі...

Ад пачатку Марыя даводзіць чытачу з'яўленне сваіх вершаў. Маўляў, яна не хоча *"абшукваць свае і чужыя кішэні, свае і чужыя шуфляды"*, каб пазычаць рыфмы ды іншае паэтычнае начынне... Таму яна піша свабодным вершам — верлібрам, перабіраючы *"пацеркі-словы"*, што *"рассыпаўшыся, лягуць, бы варожачы"*... Не думаю, што аўтар гэтым самым наўмысна пазбягае цяжкай працы па агранцы верша. Хутчэй за ўсё, яна пазбягае змушанай правільнасці пісьма, тады, як душэўныя і духоўныя памкненні не ўкладваюцца ў класічную метрыку жанру, прагна шукаючы вызвалення з закратаваных строф... Многае разумеецца, калі чытаеш наступныя шчымлівыя радкі:

Увесь час падымаюся
па сходках разбуранага
бацькоўскага дома
ў Соўчыне,
намерваючыся
сесці на ганку
і згрызці
свой горкі яблык...
не адважваючыся
зайсціся і сказаць:
"Я не прывяла вам
сына..."

Таму няма здзіўлення, што ў саміх вершах шмат дзяцей. Дарэчы, і "малюнкі" ў кніжцы зроблены рукой паўтарагадовага дзіцяці, *чалавекам* як бы яшчэ не ад "мира сего"... які, гэтак жа як і Марыя Вайцяшонак, робіць першыя спробы ў паэзіі — выводзіць на чыстых аркушах паднебных мрой і ўяўленняў свае знакі (літары) жыцця, тым самым пазначаючы зямную іх спраўджанасць... Нешта тыпу неўпрыкмет аброненай фразы:

ад мяне
ўцякае
дарослы
розум

Падумалася, калі б чытачу папярэдне распавесці біяграфію М. Вайцяшонак, то яе вершы (на аголеным нерве) успрымаліся б з большай доляй натуральнасці... Але ж зазвычай невялікае кола чытачоў беларускай паэзіі ведаюць пра сваіх паэтаў больш, чым тыя ведаюць пра чытачоў, і з гэтай прычыны ў некаторых выпадках метафарычныя асацыяцыі *растаемнівоюцца*. А гэта не на карысць самой паэзіі. І ўсё ж, каб пранікнуцца зашыфравана-таемнай вобразнасцю вершаў М. Вайцяшонак, трэба ведаць яе жыццё і быць абазнаным у яе празаічнай творчасці — менавіта адтуль, з таго *"сора"* **растуць** вершы пісьменніцы. А тое, што вырошчваць *кветкі паэзіі* яна ўмее, і вобразна, і натуральна, — сумненняў няма. Нездарма кажуць, што Паэзія — гэта біяграфія душы... (У Марыі нават кніжка прозы так называлася "Сад нявіннасці".) Але ці будзеш штораз перад кожным размотваць скрутак скрушнага жыццяпісу?

З любога
куплета
хочацца
выцягнуць
нітку,
на якую ён
нанізаны...

Па-класічнаму — *"душой сказаться"* — было для пісьменніцы найпершым штуршком і пацягненнем да паэтычнай формы самавыражэння. Але, як мне думаецца, не галоўнай. Бо *"сказаться"* (выявіцца ўсёй істотай) хацелася, у тым ліку, і біяграфічна, груба кажучы, усім жыццёвым вопытам — ад пакутаў маленства да закутаў сталасці... Сэрца, што ганяла кроў і штурхала чалавека на ўчынкі выжывання, пачало зболена запісваць-выдаваць кардыяграму ўласнага лёсу... І ўсё, што ні страчалася, было

... па дарозе
да тваёй адзіноты..."

У сучаснай маладой літаратуры пераважае, як я яго называю, *зборны* стыль, які сваёй безасабовай агульнасцю размывае змест і паглынае сэнс напісанага. Для нагляднасці сказанага ўявіце сабе, што мастак напісаў карціну адным ярка-ружовым колерам... Таму часцей у такіх вершах прысутнічае эксцэнтрычна-паказная пазіцыя аўтара, а не сам паэт з усімі сваімі чалавечымі праявамі, чым ён найперш і цікавы. У Вайцяшонак адназначна пераважае цэльны вобраз чалавека (найперш *жанчыны*). Тэма няспраўджанага мацярынства дамінуе ў тэкстах і падтэкстах яе вершаў. Таму, як я ўжо зазначаў вышэй, шматлікія вобразы дзяцей рассыпаны недаспелымі "паземкамі" на старонках зборніка.

А якой узвышана-ахвярнай паўстае сама паэтка, нібыта выпісаная на палатне вялікім майстрам эпохі італьянскага Адраджэння.:

Я сыходжу
як Венецыя,
па сходках каменных
уніз, у ваду.
Пустая гандола.

Настальгія па пражытым, няхай сабе і гаротным, немагчымасць вярнуцца назад, нараджае прагу ўвасобіць жаданае і ўявіць усё *тое няшчаснае* як **шчаслівае** і непаўторнае... Ноч і навальніца — як сімвалы магчымых бед і напасцяў старажуюць жытло паэткі. Рваны фізічны і псіхалагічны зрух радка і пачуццяў стварае натуральную візію чалавечага лёсу, канкрэтнай жаночай долі, адзіноты, удаўства ад роду... Падчас адна неардынарна выбудаваная фраза стварае парадаксальную метафару: *"Ноч цямнейшая // за дзень"*... Альбо ў словах, звернутых да рэчкі Іслачы, дзе паэтка пражывае свае *леты*:

Змываю у табе
свае гады.
Запомні мяне
маладой...

Агулам у зборніку *насеяна* шмат квітнеючых паэтычных вобразаў. Калі, скажам, нечаканы правобраз хлеба бачыцца праз *"акраец жорнаў"*, а поруч *"сляпыя вокны хаты // адымаюць* твой *зрок"*, і ты "сціраеш *з твару чужы позірк"*... Ёсць цэльныя запамінальныя фрагменты:

Маланка вышывае
на пяльцах
неба,
залатыя ніты
ў мяне
на каленях,
я маток
Ёй трымаю.

Як і гэты, не менш уражлівы:

Развесіць бялізну
паміж лесам
і полем,
пабыўшы,
сабраць у прасцірадлы
сонечныя
промні, ахапкамі
знесці ў хату
наўлечкі,
набітыя пер'ем
белых аблокаў.

Хацелася б пералічыць лепшыя, на мой погляд, вершы зборніка. Прабачаюся, амаль усе яны безназоўныя, таму я дазволю сабе для зацікаўленых пазначыць старонкі на якіх яны выдрукаваныя (15, 23, 32, 48, 67, 70, 73, 74, 75, 81, 84, 93, 95). Ці не праўда, як для невялікай кніжкі, а тым больш першай, — гэта нямала.

І ўсё ж, каб не выпасці ў крытычную прастрацыю, змушаны сказаць, што кніжцы быў-такі неабходны рэдактар, чалавек, які глянуў бы на вершы збоку, нейтральным вокам...

Бо, на жаль, сустракаецца і недагляд (і карэктарскі ў тым ліку): як *чыясьці цень* ("чыйсьці цень"), *сыскваючы* сабе раство (у сэнсе "вышукваючы", а не спаганяючы), *відаецца* (бачыцца), я чыстых сялянскіх *крывёў* (сялянскай "крыві"), *зсечанае перуном дрэва* ("ссечанае"), быццам мы з ёй *накшай* генерацыі ("інакшай"), агледзішся, *дастаўшыся* на места ("даехаўшы", "дабраўшыся"), *несправядловае* ("несправядлівае"), як пры *свячах* укленчу ("пры свечках"), *не адважваючыся зайсціся* ("не маючы адвагі зайсці")...

Зрэшты падобныя заўвагі можна апраўдаць такім аўтарскім пасылам:

я прыйшла да цябе,
прымкнула
прытокамі
сваёй гаворкі
заходняй

І ўсё ж, на мой розум, адна справа ўжываць дыялектызмы ў празаічных тэкстах (асабліва гутарках-дыялогах), там, дзе яны напрошваюцца па неабходнасці, і зусім іншая справа ўлучаць іх у крынічную чысціню беларускай паэтычнай мовы... Асобныя слоўкі *"вясковай мовы"*, як я яе называю, сям-там могуць заблішчэць залацінкамі, не спрачаюся, але пры пераборах могуць і дысгарманіраваць узвышанае дыханне радка. Галоўнае ў такіх выпадках захоўваць адчуванне меры. А зрабіў я канкрэтныя заўвагі толькі дзеля карысці аўтара на выпадак паўторнага выдання гэтых твораў.

Здараюцца блізкія, як стылістычна, так і фармальна "вобразныя" асацыяцыі з ужо вядомым. Ёсць адчуванне, што гэта зроблена наўмысна, каб паказаць на які ўзровень і на каго канкрэтна арыентуецца ў сваёй *новай* творчасці пісьменніца. Скажам, у гэтых радках для мяне адчуванне А. Разанава абсалютна непрыхаванае:

іду на тое
месца,
дзе нарадзілася
патрэба,
і знаходжу яе
ужо вылупленай з лускі.

Як і вобразнасць Г. Містраль у такіх радках:

Можа таму
я не захацела
мець дзіця
ад чалавека,
ува мне яшчэ не нарадзілася
зямная жанчына.

Мне падаецца, арыентацыя на такія высокія ўзоры нацыянальнай і сусветнай паэзіі толькі дадае павагі да творчасці самой М. Вайцяшонак.

Назва яе зборніка **"Серпень"** вельмі дарэчная і апраўданая — гэта шматмерная метафара: так у некаторых мясцовасцях беларусы называюць квадру месяца і гэтак жа ў суседніх Украіне ды Польшчы называецца жніўны месяц года, адным словам плён чалавечага жыцця і яго паступовы сыход, — светлы і высокі, у атачэнні акаляючай яго таемнай ночнасці...

Хоць, як вынікае з прачытанага, сюжэт кніжкі палягае не ў прадчуваннях сыходу, а ў вяртанні...

За мной
увесь час ідзе,
сочыць
дзяўчынка-сіротка.

Гэта цяжкі — праз усё жыццё — шлях да сябе, не здраджваючы сабе...

І галоўная, як для мяне, значнасць гэтай кнігі вершаў — гэта адкрыццё абсалютна новага чалавека, яе аўтара. Знаёмцеся — **паэт** Марыя Вайцяшонак.

ЛеГАЛ

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19
Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73
Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".
Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".
Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 63856
Наклад 3351
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 13.05.2009 у 11.00
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 2474
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 0024-4686
9 770024 468001 09018